**Сяргей Законнікаў**

# *Прысак часу*

Вершы паэмы

Мінск «Мастацкая літаратура» 1986 г.

ББК 84 Бел7
З – 19

Прадмова Р. І. Барадуліна

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

# СІЛА ДАБРАТЫ

Маёй любові рэчку
Не перайсці нікому,—

не заяўляе, не дэкларыруе паэт, а ўпэўнена падкрэслівае, паўтарае самому сабе. А рэчка гэта незвычайная. Яна імя свае бярэ з сівых паганскіх туманоў. Імя яе гучыць у неўміручым «Слове пра паход Ігаравы». Гэта рэчка Дзіва. Яна ў жураўліны клін лучыць як не ўсе рэчкі азёрнай, баравой, крынічнай стараны, дзе «...жарабя цікаўнае ў крыніцы На месяц наступае капытом», «...зара задумліва ў прыполе Выбірае промні з каласоў», дзе ўсё яшчэ па-хатняму «Убіўся лось у стог паснедаць», дзе ласкава грэюць душу «Завушніцы па тонкім галлі І радзімкі на белай бяросце», а «Ластаўкі снуюць над полем нізка, Быццам сесці хочуць на плячо». Старана гэтая завецца Ушаччынай — калыскай трапяткога радка Петруся Броўкі, ратнага слова Васіля Быкава, балючай песні Еўдакіі Лось. Часта змяняўся адміністрацыйны падзел на карце Віцебшчыны. І ў выніку тры раёны спрачаліся, як за Гамера некалі гарады, за паэта — Бешанковіцкі, Вульскі, Ушацкі, бо вёска Слабада якраз на мяжы раёнаў. А перамог Ушацкі раён, Ушаччына стала роднай хатай першых і сталых вершаў паэта.

Сяргей Законнікаў — імя гэтае даўно знаёма тым, хто цікавіцца паэзіяй, хто любіць беларускае шчырае слова. Вершы Сяргея Законнікава з беларускім характарам, а гэта значыць — яны глыбінныя і задушэўныя, сціплыя, але не ніцачолыя, яны прызнаюць толькі існае і сапраўднае і не прымаюць усё паказное, павярхоўнае. А паэзія ў самым адказным значэнні гэтага слова — працяг, адбіццё характару яго стваральніка. Характар жа Сяргея Законнікава ад роднай зямлі, ад гераічнага партызанскага краю. З малечых год паэту імёны славутых палкаводцаў і партызанскіх камандзіраў, такіх, як Даватар, Лабанок, Дуброўскі, былі, што называецца, хатнімі, роднымі. Нават хата роду Даватара стаяла побач з хатай бабулі Сяргея па матчынай лініі. Пасля бабуля ўспамінала, як перад вайной Леў Даватар прывозіў у падарунак вяскоўцам хусткі. У часе вайны маці Сяргея Валянціна Фёдараўна была сувязной у брыгадзе Мельнікава (можа, і сустракаліся калі сувязная і радавы брыгады — мой бацька). А матчын бацька Хведар працаваў кавалём на Пуцілаўскім заводзе, удзельнічаў у грамадзянскай. Маці ў мірныя дні вяла пачатковыя класы. І не злічыць ёй, колькі ўдзячных выхаванцаў у свет праводзіла.

Гэта вачыма маці-настаўніцы бачыць паэт вясновы свет:

Зямля ў сукенцы беленькай
Бяжыць на выпускны.

Бацька Іван Васільевіч на фронце быў зенітчыкам, а пасля вайны нязменны дырэктар: пабудуе адну школу, будуе наступную. Як той цыган, вандраваў па Віцебшчыне, пакуль не давандраваў да Глыбачкі. Тут, у Глыбачцы, блізкай суседкі Ушач, дырэктар стварае альманах «Узлёт», дзе багата матэрыялаў краязнаўства, вершаў, апавяданняў. Аж трое Законнікавых — Сяргей, Валеры, Вольга змяшчаюць ва «Узлёце» свае творы. Трое з пяцёх дзяцей Івана Васільевіча. Але літаратурныя заняткі ў вольны час, а асноўнае — сямейная політэхнізацыя. Самі валілі лес, самі тралявалі, самі па мазалях на руках навучыліся адрозніваць шархебель ад фуганка, гэблік ад барана. Самі будавалі бацькоўскую хату. Задоўга да ўсіх пастаноў дырэктар Глыбачанскай школы Іван Васільевіч Законнікаў ведаў, што трэба рабіць, каб маладая змена любіла зямлю, ведала цану хлебу, каб каранілася ў роднай глебе, а пе перакаці-полем кулялася ад вярбоўкі да вярбоўкі. Доўгі час вучоныя шукалі магілу Фелікса Тапчэўскага, а знайшоў надмагільны камень і дату нараджэння пісьменніка гэтым удакладніў Іван Васільевіч Законнікаў. Чаму так даволі падрабязна спыняюся я ў сваім слове пра маладзейшага сябра і земляка на фактах біяграфіі, на не дужа пакручастай, як ва ўсіх беларусаў, радаслоўнай. Паэзія Сяргея Законнікава трываецца сваімі каранямі, сваімі вытокамі. Факты біяграфіі, факты жыцця паэт імкнецца абагуліць, узняць да вышынь паэзіі праўдзівай. І ён мае пра што сказаць і ўмее як сказаць. Памяццю суровых дзён паэт заклікае:

Павагу і добрае слова
У нашыя мірныя дні
Давайце вучыцца папова,
Як хлеб у блакаду, цаніць!

Сам паэт умее цаніць і добрае слова, і павагу. Паэзія Сяргея Законнікава даверліва-спавядальная, яна спавядаецца Айчыне, родным нябёсам, землякам. Па-высокаму перагукваюцца, напрыклад, радкі беларускага паэта з класічнай японскай паэзіяй (помніце: «У краі маім любым цвіце чароўнай кветкай і дзікая трава»):

І таму здаецца дзіўнай краскай
Лебяда ля сцежкі палявой.

Кожны радок Сяргея Законнікава напоўнены пахамі, вятрамі, сівярамі Ушаччыны.

І добра мне ісці сцяжынкай
Ці каляінай палявой,
Крывінкай кожнаю і жылкай
Зліваццa з роднаю зямлёй.

(Толькі ўслухайцеся ў багата-асацыятыўнае гучанне рыфмоўкі: ісці сцяжынкай-крывійкай кожнаю і жылкай!)

І нават бусел па Ушаччыне не зусім традыцыйны. Паэт, які шмат павандраваў па свеце, па дарогах і сцежках свайго краю, добра адчувае радасць крылатага вестуна вясны, прымярае дарогі ягоныя да сваіх:

Прынёс у дзюбе бусел сонца
І пыл заморскі з крыл абтрос.

(Так і адчуваеш, як лёгкао «л» у слове «пыл» спадае з навярэджанага, цвярдога «р» «крыл».)

Імгненні замілавання засланяюць хмары трывог нашага свету, бо

У кулаку, як жаўрапка-падлётка,
Зацісну ўсэрца неспакойны век.

У партызанскім краі мірныя дні не могуць ніяк звыкнуць да цішыні.

Знасіліся вайсковыя мундзіры,
І ў бацькі зарубцована спіна.
А тут яшчэ не падпісалі міру,
А тут ідзе маўклівая вайна.

І партызаны, і салдаты надзвычай чуйна адчуваюць кожны рух небяспекі, неспакою.

Бліскавіцамі успыхне неба —
І адчуе сейбіт —
Ён салдат.

Паэт сказаў гэта і пра бацьку, і пра суседзяў, пра мужчын, якіх нягуста адшкадавала вайна.

Прыгадваецца, як чытаў па памяці вершы Сяргея Законнікава сакратар парткома саўгаса «Глыбачаны» Леанід Жаўранак ля возера Лінец (ліні некалі вяліся, да павальнай хімізацыі). Гэтае ж беларускае прозвішча з чыста ўшацкай агаласоўкай і па пліце мемарыяла «Прарыў», дзе партызаны прабіліся праз смяротныя абцугі блакады. І адна з паэм Сяргея Законнікава так і называецца «Прарыў». Жыццё мае працяг, адолеўшы скон. І ў хвіліны роздуму пад імгненнасцю нашага зямнога гасцявання паэт хоча:

Хай радок
узаўецца над полем
Жаўранкам,

як не стане мяне...

Глыбачка. Роднае гнездзішча паэта. І глыбіня азёр, адно з якіх так і завецца Бяздэннае, і часцнка ад вялікай глыбы скупога ворыва, шчырых бароў, глыбы неба, якое паўсюль з табой, тваё, бацькоўскае, прадонна-бясхмарнае. Сюды дарогі павагі, захаплення прыводзілі Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча і Генадзя Бураўкіна, многіх нашых паэтаў, пабрацімаў Сяргея Законнікава. А ў бацькі паэта клопат пра лясы, якія каранямі ўсыхаюць, пра возера, якое не шчадзядь браканьеры, успаміны пра брата, паэта паслярэвалюцыйнага закліку Сяргея Ракіту. Здаецца, што чуеш тут і голас Петруся Броўкі, які высока цаніў паэтычны і чалавечы талент Сяргея. Добрая броўкаўская шырокая інтанацыя гучыць у радках маладзейшага таварыша:

Ну, што ж.
І сёння ненадоўга,
А толькі сэрцам акрыяць.
А ўсё-ткі добра,
ах, як добра
Сярод сваіх палёў стаяць.

Лепей за ўсё вывяраюцца вершы па праўду і на глыбіню на мясцінах, дзе яны напісапы, на людзях, пра якіх вершы гавораць. Да гэтага не магу забыцца, як уразілі радкі, як натуральна прагучалі яны ў саўгасным клубе Глыбачкі, калі чытаў Сяргей Законнікаў сваім землякам пра іхнюю і сваю аднавясоўку.

Над могілкамі дзень сінее,
Як васілёк маёй віны.
Пад крыжам цётка Паланея
Сніць вечна хату ў тры акны.

Свет не заўважыў гэтай страты,
Не азірнуўся на бягу...
А перад кім я вінаваты,
Што памяць,
як страху,
залатаць,
Відаць, ніколі не змагу?

Адчуванне віны, абавязку перад людзьмі прысутнічае ў паэзіі Сяргея Законнікава, узвышаючы і робячы зразумелымі словы самабытнага паэта. Не дае пра сябе забыцца і адчуванне, што

Прыйшла пара вучыцца простай мове

Лясоў і птушак,
Ветру і травы.

Кажучы навуковападобна, героі паэзіі Сяргея Законнікава — людзі працы, спрадвечныя хлебадары. Новы час, новая тэхніка, а матулін клопат як і ў сівой даўніны. У прыпар камбайнер зазірнуў дамоў.

Заўтра злоў не будзе у адгуле,
Рэха ад матора загудзе...
Мые маці сынаву кашулю
У нагрэтай сонейкам вадзе.

І сонца спрыяе маці, і яно клапоціцца злеціць ваду. І добра, што не традыцыйна зарыфмаваў паэт кашулю (звычайна: матуля — кашуля). У слове «адгул» пэўная адзнака часу.

Радасць і смутак, надзея і сумненне жывяць думку паэта, не даюць заспакаенню заняць покуль увагі.

Прыляці, сініца ўдачы,
Сум на смак пакаштаваць,—

запрашае паэт і разам з тым жыве надзеяй:

І маю шчаслівую падкову
Конь яшчэ не скінуў з капыта.

Чытаеш паэзію Сяргея Законнікава і згаджаешся з ім:

Ёсць,
відаць,
у зямлі на паэтаў патрэба,
Бо ніхто іх не сеяў,
а шчодра ўзышлі...

У жыце жыцця і паэзіі колас таленту Сяргея Законнікава буйны, поўны чыстых зярнят любові, трывогі, веры.

Я ў сілу жорсткасці не веру,
Я веру ў сілу дабраты.

Сіла дабраты і робіць будзённае слова Паэзіяй!

**РЫГОР БАРАДУЛІН**

# З кнігі

# «РУНЬ»

# 1970

* * *

Зямля мая,
ты для мяне — як дзіва,
Як першы дотык любае рукі,
Як у спякоту млосную ільдзінка,
Як на кашулі белай васількі.

Мне б толькі быць з табой —
ну, хоць бы верасам,
Расінкай,
што над промнямі дрыжыць.
Ты пражывеш і без мяне,
я ведаю,
А мне ніколі без цябе не жыць.

## У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

Як соты пчаліныя,
свецяцца сцен
Дзе кожнай цагліне хапіла свінца,
Блукаюць па форце маўклівыя цені
Салдат,
што стаялі насмерць,
да канца.
Прабачце мне,
хлопцы,
што ў час навальніцы,
У самы суровы,
бязлітасны час,
Калі палыхалі агнямі байніцы,
Я ў форме вайсковай не быў сярод вас...
Гляджу,
як праз пекла,
дзе ўсё косіць згуба,

Не ўдаўся байцу ратавальны рывок.
Сцякае крывёю юнак светлачубы,
Сцякае вадою жывой кацялок.
Хачу дапаўзці

тою сцежкаю вузкай
Да вас і хоць нешта,
хоць штосьці зрабіць:
Паднесці надзею да спечаных вуснаў,
Балючыя рапы абмыць, загаіць.
Прабачце мне,
хлопцы...
Ісці мне няблізка
Дарогай любові,
дарогай віны...
У вочы глядзяць з вышыні абеліскаў
Салдаты апошняй...
Апошняй вайны?..

## СТАРЫ ВЯТРАК

Нячутна над дзіравым дахам крокаў
І голасу старога млынара.
Тут ластаўкі звілі гняздо над кроквамі,
Птушыная шчабеча дзетвара.
Але вятрак усё і зараз помніць:
Быў стрэл,
млынар той ноччу пасівеў...
Стаіць над сынам непрыкметны помнік,
Плыве удалеч сонца на траве.
Чаромхі дзікай голле
вецер ломіць,
Паціху круціць крылы ветрака.
На жорнах шэрых,
нібы на далонях,
Ляжыць пакутай
сцвілая мука.

* * *

Сякуць жанчыны ў гародах капусту,
За імі паўзе непрыкметна вечар.
Ляцяць качаны ў барозны з хрустам,
Стаяць качарыжкі, нібыта свечкі.

Узмах за ўзмахам і крок за кронам,
Трашчыць пад пажамі калянае лісце...
Жартуюць, што тут —
у царстве крохкім
Кожнага з нас адшукалі калісьці.

Ляжаў я ў разоры, на рукі хукаў,
Чуў холад калючы спіною голай,
Ды хтосьці ў ватоўку мяне захутаў,
Пачуўся матулін ласкавы голас.

Вялікую і невыказную радасць
Жыццё назаўсёды тады прыслала.
Зіма засцілала абрусамі грады,
А сэрца малое маё спявала.

...Сняжынак соль
на зямлю, як па дусту,
Рукою шчодрай
сыпле мяцеліца.
Сякуць жанчыны ў гародах капусту,
Качаннем марозным рыпіць аселіца.

## КАПАЮЦЬ БУЛЬБУ ЗЕМЛЯКІ

У прысаку духмяная спажыва,
Такая сопкая,
што ў роце растае.
Малыя
вогнішча,
як птушкі,
абкружылі,
Далоні бульбе надаюць свае.
Конь стомлены пахрумствае націнне,
Развёў аглоблі,
нібы рукі,
воз.
Такі знаёмы ад гадоў дзяцінства
Бульбяны пах плыве над галавой.
З маіх далёкіх Глыбачкі і Хоціна

Паўзуць у Мінск вятры-лесавікі.
І мне так завітаць дадому хочацца,
Калі капаюць бульбу землякі.

## СПІЦЬ ЖАНЧЫНА

Над стагамі,
над сцішэлай пожняй
Хусткай
хмарка белая
плыве.
Спіць жанчына...
І прамень апошні,
Як прыколка,
зззяе ў галаве.
Дзень цалюткі грэбла, варушыла
Складзены ў пракосы
спеўны луг.
Стома раптам вейкі ёй закрыла,
Сон узяў усё ў палон паўкруг.
Уздымаюцца спакойна грудзі,
Твар яснее ўсмешкай спакваля.
Паглядзіце, зразумейце, людзі,—
Гэта ж дыхае сама зямля.
Паабапал вечаровай сцежкі
Красак пераспелых чуцен звон...
Нібы вартаўнік,
сяджу на ўзмежку,
Каб не спудзіў хто шчаслівы сон.

# З кнігі

# «БЯСЕДА»

# 1973

## ЖЫВУ НА ЗЯМЛІ

У празрыстым спляценні
Сонца,
            траў,
            каласоў
Продкаў ясныя цені,
Рэха іх галасоў.
Не ўвярэдаю стома.
Вабіць новы прастор...
Незвычайна, знаёма
Ветрам дыхае бор.
Ціхі голас аклікнуў,
Абступілі камлі...
Я ніяк не прывыкну,
Што жыву на зямлі.

## ГУСЛІ

Замешаны родныя гукі густа,
Крыштальнай расою зіхцяць, звіняць.
Гудуць над Белай Руссю гуслі,
І песні-лебедзі ляцяць...
«Запражыце коніка мне найлепшага,
Запражыце мне сіўца-варанца.
Сяду я, паеду да свайго дварца.
Еду я лесам — лес мой не шуміць,
Еду я полем — поле не звініць,
Еду я мостам — мост мой не гручыць».
Пакуль будуць гуслі звінець
На Нёмне сінім, на чыстай Дзвіне,—
Руні нашай вясной зелянець,
Дочкам нашым жаніхоў мець,
Хлебу духмянаму быць на стале,
Роднаму слову з намі сталець.

## РАЗМОВА З ЦЁЗКАМ

«Тут пахаваны сяржант Сяргей.
1941 год».
*Надпіс па помніку*

Гляджу, як рэактыўны цягне сцежку,
І сцежка тая ад зары ў крыві...
А цішыні няма. Яе няспешна
Раззвоньваюць лясныя салаўі.
Сяргей, ты іх і зараз нават чуеш,
Як і тады пад выбухамі мін.
Твой абеліск плыве антэнай чуйнай
Над звонам траў і шолахам асін.
Ён ловіць галасы, вятроў дыханне,
Далёкае ад выбухаў вайны.
Ды на змярканні гукі аціхаюць,
Каб не трывожыць добрым людзям сны.
Але з нябыту твой прыходзіць голас —
За тымі праўда, што ў баях ляглі.
Цяпер ты, можа, кропля. Можа, колас.
Ды ўсё ж жывеш са мною на зямлі.

Г о л а с з з я м л і :

Чаму не бачу твар твой, цёзка?
Чаму толькі чую голас?
Чаму так цяжка мне дыхаць?
Чаму тут няма світанняў,
А толькі ноч адна?
Ты ў сорак першым паў.
Я нарадзіўся ў сорак шостым.
І вось мы побач на паляне ў бары.
Ты быў, а я нядаўна стаў дарослым,
Давай ж а па-мужчынску гаварыць.
Грымела, заплывала дымам далеч,
А людзі, завяршаючы налёт,
У акіяне лесу адпадалі
Ступенямі касмічных караблёў.
На абеліску — твой апошні ордэн,
Тут для цябе цяпер

і фронт,
і тыл...
А мне ў жыцці стаяць патрэбна цвёрда,
Бо мой пачатак і аснова — ты.

Г о л а с з з я м л і :

Не прасіце, жывыя,
у нас прабачэння.
Лесу нашаму не зайздросцьце,
але не кляніце.
Лепш скажыце,
як там мама мая жыве?
Гады вайны, як вырай, адляцелі,
Але журбу на крылы не ўзялі,
А я ў вачах матуль асірацелых
І за цябе ўзяў варту па зямлі.
Падобны на сыноў, жывы, здаровы,
Іду па свеце — памяці ганец.
І хусткі ападаюць аж на бровы,
І позіркі сыходзяцца па мне.

Г о л а с з з я м л і:

Сястрычка родная...
Маленькі абдзіманчык...
Таня...
Ратуй яе!
Танкі...
Танкі...
Танкі...
Ты бачыш, цёзка, іх,
Ты бачыш іх?
О, не, Сяргей, то жаўранак спявае,
Нібы званочак цягнецца ўгару...
Цябе жыццё ўва мне не пахавае...
Дастань кісет — махоркі закуру.
Прабач.
Мне трэба думаць, доўга думаць.

## ХАТЫНЬ

Дваццаць шэсць каміноў,
Дваццдадь шэсць каміноў,
Дваццаць шэсць
і далёкіх,
і блізкіх мне сноў.
Ды плывуць і крычаць
нада мной груганы,
Што не сны — каміны.
О, не сны — каміны!
На халодным граніце
ляжыць цішыня,
Толькі крык груганоў
аніяк не суняць.
І ў вачах загараюцца рантам кастры,
А з кастроў — невыносныя стогны і крык.
Дваццаць шэсць тых кастроў,
Дваццаць шэсць тых кастроў,
А ў кастрах мы,
жывыя,
заместа дроў.
Па-над Белаю Руссю
палаюць кастры,
Над усёю зялёнай планетай —
кастры.
Нада мною — кастры,
Пада мною — кастры,—
Я не бачыў такое злавеснай
зары...
Дым і попел.
Не ўгледзіш нідзе сінявы.
Вы, хатынцы, згарэлі,
Я — хатынец жывы!
Нашу памяць жалобныя будзяць званы.
Цішыню мне пачуць дапамогуць яны.
Сэрца,
слухай званы,
помні ўсё,
не астынь,
Як дагэтуль не стыне

На лясной лугавіне
Мая рана, мой боль,
Мая памяць — Хатынь.

### ЦІШЫНЯ

Не грымяць салаўіныя гімны...
А было, што нічым не суняць.
У жалобе ля брацкай магілы,
Нібы маці,
          стаіць цішыня.
На світанні,
          у поўдзень
          і ўночы
Спяць салдаты...
          Заснулі даўно...
Васількоў вечна сумныя вочы —
У нябыт іх трывожны
          акно.

### ПАРТЫЗАНЫ

Партызаны прыйшлі да магіл дарагіх...
Дагарае зара на калматых вяршалінах бора.
Памяць зноўку змітоўвае радасць і гора,
Цягне моцную ніць з небыцця да жывых.

Партызаны прыйшлі да магіл дарагіх...
На вачах заблішчэлі раптоўныя слёзы.
І глядзяць устрывожана сёстры-бярозы
На братоў пасівелых, маўклівых сваіх.

* * *

Лес насупіў зялёныя бровы,
Стаў,
          як войска,—
          камель
          да камля.

Абеліск пазірае ў нябёсы: сурова,
П'едэстал яго моцны — зямля.
Сум мой ціха плыве над травою...
І, пакінуўшы рантам зеніт,
Сонца русай сваёй галавою
Зноў прылегла на спёклы граніт.

### МАЛАДЗІК

Ах, як тварам падобны ён
На дзіця мае.
Маладзік...
Час плыве і гудзе,
нібы звон.
Маладзік зноў за воблакам знік.

Хаце той не пазбыцца сноў —
На дарогу вечна глядзіць.
У Радзімы загінула столькі сыноў...
Маладзік для ўсіх маці адзін.

### ВАЕННАЕ КІНО

Крычаць падлеткі, загрудкі бяруцца,
Кідаюцца ў сумёт і ну — страчыць.
Рукой адзінай дзядзька самакрутцы
Даў рады,
ў вусны ўзяў яе,
маўчыць.
Бабулькі тэпаюць хадой няпэўнай,
Кіно ім нагадала іхні лёс.
Салёным горам вочы накіпелі. —
Рагі хусцінак мокрыя ад слёз.
Нібыта хто пакратаў за іголку,
Якая ў сэрцы ўелася даўно...
У нашым ціхім сонечным пасёлку
Круцілі зноў ваеннае кіно.

* * *

Дзесьці вучоныя расшчапляюць атам,
Пра лёсы людзей дыпламаты спрачаюцца.
А ў Глыбачцы дзядзька шалюе хату
І калыска ў садзе гайдаецца.

Дзесьці натужна равуць бамбавозы,
Зямля ад напалму плавіцца.
А ў Глыбачцы двое ў лодцы на возеры
Лілеі перабіраюць пальцамі.

Дзесьці статыстыкі дакладна падлічваюць,
Колькі бязвінных штодзень забіваюць.
А ў Глыбачцы стары дзед пад ліпай
У пукам пра шэрага воўка баіць.

**СТУПАЮЦЬ ХАЛАДЫ**

Няспешна, вуглавата
Ступаюць халады.
І стынуць каля хатаў
Забытыя сляды.

Рассыпаўся на сцежцы
Караляў спелы звон —
З цнатлівай усмешкай
Рабіна ўпала ў сон.

Снягам душа расчынена.
Плывуць яны здаля.
Бы ясны твар жанчыны,
Твой ціхі сум,
зямля.

**ТАЕЖНЫ ПАСЁЛАК**

*Дзядзьку,*
*паэту Сяргею Ракіце*

У густоце кедрача вавёрка

Рыжаю іскрынай прамільгне...
У тайзе за даллю сініх вёрстаў
Кружыць над пасёлкам першы снег.

Спіць пасёлак. Ціха і марозна.
Толькі ля аселіцы адно
У суровым і маўклівым роздуме
Дапазна высвечвае акно.

Мне б убачыць над лістком аловак,
У маршчынах ранніх дзядзькі твар...
Немагчыма гэта. Толькі словы
Да мяне данеслі сэрца жар.

У чупрыне кедрача вавёрка
Зноў,
          нібы агеньчык, мільгане.
У тайзе за даллю сініх вёрстаў
Кружыць над пасёлкам першы снег.

## ЗІМА

Мароз плячыма пацёпваў,
Трашчалі настыла платы.
Было ў леснічоўцы цёпла,
Была ў леснічоўцы ты.
Дровы,
          як людзі,
          над вокнамі тупалі,
У заінелыя шыбы стукалі.
На белай галіне сініца сядзела,
А ў хаце палілася печ, аж гудзела.
Завеі. пагрэцца хацелася,
І яна,
          як цялятка,
          церлася
Аб вугал пысай халоднаю.
Вылі вятры, як ваўкі галодныя.
Завесаў рын за сцяною,
Гляджу — нікога няма...

Цябе не было са мною,
Гота была зіма.

### МАЎЧАННЕ

Ідуць дажджы трывожна, палахліва.
А ты ў далонь збіраеш пырскаў мак.
Смяешся потым,
як дзіця,
шчасліва,
Што не ўсміхнуцца нельга мне ніяк.

Слоў не чакаю.
Дарага маўчанне.
А поглядам твой кожны рух лаўлю.
І чую я, як недзе за плячамі
Садзіцца лісце ціха на зямлю.

### АЛЁНКА

А яна смяецца без прычыны,
Як вада ў вясновым раўчуку...
Я нясу маленькую дзяўчынку,
Я нясу суседчыну дачку.

Асцярожна крочу, каб не ўпасці.
І плыве сцяжынка да ракі...
Не маё,
але такое шчасце
Туліцца ласкава да шчакі.

### ЧАКАННЕ

Хоць дожджык б'е і лашчыцца,
А ты усё адно
У сінім лёгкім плашчыку
Спяшаемся ў кіно.
Куды ад суму дзенешся? —

Не ведае ніхто.
Сам-насам ты з надзеяю
Плывеш каля платоў.
А потым чуйна слухаеш
Чужую казку слоў,
Пакуль у цёмным клубе
Не ўспыхне зноў святло.
У сэрцы ўсё не месціцца
Дый некаму аддаць...
Ідзеш за жоўтым месяцам,
Блішчыць слюдой вада.
А хутка зноў засцюдзіцца
Сняжынак карагод.
Ты верыш: нешта збудзецца
Цяпер, а мо праз год...
Хоць дожджык б'е і лашчыцца,
А ты усё адно
І заўтра ў лёгкім плашчыку
Зноў пойдзеш у кіно.

* * *

Вусны — суніцы,
Вочы — крыніцы.
Стрэнеш, убачыш —
Не надзівіцца.
Сцежка вузенька —
Я к размінуцца.
Гуртам рабіны
К дубу хінуцца.
Кошык напоўнены
Летам саспелым.
Позірк,
як поўдзень,
Дотык нясмелы.
Босыя ногі
Коле ігліца.
Толькі б з дарогі
Не аступіцца.
Як размінуліся
Хлопец з дзяўчынай,

Стала маркотна
У лесе сцяжыне.
Сосны гадаюць,
Сонца смяецца...
Хто ж гэта першы
З іх азірнецца?

### ПЕРШААДКРЫЦЦЁ

Пагаслі зоркі. Над зямлёй світае.
Ад цішыні хмялее галава.
За лесам коні ходзяць па атаве,
Хрумсціць ледзь чутна росная трава.
Прайдзі праз бор па леташняй ігліцы
І ўбачыш,— толькі ціхенька пастой,
Як жарабя цікаўнае ў крыніцы
На месяц наступае капытом.

### ВЫСПЕЛАЕ ПОЛЕ

Воблакаў пушыстых парашуты
На зямлю садзяцца за сялом.
Сонца па за х« дзе расчыркнута
Ластаўчыным тоненькім крылом.

Пахне хлебам выспелае поле.
Наплывае цемень ад лясоў.
І зара задумліва ў нрыполе
Выбірае промні з каласоў.

### КАЛОДЗЕЖЫ

Клякоча бусел на вяршыні дуба,
Спадае дождж крамяных жалудоў.
Жыццё не счэзла ў заімшэлых зруб;
Што складзены за памяццю дзядоў.
У іх, наперакор усім прарокам,
Но высыхае праз гады вада.

З глыбіняў падымаецца высока,
Каб чысціню і моц сваю аддаць...
Закончыўшы апошнюю разору,
Я супыню стамлёнага каня
Ля зруба, дзе і ўдзень унізе зоры
У жывой вадзе хавае глыбіня.

## ПРЫХОДЗЬЦЕ ДА МЯНЕ

Я — лістапад. Прыходзьце да мяне
Па той сцяжыне, дзе вятры блукаюць.
Прыходзьце. Шчасце тых не абміне,
Хто тут мяне,
          у лесе,
          адшукае.
прыходзь,
          дзяўчына,
          з ціхага сяла,
Пастой над вадаспадам жаўталісця.
Ты станеш прыгажэйшай, чым была,
І добрым словам памянеш калісьці.
Прыходзь,
          матуля любая,
          сюды,
Табе я ў хустку восені насыплю.
І ты пачуеш голас малады
Забітага пад Беластокам сына.
Прыходзь і ты,
          дзядуля,
          сёння ў бор
Пагрэцца ля кастроў, што вецер носіць.
Гарачы ліст вазьмі яшчэ з сабой —
Жыцця твайго спакойнай будзе восень.
Я — лістапад. Я — добры чараўнік.
Усе нягоды лісцямі лячу я.
Прыходзьце, людзі, покуль я не знік,
Прыходзьце усе, хто боль ці сум адчуе.

# З кнігі

# «УСТАНЬ ДА СОНЦА»

# 1976

## У АБДЫМКАХ ПАЛЁЎ І ЛЯСОЎ

Не здзіўляцца табе немагчыма,
Ці то спёка,
ці вея снягоў.
Разліваецца ў сэрцы Айчына,
Як рака,
што імкне з берагоў.

Перапоўнены шчасцем да краю,
Закалыханы яснай красой,
Я, здзіўлёны табой, заміраю
У абдымках палёў і лясоў.

## ХЛЕБ

Нібыта ў жыце перапёлка,
Устрапянулася душа.
П'ю хлебны пах. Ён лепш за зёлкі,
Лепш сырадою з гладыша.

Ля печы маці б'е паклоны,
І кожны з іх, як адкрыццё.
На залатых далонях клёна
Ляжаць не боханы — жыццё.

І так захочацца — аж слінкі —
Акрайчык адламаць цішком
Ад той пахучае скарынкі,
Што млее там, над ручніком.

Як светла стала ў нашай хаце,
Аж вокны зіхацяць яе.
У сенцы хлеб выносіць маці —
Яму пашану аддае...

Закінутыя на гарышча,
Пыляцца клёпкі ад дзяжы.
І мы па праву ганарымся,
Што ў вёсцы ў краме хлеб ляжыць.

А памяць пільная вартуе
Хвіліну тую праз гады,—
Як рэжа, стоячы, матуля
На лусты бохан малады.

## УСТАНЬ ДА СОНЦА!

Устань да сонца —
Будзе рупны дзень,
Клапотліва-ўмалотны і гарачы.
Чакае праца прыпарам надзей,
Бо на зямлі не можа быць іначай.

І трасамі., што ў космас праляглі,
І вершамі, і цёплым караваем
Любоў святую да сваёй зямлі
Па кропельцы ў сабе мы адкрываем.

Не важна, хто ты — хлебароб, паэт,
Адно на ўсіх людзей зямное шчасце.
Галоўнае, які пакінеш след,—
Па ім ступаць далей твайму нашчадку!

* * *

Жыццё кранае нас
то ўсмешкай шчыраю,
То лёгкім дотыкам любімых рук...
Гады плывуць
неўтаймаваным выраем
І робяць нада мной
за кругам круг.
Гул сосен,
плёскат хваль
і слова матчына
Аздобілі быцця жывую ніць.
Я без празрыстай, як сляза,
Ушаччыны
Свет гэты ўвесь
не здолею ўявіць.

* * *

Дзівосы ўсюды прыкмячаю,
Хачу спасцігнуць: як, калі?
А дзень стаіць такі звычайны
І незвычайны на зямлі.

Круты палёг пчалы руплівай,
Карона сонца ў вышыні,
І немаўлятак смех шчаслівы —
Ва ўсім пазнання карані.

Пяе світальнае паветра,
Крыніца шчодрыцца вадой...
Маё здзіўленне з'явам светлым
Струменіць праз надзел гадоў.

Хоць век ніхто мне не надточыць,
Другога не хачу жыцця,
Бо нават будні дзень —
святочны,
Ён —
час зямнога адкрыцця.

**НАШ ЛЁС**

Лёс у дзядоў не быў салодкі,
Бяда да косці церла плечы.
Яны дарма не дралі глоткі,
Казалі слова ў грознай сечы.
Але і ў бітве з чорным збродам,
Да донца помстаю працятыя,
Адной рукой трымалі зброю,
Другою — для раллі зярняты.
Лёс наш турботны і шчаслівы.
Пад зіхатлівым сінім небам
Вядзе мяне мой век імклівы
Па той зямлі, што пахне хлебам.
Ды ўспамінаючы старое,
Дзядоў, бацькоў я чую голас —
Адна рука ляжыць па зброі,

Другая лашчыць спелы колас.

## БАЛАДА

Праз завею — сані, сані...
Ля дарог бярозак дым.
У марозным акіяне
Замятае снег сляды.

З-пад падкоў маланкі іскраў,
Коні сталі ля сяла:
Вой заснуў у полі чыстым —
Сэрца выпіла страла.

Закаціліся за вейкі
Маладыя поўні воч.
А зямля ляжыць, як вечнасць.
Меч у ёй тырчыць наўзбоч.

Сцёк крывёй густою захад,
Змрок завесіў курганы.
Русь глядзіць на свет без страху,
Стогнуць хрыплыя званы.

## РОЗДУМ

*Уладзіміру Караткевічу*

Гісторыю зямлі маёй цярплівай
Падручнікам вучнёўскім не ахопіш.
Гляджу на Белай Вежы ўзлёт імклівы,
На каску, што ржавее ў акопе.

Гады сівыя сцелюцца туманам,
Нядаўнія — гараць зарой трывожнай.
Я крочу на мясцінах неўзараных,
Нібы на тонкім лёдзе, асцярожна.

У даўніну іду, як у разведку,—
Там звон мячоў, там водбліск зараніцы.

На ўсім шляху стаяць нямыя сведкі —
Валы, муры, траншэі і байніцы...

Радкі былога ткаліся паволі,
Свяціла цьмяна летапісцам поўня...
Шануй здабытую ў змаганнях волю —
Цябе і праз вякі нашчадкі ўспомняць.

## ТАЛАКА

Адпелі пеўні трэція,
Сняданак слаўны — клёцкі.
Рукавы — а ж па локці,
Сякеры — з-пад павеці.

Якая нашча праца?
Курам на смех, дый годзе.
Моц маецца ў пародзе,
Каб здолеў зруб падпяцца.

Халодзіць грудзі вецер,
Ёсць згода і натхненне...
Смалой, як на бярвенні,
Пот на ілбе засвеціцца.

А зруб расце, як цеста
У гаспадыні ў дзежцы.
І так, як і вядзецца,
Пад нос мармычуць цеслі:
«Талака, талака
Аж да самага вянка...»

У хаце быць радзінам,
Грымець у ёй вяселлям...
Нам будаваць і сеяць
Заўжды сям'ёй адзінай!

## ДУША ЛЕСУ

Як дрэва, рос я разам з лесам,
І сёння там — жаданы госць.
Я зразумеў яшчэ з маленства:
Як у людзей, душа ў ім ёсць.

Калі не так, нашто б глухому
Да нашых клопатаў і бед,
Яму, не ведаючы стомы,
Ісці ўвесь час за намі ўслед?

Жаўцеюць смольныя бярвенні,
Хоць зруб пакуль, а не жытло,
У ім суцішся на імгненне —
Аслепіць звонкае святло.

Лес аддае для кожнай хаты
Кавалачак душы святой.
Ці не таму яны багаты
Гасціннасцю і дабратой?

Вайною хрышчан не адною
І намі крыўджаны не раз,
Стаіць мой лес густой сцяною —
Устойлівасці вучыць нас.

Галіны расхіну, як дзверы,
І моўчкі настаю спярша...
А нехта усе яшчэ не верыць,
Што і у леса ёсць душа.

## ЦАЛІК

Цалік за ноч дашчэнту ўзрыты
Каля старой калгаснай пуні.
У лупках, капытом прабітых,
Зазеляненелі стромкі руні.
Убіўся лось у стог паснедаць,
Даўно ўжо бедалага посціць.

Пад шапкай сонечнага снегу
Траве прысніўся росны поплаў.

### НЕАБХОДНАСЦЬ

Вельмі многае хочам
Мы адкрыць і стварыць.
Прагна свецяцца вочы —
Нашых мар ліхтары.

Верацъ мудра па слова
Нам, як дзень, маладым.
А жар-птушка, што ловім,
Растае, нібы дым.

Не ў паспешлівай славе
Я цяпер пазнаю
На жыццё свае правa,
Неабходнасць сваю.

Не крапаюць, папраўдзе,
Міражы, што сплылі.
Ёсць канкрэтныя справы
На канкрэтнай зямлі.

Аддаю ласку хлебу,
І гружу, і кашу.
Мне нямногае трэба,
Аднаго я прашу,

Каб са мною да скону
Быў мой бор і рака,
Каб, як цёплы рамонак,
Мне свяціла дачка.

### ВЕЧНАЯ РАДНЯ

Як поле, у людзей душа адкрыта,
Пасей дабра зярняты ў глебу ты —

Дабра саспее колас залаты.
І ў маіх грудзях шапоча жыта
Аб нечым светлым, родным і святым.

У жыта з небыццём няма агулу,
Будзь бласлаўлёнай прадзеда сяўня,
Што надарыла мне пачатак дня,
Прынесла песню, накарміла і абула...
Жыццё і жыта — вечная радня.

## ЗДЗІЎЛЕННЕ

Зямля падрабнела ў людскім уяўленні,
Вакол абляцець хопіць менш двух гадзін.
Ды ўсё ж не згасае, як зорка, здзіўленне
Прад матчыным краем, што ў сэрцы — адзін.
Шчымліва-салодкія тыя хвіліны,
Калі ў век касмічны махне грабянём
Чырвоным, нібыта ў пеўня, рабіна
Ля хаты, якую ніяк не мінём.
Па сцежках маленства назад не вярнуцца,
Ды памяць кладзе за сцяжкамі сцяжок,
І рантам захочацца стаць, азірнуцца
З пагорка гадоў на світальны лужок.

## МАЯ СЦЯЖЫНА

Бяда мяне па свеце не насіла,
Я на чужыне слёз не ліў цішком
Па той зямлі, што беражна расціла,
Дзе сонца ясна і зімой свяціла,
Дзе росны луг так пахнуў малаком.

Усё са мной, на ёй жыву, адзінай.
Узгоркамі, палямі, цаліком
Туды бяжыць гадоў маіх сцяжына,
Дзе кожная алешына, асіна
Абцалавана веснім вецярком.

## ПЕСНЯ МАЦІ

*Светлай памяці*
*Алены Сцяпанаўны — маці*
*Петруся Усцінавіча Броўкі*

Ходзім без супынку мы па свеце,
Нас здзіўляць не паспявае век...
Прынясе з маленства песню вецер —
І замрэ, знямее чалавек.

Слухаю яе, і мне здаецца —
Сэрца разарвецца ад любві.
Што жыццём, паэзіяй завецца —
Выспявала ў матчынай крыві.

Песня да грудзей ласкава туліцца,
І відаць мне, як на верасах
Крочыць сын з сівенькаю матуляй,
Іней у самога ў валасах.

Песня зноў вядзе знаёмай сцежкай
Да сялібы,
          над якой палын...
Свеціць сонцам матчына усмешка
У трывожнай чырвані рабін.

* * *

Дарога уцякае паланянкай,
Гайдаюць сонны іван-чай чмялі.
І сонечна,
          і душна на дзялянках —
Крыніцы перасохлі па зямлі.

Як дзед сівы,
          гушчар ад пылу белы,
На грыбніцы пясок ідзе вайной.
У соснаў звонкаствольных карабельных
Вяршыні заплываюць жаўцізной.

Пакурчылі свае лісцінкі лозы,
Сухмень такі, ажно ў вушах гудзе.
І «Беражыце лес!» — знаёмы лозунг —
Вісіць, як напамінак аб бядзе.

Глядзіць на нас прырода сумным вокам,
Ты ёй, нібыта сябру, не мані...
Сягаючы імкненнямі высока,
Не забывай пра карані.

## ЖНІВЕНЬ

Аб восені табе напомніць
І павуцінка на плячы,
І спелы яблык, што, як поўня,
У жаўцізне лістоў блішчыць.

Ляцяць у першы шлях падлёткі,
Раса па крылах маладых.
Бялее воблачкамі лотаць
У люстры сцішанай вады.

Стары трыпутнік непрыкметна
У пыл па макаўку завяз...
І так зямлю цалуе лета,
Нібыта у апошні раз.

* * *

За акном у нераце галля
Месяц маладым ляшчом заб'ецца.
Варухнецца, як дзіця, Зямля
У Сусвету вечнага пад сэрцам.
Млечны Шлях ручнік спяшае ткаць,
Росы зоркам абмываюць вочкі...
Светла ў сне ўсміхаецца дачка,
Цёплая, як ліпеньская ночка.

* * *

Жыла ты сумленна і проста
У падлеску сыноў і дачок
І ткала будзённасці кроены,
Што год — то асобны уток.

Вясна жаўруком адзвінела,
Сышла за абшары лясоў,
Зазімак крануўся нясмела
Тваіх залатых валасоў.

І дзецям усім без прынукі,
Як выраю, крылы даў час.
Ну, вось, дачакалася ўнукаў,
Да кроплі падобных на пас.

Твой хлеб сёння — нашыя весткі,
А нехта не піша ізноў.
А столькі зяцёў і нявестак,
А столькі дачок і сыноў!

Шукаюць яны незалежнасць
За доўгай далёкай вярстой.
Табе ж так няўцешна, няўлежна
У хаце маўклівай, пустой.

Матуля, прабач ім за :гэта,
І мне, бо і я не святы...

За сонцам прыкоціцца лета —
Сустрэнеш свой вырай і ты.

І нас тая усмешка прывеціць,
Якой не забыцца і ў сне...
Я ведаю — ты ёсць на свеце —
І цёпла, і радасна мне.

## ПАМЯЦЬ

*Васілю Быкаву*

Над зямлёй гарацъ вясёлкі мая,
Чуцен зумкат сонечных чмялёў...
Толькі памяць і любоў зямная
Не знялі і сёння шынялёў.

Недзе спее навальніцай здрада,
Смерць сваіх трымаецца слядоў.
Памяць чалавечая снарадам
Разбівае ўшчэнт накат гадоў.

Шлях яе і ў заўтра скіраваны
Напярэймы подласці, бядзе...
Лейтэнант, у стэпе пахаваны,
У атаку зноў узвод вядзе.

У яго адна ёсць мерка праўды,
І сумленне аддае загад —
З дзён былых наводзіць пераправу
І трымацца —
Ні на крок назад!

І з душы, і з баявога слова
Уцякае здрадлівы спакой.
Сэрца у грудзях напагатове,
Як граната з вырванай чакой.

* * *

Сонца над мядовымі пракосамі
Стомлена плыве за далягляд.
Я іду.
Цалуе ногі босыя
Травамі сасмяглымі зямля.

З воблака-кудзелі цягне нітку
Рэактыўны — ўвішны павучок.
Ластаўкі снуюць над полем нізка,
Быццам сесці хочуць на плячо.

Ад каго ж я прычакаю ласкі,
Як не ад зямлі, такой сваёй?
і таму здаецца дзіўнай краскай
Лебяда ля сцежкі палявой.

## РОДНАЯ ПЕСНЯ

А жнеі ў полі пеставалі песню,
Таму нам песня — тое, што і хлеб.
Яна нясе на сонечным крыле
Дабра і шчырасці людской прадвесне.

Да кропелькі яна ў сябе ўвабрала
І радасць, І маўклівую тугу.
Без песні гэтай жыць я не змагу,
Яе няма — і сэрца замаўчала.

* * *

Толькі вочы заплюшчу,
Я пачую тады —
За далёкаю пушчай
Рэхам клічуць гады.

Там, нібыта па момант
Прыляцелі снягі,
Ад вясёлых рамонак
Пабялелі лугі.

Заклапочаны нечым,
Ходзіць шпак між разор.
На патэльні сланечніку
Семак буйных, як зор.

Завязь яблык і сліваў
Зноў люляюць сады.
Там, як свет, я шчаслівы,
Там юнацтва сляды.

Толькі вочы заплюшчу —
Прэч — і сум, і бяду!
Там, за ўшацкаю пушчай,
У жыццё я іду.

* * *

У змроку плаваюць бярозы,
Бялей ад снегу — дождж адмыў.
Сады, кранутыя марозам,
Ад комінаў да зор — дымы.

Знаёма ўсё і не забыта —
І гэты шлях, і хат агні.
Цяплу жаданаму адкрыта
Душа, як і ў былыя дні.

І лёгка мне, і добра дома,
Гляджу з падзякай на зямлю.
Мне стала толькі тут вядома,
Каго і што ў жыцці люблю.

Таму і думаецца светла
Над пошум векавых бяроз.
Махаю ім рукой прыветна,
Нібыта свой вітаю лес.

**ДЗЕД**

«Саб'ю труну — і на гару,
Змайструю, нібы цацку.
І пахаваюць, як памру,
Не абы-як. Па-царску!» —

І, папляваўшы па далонь,
Дзед браўся за сякеру.
Зноў расчыняла ўсё сяло
Прад майстрам насцеж дзверы.

Каму — шчыльней падціснуць столь,
Каму — паставіць рамы.

Пастукваў дзятлам малаток
І ўвечары, і ўранні.

І зрубы, як грыбы, раслі,
Дварышчы пахлі стружкай...
У хаце хтось дачку туліў,
А нехта сына гушкаў.

А ён падковай гнуў спіну,
І ўсё зрабіў як быццам...
Суседзі ладзілі труну —
Дзед пра яе забыўся.

* * *

Абуджан лес сабачым брэхам,
Кулём ад елкі да сасны
За беляком імчыцца рэха
І б'е у вушы, як званы.

І можа б я — пагоні сведка —
Зайчыных не заўважыў слёз,
Калі б не помніў, што нярэдка
Быў і ў людзей падобны лёс.

## ЛЁН

Я трохі паблукаў па белым свеце,
Ды больш не ўбачыў гэткае красы.
Расчэсвае льняныя пасмы вецер,
Нібы дзяўчаты нанач валасы.

Нядоўга сонцу шчодраму кружыцца,
За сіні лес закоціцца цішком.
Засцелецца жыццця твайго сцяжына,
Як першым снегам,
белым ручніком.

Сумуе лён,
маркоціцца аб леце,

І светлы сум
чуйнейшым робіць слых.
Мелодыю вякоў выводзіць вецер
На звонкасрэбных
струнах ільняных.

* * *

Якія ночы дорыць жнівень!
Сакочуць конікі ў траве.
Качыны вывадак імкліва
Дарожкай месяца плыве.

А зоркі вышай падняліся,
Буйнее золкая раса
На цёплым,
як далоні,
лісці,
На непагасных верасах.

Ласкава шэпча ў вуха вецер,
Сасна шуміць над галавой
Аб тым, што я у гэтым свеце —
Жаданы самы, самы свой.

І добра мне ісці сцяжынкай
Ці каляінай палявой,
Крывінкай кожнаю і жылкай
Зліваацца з роднаю зямлёй.

* * *

Паліўся дождж раптоўна,
Нібы з вядра,
абдаў,
Сіпіць паблізу чоўна
Раз'юшана вада.

Прыкметам не паверыў,
Вярнуцца ў час не змог.
Цяпер навошта бераг,

Калі да ніткі змок?

Кладзі па лаўку вёслы,
Аддайся волі хваль
І слухай звонкі плёскат —
Вясёлых кропель баль.

Дождж маладзіць паволі
Прырэчныя сады...
І я не быў ніколі
Як сёння малады.

## ВЯСНА

Нас вясна ўзяла за рукі
І па свята павяла
У прастор, дзе спеюць гукі,
Дзе аблёт вядзе пчала.

Сэрца насцеж, вочы насцеж,
Насцярожан чуйны слых.
Колькі радасці і шчасця
Нам з табою на дваіх!

Грае ў сонечныя трубы
Бор сівы,
            звініць рака...
Як падлётак жаўтадзюбы,
На зямлю глядзіць дачка.

* * *

Наскрозь прасвечаныя сонцам,
Калышуць неба галубы.
Паруе бульбінаю сопкай
Зямля, чакаючы сяўбы.

Блішчаць салдацкімі штыкамі
Крутыя лемяхі плугоў.
А далеч ясная такая —

Няма для рэха берагоў.

Грымоты мірнага змагання
Гучаць меладыяй вясны.
Мне людзі бачацца багамі
Часінай першай баразны.

Руплівасць іх паклону варта —
Пасеяў, вырасціў, змалоў...
І я ў глыбі душы упарта
Шукаю зерне добрых слоў.

## СЕЙБІТУ

Вось і надышла ў душы вясна...
Зноўку пальцы чуюць цёплы дотык —
Рунь пад снегам спіць
у кроплях поту,
Значыць будзе,
будзе жыць яна.
Стома, мазалі...
Пра іх пасля.
Ручаі прабілі льду скарынку.
Светлым прадчуваннем мацярынства
Шчодрая напоўнена зямля.

Хай шукае нехта бальшакі,
А твая бяжыць сцяжына полем;
І няма на свеце лепшай долі —
Несці жытні колас праз вякі.

* * *

Вада пяе ў яры па донцы,
Бярозы не хаваюць слёз,
Прынёс у дзюбе бусел сонца
І пыл заморскі з крыл абтрос.

Вітаю вас, вясны прыкметы,
Абновы лепшыя з абноў...

Зноў бусел, як і я, сагрэты
Дымком, што ўецца з каміноў.

* * *

Устае вясёлка маладая,
Басанож па возеры брыдзе.
Хлапчукі каменьчыкі кідаюць —
Чый далей праскача па вадзе?

Нават камень можа лёгка лётаць!
Захацелася, што не стрываць,
Даўнюю увішнасць мне ў ахвоту
Перад імі прадэманстраваць.

Спрытныя «калегі» не пахваляць...
Ці на шчасце, ці то па бяду,
Мой каменьчык слізгануў па хвалі
І пайшоў бясследна пад ваду.

* * *

Сонная пацягваецца рэчка,
Круцяцца стракозы ля кустоў.
Хлапчукоў галовы,
як сланечнікі,
Свецяць а прыбярэжных чаратоў.

Трэба ўпільнаваць,
калі імкліва
Дасць нырца лянівы паплавок.
Вочы засціць,
шчыпле нецярплівасць,
Ўздрыгвае душа,
што ні ківок.

І рачулцы вырвацца няцерпіцца
На прастор духмяных мурагоў,
Ад світальнай свежасці пацепвае
Плечукамі ціхіх берагоў.

* * *

Дзень крыло распасцёр
Вольна,
шырака,
смела.
Над вачамі азёр —
Бровы воблакаў белых.

Слаўна як на зямлі!
Ды над колкаю пожняй
Кружыць вогненны ліст —
Мо апошняя пошта?

Чалавеку глядзець,
І любіць,
і здзіўляцца.
Толькі нітцы падзей
Прыйдзе час абарвацца.

І святлець галаве,
Бо і горка,
і ўсцешна...
Ля абрыву плыве
Верасовая сцежка.

## ВУЗЕЛЬЧЫКІ

*
Зямля ў нас, напэўна, такая...
Пастой хоць імгненне ў цішы —
І песня ў табе загукае,
І вылеціць птушкай з душы.

*
Прыходзіць незвычайная хвіліна,
Калі вастрэе слых, пільнее зрок,
І нібы гронку росную рабіна,
Раптоўна сэрца выспеліць радок.

*

Павучок промні ў кроснах крапае,
Ападаюць з ляшчыны па дол спарышы.
І уладна на троп заступаю
Раўнавага ў прыродзе,
Раўнавага ў душы.

*

Зямля мая — карміцелька людзей,
Высокіх мар і дабраты калыска!
Хачу абняць цябе,
прыціснуць да грудзей
Усю — і з кветкамі,
і з абеліскамі....

## ТАБЕ АДНОЙ

Табе адной я нёс пяшчоту,
Ды па дарозе разгубляў
Сярод снягоў, слаты, спякоты,
Сярод сяброў, пустых забаў.

Прыйшоў я нетаптанай сцежкай
І стаў, як месяц, пры акне,
А ты з даверлівай усмешкай
Глядзела моўчкі на мяне.

Без ушчуванняў і папрокаў
Руку малую падала,
І я пайшоў няспешным крокам
На водбліскі твайго святла.

І слова, што ў душы звінела,
Цвіло чаромхавай вясной,
Было таксама зразумела
Табе адной, табе а дной.

## ЕДУЦЬ МАЛАДЫЯ

Сонца высіцца над вёскай,
Як вясельны каравай.
— Едуць, едуць! — пагалоска
Паляцела з краю ў край.

Песняй даўняй свет абуджан —
Пастараліся сваты.
Па дарозе, нібы ў бубен,
Б'юць занята капыты.

Чорнай хмаркай — коней грывы,
Вэлюм — птушкай трапяткой.
Тройка коціцца імкліва
Заінелым бальшаком.

Ім двоім не страшна сцюжа,
Ім бы так не дзень — гады.
Маладая рдзее ружай,
Ясны месяц — малады.

Вы мяне прабачце, людзі,
Ды ў вазок бы сеў і сам...
Каб аж сэрца рвала грудзі,
Каб аж полаз — папалам!

## УСПАМІН

Ты помніш? Ноччу чорнай,
Як месяц не свяціў,
Крадком — у дзедаў човен
І наўпросткі у ціш.

Нас туманы хавалі,
І вецер быў нам брат.
А човен неслі хвалі
Да берага, у сад.

Там яблык самы спелы,

Стаіўшы мройна дых,
Нібы Адам і Ева,
Дзялілі па дваіх.

Світання спеў празрысты,
Ты ў ім цвіла, жыла...
Мы: прыплылі на прыстань,
Ды толькі без вясла.

А дзед злуе уранні:
— Бач, чэрці, не да сноў...
І уцяньку старанна
Вясло габлюе зноў...

Ты помніш? Ноччу чорнай
Іду я за сяло...
У дзеда новы човен
І новае вясло.

* * *

У мураве някошанай
Маланкі ног засвецяць.
Бяжыць дзяўчына з кошыкам,
За ёй хлапец,
як вецер.

Уражана іх смеласцю
Сунічная палянка...
Духмянай вуснаў спеласцю
Апаліць паланянка.

* * *

Як многа значыш ты адна...
Ты для мяне — зямля і травы,
У завіруху ты — зіма,
У час цвіцення ты — вясна...
Душу высвечваеш да дна,
Як промень сонечны, ласкавы.

## КУПАЮ ДАЧКУ

Я шчаслівейшай справы, чым такая,
Не мог прысніць і ў сне сваім найлепшым
Дачку купаю, а яна рукамі
З высокай белай пены нешта лепіць.

Любоў і радасць дораць свету вочы,
Блакіт у іх цвіце, мігціць цяпельцам.
Над даланёй, нібы пацёрта воскам,
Пяшчотнае яе спявае цельца.

Малая узнялася на каленькі,
Вымаю цёплую яе з глыбокіх ночваў...
Тчэ завіруха шлюбныя сукенкі
Для маладзенькіх яблынь цёмнай ноччу.

## САД ЦВІЦЕ

На зямлі святлей не будзе,
Чым у гэты добры час.
З хат хутчэй выходзьце, людзі...
Сад цвіце.
          Ён кліча вас.

Кліча свежасцю пялёсткаў,
Што у кропельках расы.
Кліча уздыхнуць з палёгкай
Перад вечнасцю красы.

Ён святлом дзяліцца рады,
Толькі хоча, каб святло
Стала завяззю спагады,
Дабратою прарасло.

Вецер квецень не варушыць.
Свет замёр...
          Ідуць гады...
Хай вось так людскія душы
Расцвітаюць, як сады.

## ЛЯ «СІКСЦІНСКАЙ МАДОННЫ»

Дыхае холадам з петраў пячоры,
Жудасць стаілася ў ёй па кутках.
Звера бялее абгрызены чэрап...
Маці люляе дзіця на руках.

Панскі бізун да крыві апякае,
Кроў, як раса, на худых каласках.
Сцежка да волі надта цяжкая...
Маці люляе дзіця па руках.

Полымя устала барвовай сцяною,
Дзень,
        чорным дымам спавіты,
        зачах.
Гергет фашыстаў чуваць за спіною...
Маці люляе дзіця на руках.

Сонечны зайчык па тварах блукае,
Плешча ля ног
        цёплай хваляй рака.
Цешыцца сэрца — хвіліна такая...
Маці люляе дзіця на руках.

Неба,
        ад атамнай бомбы не трэсні,
Зоры,
        надзеяй свяціце ў вяках,
Вецер,
        спявай ёй найлепшыя песні —
Маці трымае жыццё на руках.

* * *

Увагай шчырай, пацалункамі
Не надакучыш любай —
І вочы адтаюць, як лункі,
І сонечна смяюцца губы.
Уся яна, як сад маёвы,
Зноў поўніцца святлом пяшчоты...

Шкада, што казачныя словы
Мы хочам зберагчы па потым.

* * *

Запамінаю кожны дзень,
Якім ён ёсць запамінаю —
І сонца над зялёным гаем,
І над старою вішняй цень,

І спевы жаўранка ўгары,
І пах духмяны колкай пожні,
Нібыта гэты дзень апошні,
Апошні на календары.

Прашу яго: ты не мінай,
Яшчэ такім ці будзе новы...
І чую —
            нехта шэпча словы:
— Запамінай, запамінай...

* * *

Заснула Зямля... Лугавіна Сусвету,
Як кветкамі, зоркамі зноў расцвіла.
Гляджу на відовішча дзіўнае гэта —
Ні зябка, пі цёпла, павер, ад святла.

І ночы, і дні меле вечнасць у жорнах,
А радасць прыходзіць тады, як міргне
Сярод забыцця і маўклівасці чорнай
Агеньчык маленькі ў знаёмым акне.

Ляцяць хай імгненні, як вецер крылаты,
Як рэкі у мора, сплываюць гады.
Я родную зорку бацькоўскае хаты
Між вечных агнёў распазнаю заўжды.

## ЗАЛАМІЎ АСІНКУ ХЛОПЕЦ

Заламіў асінку хлопец,
Думаў — дзеўку прысушу.
А яна стаіць за плотам,
Точыць сэрца і душу.

Вусны спелыя, як вішні,
Бровы, нібы ўзмах крыла.
Ўсё аддаў бы, толькі б выйшла,
Толькі б голас падала.

Ах, як хлопец занядужаў,
Сеў на росную траву,
І ў цяжкой гаротнай думе
Звесіў сумна галаву.

Счырванела, як шыпшына,
(Добра, што не так відно!)
Падышла бліжэй дзяўчына,
Прашаптала ледзь чутно:

«Ладна, нацалую ўпотай,
Ты як сыч той не глядзі
І не грукайся ў вароты,
Мамку лепей не будзі!»

* * *

Жыццё шуміць, як гай зялёны.
Пражыты дзень — апаў лісток.
Ідзе ад каранёў да кроны
Трывогі восеньскае ток.

І чалавек, нібыта дрова,
Жыццёвы спасцігае рух.
Мудрэе ён ці не мудрэе —
Наплыў па сэрца новы круг.

* * *

Душа чалавека, нібыта рака,—
Імклівая плынь і устойлівы бераг.
Яе дабраты і любові не змерыш,
Душа чалавека, нібыта рака.

Калі абмялее аднойчы рака,
То ёй чалавек — дапамога спрадвеку.
А хто дапаможа душы чалавека,
Калі абмялее яна, як рака?

## ЗАЎВАГА

А ён утаропіцца тупа
І будзе клясці цэлы свет,
Калі незнароку наступіць
На ногі ў трамваі сусед.

І поўны варожасці голас
Нічым і ніяк не суняць...
А быў ж а і холад, і голад,
Ды людзі жылі, як радня.

Павагу і добрае слова
У нашыя мірныя дні
Давайце вучыцца папова,
Як хлеб у блакаду, цаніць!

* * *

У кулаку, як жаўрука-падлётка,
Заціснуў сэрца неспакойны век,
Ды ўсё ж кажу я шчыра —
гэта плёткі,
Што чалавек сягоння ачарсцвеў.

Да скону буду з вамі ў добрай згодзе,
Мае лясы, азёры і палі.
Сярод людзей сяброў сабе знаходзіў,
А вы ў душы нязменныя жылі.

Іду да вас і ў ясны дзень,
і ў слоту,
Як на спатканне першае —
дзяўчо,
Каб зноў адчуць
бяссонных хваль пяшчоту,
Лясін шурпатых моцнае плячо.

* * *

З абрыву сцежка кінецца —
Крутая.
Рабіна жарам дыхае з тары.
І каляндар увішны год гартае,
Яшчэ лісток — і сталасць на двары.

Пасланы па зіму,
Бы ў нейкай змове,
Над паплавамі трубяць журавы.
Прыйшла пара вучыцца простай мове
Лясоў і птушак,
Ветру і травы.

## У ХВІЛІНУ ВЯРТАННЯ СНЯГОЎ

У хвіліну вяртання снягоў
Пазіраюць у неба лясы і азёры,
А над імі сняжыны, як ціхія зоры,
Робяць безліч малых і вялікіх кругоў.

У хвіліну вяртання снягоў
На маўклівай зямлі,
як ніколі, трывожна.
Прадчуваючы хуткі палон, асцярожна
Рэчка мацае хваляй цяпло берагоў.

У хвіліну вяртання снягоў
Вецер сціх,
на грудах акалелых распяты,

І кляны заінела пасталі ля хаты
Дрэўкамі без палотнішчаў
зыркіх сцягоў.

У хвіліну вяртання снягоў
Неўміручым так хочацца
быць чалавеку.
Толькі ведаю я,
што бясконцага веку
Не спытаць, не купіць
ні ў людзей,
ні ў багоў.
У мяне неаплочаных многа даўгоў,
Ды дарма бедаваць,
сумаваць аб пражытым.
У сэрцы шчодрыя мары
ўзыходзяць, як жыта,
У хвіліну вяртання снягоў.

## РАНАК

Бяруся за клямку з ахвотай —
Што лепей марознай пары?
На белых далонях сумётаў,
Як гронкі рабін, снегіры.

А ранак, бы твар немаўляткі,
Ружовы і чысты такі.
Спяваюць пад полазам гладкім
Нацятай струной бальшакі.

А побач сцяжынкаю крохкай
Залівісты коціцца смех.
І пахне надрэчнай чаромхай
Яшчэ не заплямлены снег.

І з мудрасцю, сталай, глыбокай,
На свет, што ахвота абняць,
Глядзіць залацістае вока
Зусім маладзенькага дня.

* * *

Даганяюць снягі маладых жураўлёў,
Стынуць гнёзды,
як хаты з забітымі вокнамі.
Захлынулася неба
пранізлівым воклічам,
Вецер штосьці шукае
між сонных палёў.
Пагляджу, і тады пачынаю спяшаць
Па жыццёвай сцяжыне
таропкімі крокамі.
Мне няўцям, што снягі
дорыць неба высокае,
Каб святлела зямля
і мудрэла душа.

* * *

Я жорсткасці зазнаў урокі,
Ды больш вучылі дабратой.
І каб, здаецца, не сурочыць,—
Жыў і жыву навукай той.
Без боязі адкрыты вочы
У свет, што вулеем гудзе.
Лічу я: жорсткасць, — гэта ночы,
А дабрата — высокі дзень.
Хоць цяжка іх паважыць, змерыць,
Кажу з адзнакай праваты —
Я ў сілу жорсткасці не веру,
Я веру ў сілу дабраты.

**ПАМЫЛКІ**

«Не паўтарайце нашых памылак!» —
Чуем бацькоў клапатлівы загад...
Часам, як хваляй, словы іх змыла,
Рэчкай віруе жыццё ў берагах.

Сэрца, прымай і цяжар,
і трывогу,

Сонцам
надзеі зярняты спялі!
Звернем убок,
Потым — зноў на дарогу,
Гэтак упарта далей па зямлі.

Будзе пара —
і па сцежцы застылай,
Той, што вяла ад вяснЫ да зімы,
«Не паўтарайце нашых памылак!»
Скажам аднойчы дзецям і мы.

## ВОДБЛІСКІ

Даём мы аднойчы прысягу
На вернасць любімай зямлі.
Барвовыя водбліскі сцяга
З маленства на твар мне ляглі.

Не страшная злая часіна,
Калі нават сіл не стае,—
Глядзіць,
нібы маці,
Айчына
Уважліва ў вочы мае.

## ЧАКАННЕ

У родны кут імкнуцца птушкі,
Са свістам рэжучы прастор.
Ад крылаў — цені, нібы стужкі,
Спадаюць на блакіт азёр.

Зямля цвіце:
— Ляціце, дзеці!
А для матулі век — зіма...
І сонца шчодра
ў шыбы свеціць,
І ластаўка

гняздзечка
лепіць...
А сына ўсё няма,
няма.

* * *

Жаўцеюць на сценах партрэты у рамках,
Ласкава сыны па матуль пазіраюць.
А тым не заснуць аж да самага ранку,
Рукам сваім справы шукаюць, шукаюць..

Засніце, матулі, забудзьце свой клопат,
І ў сне зарыпяць ціха дзверы у сенцах...
Сыны, што ляжаць у палях і акопах,
Ідуць размініраваць боль вашых сэрцаў..

## УНОЧЫ

Людзі спяць —
Спакой над белым светам.
Мо каб бараніць іх мірны сон,
Кулямі зярнят пабіла лета
Цёплыя абоймы каласоў.

Ціха ў вёсцы...
Ды пярун у гневе
Скалане раптоўна стрэхі хат,
Бліскавіцамі успыхне неба —
І адчуе сейбіт —
Ён салдат.

## ТЭЛЕФОН ВАЕННАЙ ПАРЫ

Іржавыя крукі ўствалах хваін
Трымаюць дрот абвіслы над балотам,
Дзе чырвань перамерзлых журавін
Апошні снег сячэ гарачым шрохам.
Я чую покліч хлопцаў маладых,

Прабіўся ён праз бой і холад смерці...
Гудуць над галавою правады —
І адгукаецца на выклік сэрца.

* * *

Землякі, землякі... Вашы ўтульныя гнёзды
Неаднойчы траплялі у прысак вайны.
Ды заўжды узнімаліся рана ці позна
На былых папялішчах дамы і сыны.
Дзе ты большую вернасць
зямлі сваёй знойдзеш,
Дзе такія пакуты убачыш яшчэ,
Калі кожную раніцу босыя ногі
Праз падлогу ім прысак астылы пячэ?

**НА ПАРТЫЗАНСКІМ АЭРАДРОМЕ**

Прыйду сюды адзін маўклівай ноччу,
Калі раскіне цемень свой шацёр.
Нібыта мой сігнал чакае лётчык,
Запальваю аж да нябёс касцёр.
Вакол пасталі сосны у дазоры...
Мне полымя вышэй узняць карціць,
Хоць ведаю, што ён, чырваназоры,
З гадоў грымотных зноў не прыляціць.
Падкладваю ў агонь сушняк старанна,
З травой, з сівым туманам гавару,
Пакуль касцёр, што ўзняўся над палянай,
Не перальецца рантам у зару.

* * *

Галінка хрусне, як курок,
Туман перад вачмі растане...
Ідуць падрыўнікі з задання,
Я чую іх няспешны крок.

Тол помсты ворагаў спыніў —
Цягнік дыміцца пад адхонам...

А на бруснічніку зялёным
Гарaць пунсовыя агні.

Бярозам не забінтаваць
Таварыша смяротнай рапы.
Маўчаць пад ношай партызаны,
А боль такі, што не стрываць...
Калі патраплю я ў бяду
Ці так, хоць плач, мне цяжка стане,
Тады падрыўнікі з задання
Па ўзлеску памяці ідуць.

## НЯВЕСТЫ ВЁСКІ МУРАГІ

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска
Мурагі Ушацкага раёна была спалена
фашыстамі, а яе жыхары — расстреляны.
Сярод іх былі маладзенькія дзяўчаты.

Касцоў вясёлых прымаўкаюць крокі
Ля дзічак, што у завязі стаяць,
Бо вечным сном
тут пад травой высокай
Нявесты вёскі стлелай ціха спяць.
Мурог мужчыны абыходзяць з косамі,
Бо кожны ўзмах іх — боль для той зямлі,
Дзе спеюць, нібы слёзы, буйна росы,
Дзе.травы сумнай песняй узышлі.
Ой, касу расплятай, касу русую,
Вусны больш не кусай, бо накусаны...
Агорклым яблыкам да жніўня не ўтрымацца,
Вось першы несаспелы ўніз ляціць...
І ўсё ж спазналі дзічкі шчасце маці,
Нявестам жа — матулямі не быць.
І на руках ласкавых ім не гушкаць
Крамянага, як яблычак, сынка,
Спяць разам з імі песенькі-пястушкі .
Пра зайку і пра шарага ваўка.
Прыйдзе, прыйдзе зайка ў сон,
І ваўка прагоніць ён...

Даўно ўжо дзічкі ветрам абцярушаны,
Свет цішынёй глыбокаю аглушаны.
Сшывае вэлюм з маладых снягоў
Зіма нявестам сталелых Мурагоў.

## АПОШНІ ШЛЯХ

Ім больш не ўбачыць з цеснай дамавіны,
Як рэчка б'ецца ў сцены берагоў.
Як палымнеюць ля дарог рабіны
Трывожным шоўкам баявых сцягоў.

Яны плывуць знаёмым шляхам строга,
Іх рукі стомленыя на грудзях ляжаць.
Аркестра медзь расплаўленая стогне,
І гукі, нібы горкіх слёз імжа...

Як бінты, што прысохлі да раны,
Адрывае смерць ад нас ветэранаў.

## КУЛЯ

Калгасам ладзілі ёй хату —
Героя маці і ўдаве.
На шчасце лёс не быў багаты,
А тут адчула, што жыве.
Дом, як званочак, зграбны, новы,
Вачамі шыб на свет глядзеў.
Жытло струхлелае — на дровы,
Нашто палохаць ім людзей.

І талака, нібы мурашнік,
Вянцы параскідала ўміг.
Старое пілаваць не цяжка,
Ды рантам скрыгат...
　　　　Гоман сціх.
Глядзела па пілу трывожна,
Стаў твар бялей ад палатна,
Калі мужчыны асцярожна

Вымалі кулю з бервяна.
Дзень абярнуўся цёмнай ноччу,
Зноў нібы ў пекле пабыла.
— Ён ля сцяны стаяў... Сыночак!
Яна тады цябе звяла...
Кавалак сплюшчаны металу
Ператрымала паўсяла.
А бабка ўсё ў людзей пытала:
— І як я побач з ёй жыла?

* * *

На брустверы траншэй
і рэшткі дотаў,
Што стоены ля вёсак і лясоў,
Ідзе рашуча ў наступ,
як пяхота,
Сцяна густая жытніх каласоў.
Знасіліся вайсковыя мундзіры,
І ў бацькі зарубцована спіна.
А тут яшчэ не падпісалі міру,
А тут ідзе маўклівая вайна.

## ПРАРЫЎ
**(Паэма)**

*Жывым і палеглым, вядомым і невядомым героям, прарыву фашысцкай блакады ля вёсак Паперына і Новае Сяло Ушацкага раёна вясной 1944 года*

### Ліпень дыктуе ўступ

Сонца ўбівае дакладна і цвёрда
Промні, як палі, у хвалі ракі —
Наводзіць тэрміновую пераправу.
Змучаныя прыпарам шчодрым,
Чмялі закручваюць вусы-клінкі,
Падаюць стомлена ў травы.

Лёг і я па аблачынцы зялёнай,
Галаву скошаны хмеліць мурог.
Дачку павёў да красак ліпень...
Добра ім у зямлі на ўлонні,
Уся яна, як завершаны стог...
У пастуха да спіны кашуля ліпне.

На паўдзён каровы сунуцца млява,
Наскубліся па халадку,
у пачатку дня,—
Вымя напоўнена даастатку.
Зброда ў аер зыкнула жвава,
Каб утапіць пякучага авадня
І зноўку трымацца статку.

Неба раптоўна саспела чарніцай,
Кроплі з хмар строс ветру парыў,
Дождж цуруболіць, як малако ў даёнку,
Шабляй крывой бліснула агнявіца,

Пярун зямлю страсянуў...
Прарыў!
Сарваным рамонкам
коціцца да мяне Алёнка.

Не бойся, дачушка. Бачыш, святлее...
Вясёлка вясельнай дугой над ракой —
Для нас стракатая пераправа.
Глядзі, як дажджынкі зрываюць лілеі...
На левым беразе мы з дачкой,
Мінулае — на правым.

Пойдзем туды па цішыні,
На донца душы прыхаваем словы...
Глуха стукнула ў лесе аб карані
Каня партызанскага падкова.

### А цяпер мае слова

Кажуць мне: пра вайну не пішы...
Што ты ведаеш, хлопец, пра гэта?

Лепш рыфмуй, як спявае ў цішы
Добры жаўранак — пестун лета.

Як грымяць ад світальнай пары
(Ім супынку няма да змяркання)
На абсягу зямлі трактары,
Сталлю крышачы хмыз і дзірванне.

Як пяшчотная маці ляціць
Цёплай ластаўкай да калыскі,
Як для кожнага шчасце ў жыцці —
Крок наперад ступіць — блізка-блізка.

Я маўчу.
Што сказаць мне вам, людзі?
Радасць з намі была, ёсць і будзе.
Толькі сцежка маленства
назад вяртае,

Сівізной
Галава маёй маці світае.

Рыпяць пад нагамі масніцы,
Ёй і гэтай ноччу не спіцца.

Мама, боль не хавай.
Гавары, гавары...

І я слухаю словы яе да зары,
І здаецца мне, што ні кажыце,
То не жаўранка спеў угары —
Звоняць гільзы ў стаптаным жыце.

То не трактараў велічны спеў —
Рэжуць поле крыжастыя танкі.
Змружыць хлопчык павек не паспеў —
Лязгат гусеніц з'еў калыханку.

Успаміны плывуць туманом пасівелым...
На ложак яблыкам саспелым
Падаю, нібы ў баразну.

Толькі зноў не засну.
Нада мною мама — вішняю белай,
Замест калыханкі
          расказвае пра вайну.

Між мінулым і мной
Яна — сувязной.
Вось і споведзь яе пачалася...
Гэта не я пішу, можаце паверыць.

Як у першым класе,
Маміна рука
          водзіць маю па паперы.

### Чорная раніца

Гоніць колас літы збажына,
На стагоддзі ў паветры азону.
А побач з партызанскаю зонай
Ходзіць з ашчэранай зяпай вайна.

Шэранню воглай, нібы дзеразой,
Ранак спавіў прысады і хаты,
Нарэшце дзіравае неба залатаў,
Каб не сцякала сцюдзёнай слязой.

Певень па жэрдцы, нібы генерал,
Лопае крыллем, жмурачы вока,
Аглядае сваё чубатае войска,
А потым сонца кліча: «Пара!»

Толькі нешта бавіцца яно,
Пэўна, пра пасаду сваю
          не помніць...
Нібы дачка з вечарынкі позняй,
Раніца промнем шкрабецца ў акно.

Сон салодкі, спакойны час.
Сяннік не намуліць плечы.
Ды трэба жанчынам
          распальваць печы,

Мужчынам за коньмі ісці
на папас.

Плямка сажы, нібыта гузак.
Сляза ад лучыны дымнай.
Трэцца ля ног гаспадыні
Чорны, як ночка, кот-памаўза.

З печы, з полу
Усе да столу,—

Чуцен па хаце ўладны крок...
Галодным ніколі не будзеш,
Калі ў чыгунку сопкая бульба,
У місе салёны, як доля, гурок.

Няважна, што поена,
Абы за стол сесці не позна.

Глядзіш, ужо жывот не пусты,
Прыпасу да вечара хопіць.
З сенам будзеш, як зараз ухопіш —
Буяе мурог сакаўны, густы.

Раніца крошкі змяла са стала,
Вёска гудзе ўжо, як вулей.
Да плошчы па пыльнай вуліцы
Калона ўзброеных прайшла.

Імчаць стрымгалоў да яе хлапчукі:
— Дзядзечкі, вы партызаны?
Нічога малым не адказалі,
Толькі ўсміхнуліся чужакі.

Няма прадчування блізкай бяды,
Як мора, глыбокай, страшэннай.
Капшукі вымаючы з кішэняў,
Паважна сунуцца пагаманіць дзяды.

Джалам змяіным зуб залаты
У старшага бліснуў у роце:

— Дзень добры, таварышы!
Як жывёце?
Што нам скажаш, дзядуля, ты?

Дзед Мацей схіліў бараду,
І, як заўсёды, пачаў не здалёку:
— Якая цяпер пры Гітлеры жысць,
Хоць жыўцом у магілу лажысь...
Атруціў усё сабакар касавокі,
Каб яго чэрці ўтаўклі ў ваду!

Абступіла «партызан» уся грамада...
— Столькі ідзём пехатой...
Папіць бы вадзіцы...
Подбегам да хат
за малаком маладзіцы:
— Навошта вам, людцы, тая вада...

Нясуць запацелыя глякі.
— Дзякуй богу, не на вяроўках
Вісяць у хлявах кароўкі.
П'юць госці, аж бегаюць кадыкі.

На конях мужчыны плывуць талакой.
Стрыгуць вушамі, не йдуць вараныя —
Кроў прадчуваннем чорным ные...
Дзяўчына насустрач,
махае рукой:

— Мужчынкі, вяртайцеся назад.
Навокал ведаю атрады ўсе чыста.
Гота не нашы...
Чуе сэрца — фашысты.
Рускім прыкідваецца
з фіксаю гад.

Адны ў завулак — і да кустоў,
Другія смяюцца, шыбуюць прама...
Жывыя і зараз,
я ведаю, мама,
Лічаць сябе за тваіх братоў.

Разняволіла хеўра свае каўняры,
І з-пад адзежы простай
Блішчаць чараны :і косткі.
Смяюцца здаволена, сыта звяры.

Для тупога арыйскага языка
Цяжка славянскае поўнагалосся.
Загергеталі.
Бабы галосяць,
Гледзячы на бляск халодны штыка.

Стаялі, як сосны —
камель да камля,—
І вочы мужчын помсты гнеў выкрасалі.
Не холадам смерці, а каласамі
Пахла над сонцам сырая зямля.

Неба ў пякучай чорнай імгле,
У полымі вёска канае...
Сцяжынай знаёмай
бяжыць сувязная
З жахлівай весткай у лес.

**Слухаю зямлю**

Зары пагасла вогненная стужка —
Зняў з галавы кубанку бор стары...
Людзей клапотнай стомай
дзень загушкаў —
Святло ў пасёлку знікла без пары.

Паклаў дачку...
І светла, і шчасліва
Яна жыццю ўсміхаецца праз сон...
А я стаю на вуліцы маўкліва
І слухаю курантаў ціхі звон.

Паклікала мелодыя жывая
Укленчыць з непакрытай галавой
Перад зямлёй, якую называюць
Яшчэ дасюль у нас —

«другой Масквой».

Ёсць і на мне
знак гордасці зямляцкай,
Хоць не гарац‌ь па целе меткі ран.
Таму што слова сціплае — ушацкі,—
Сінонім баявому — партызан.

І хоць няма пасведчання, рэгалій,
Скажу усё ж, што быў я на вайне.
Калі у маці карнікі стралялі,
Яны стралялі, значыць, і ў мяне.

Я кратаў бацькі дымныя пагоны,
Бег у жыццё сцяжынай той вясны...
Перапляліся над калыскай кроны,
Шумелі дрэвы — міру і вайны.

**Сын**

Тыфус з касой стаіць над душой,
Злегла надоўга маці.
А ёй час нарадзіць падышоў...
Не радасна,
жудасна ў хаце.

Цень ад лучыны паўзе па сцяне,
Сціскае за горла гора.
І зоркі нават атухлі ў акне,
Ад дыму ўчарнелі зоры.

Шчасце якое — прывесці жыццё,
Няважна дачку ці сына.
А маці ўпадае у забыццё,
Бабуля дрыжыць, як асіна.

Маленечкі, з драўляную лыжку,
На свет па світанні
з'явіўся Мішка.
Смерць злосна шыпіць: «Адны косці.,,
Спяшай хутчэй да мяне ў госці...»

А маці ёй з забыцця: «Не аддам!
Будзь здаровым, як вада,
Будзь багатым, як зямля...»

...Люд барадаты ў зямлянцы маўчыць.
Хто дапаможа і чым?
Хто дасць рады?
Няма ўрача ў атрадзе.
Няма і лекаў... Быць бядзе...
Ногі паліць вярста да чужынцаў —
З малым на руках бабуля ідзе,
За спіной, у мяху, гасцінцы.

Немец-урач — амаль дабрадзей.
Паважна позірк узвёў да столі,
За парася і двух курэй
Сыпнуў з паўшклянкі солі.

Як у кобры, вочкі
            за акулярамі міргнулі.
Кінуў пілюль у жменю бабулі.
А потым рукою махнуў на дзверы
І зноў стаў позіркам
            столь мераць.

Былі надта дарагі тыя пілюлі,
Таннейшыя лекі ў фашыстаў — кулі.
Яны потым часта «лячылі» Мішку,
Які быў маленькі:
            не большы за лыжку...
Старых і малых выганяюць на лёд,
І брэша аўчаркай на іх кулямёт...

Чаму мой аловак спыніў свой разбег?
Чаму запяршыла ў горле?
Бабуля ўнука, як зайку, у снег —
Схавала, чуваць яе голас:
— Люлі, люлі, люлі...
Пайшоў кот па дулі.
Памарозіў лапкі —
Палез па палаткі.

Сталі лапкі грэцца —
Недзе катку дзецца...

### Маналог у аўтобусе

Аўтобус чхае —
мясцовы маршрут...
Як авадзень, ля вуха:
— Дзе ты, Лёнька?
— Я тут.
— Хадзі, садзіся, братуха.

Бабка, прымі чыгун з-пад ног,
І ты, маладзён, не тлуміся.
А то вы такія — плечы, як стог,
Пацееце ж толькі над місай.

Дзяўчаткі мае, сыраежачкі,
Пасаліў бы я вас...
Няма дзежачкі.
Дайце я ля вас бачком
Праціснуся з гэтым мужычком.

Сядай.
Ну вось... Аж змокла спіна.
Улезлі, нарэшце, стрыечны...
Эх і слаўную сёння нам
Цётка Маня ўзаб'е яечню.

У вас у Сібіры, кажуць, прастор,—
Вёрст з сотню на чалавека.
А ў нас у суботу такі затор —
Едуць у вёску, бы ў Мекку.

Яно сапраўды, горад — адно,
Дый тамака спраў нямала.
Хто блізкіх не бачыў даўно,
Хто ў кубел да бацькі па сала.

А дзень, глядзі, запяўся які!
Дзянёк, як нявеста, харошы...

Не мацай ты, цётка, свае кашалькі
Цалейшымі будуць грошы...

Усё у руху, не толькі мы,
Такі ўжо наш век імклівы.
Даўно не было ядронай зімы —
Мяняецца, братка, клімат.

Снегу, як кот наплакаў.
Нібы
Млын нябесны закрыты.
Хопіць і сёлета людзям сяўбы,
У плешынах зноўку жыта.

Ты быў у Сібіры.
А я — тут.
Браты, а лёс у нас розны.
Точыць сэрца мае гэты кут,
Гэты абшар марозны.

Прыеду.
Каго прытуліць, абняць?
З кораня я — апошні.
Мая вялікая радня,
Як скошаная пожня.

Ёсць у кожнага з вайны
Свая пякучая болька.
А ў мяне засталіся ўспаміны адны,
Болька мая — найбольшая.

Дасюль яшчэ ўвушшу галасы,
Жудасна рэха рагоча.
З карэннем ірвуць людзей і лясы
Блакадныя дні і ночы.

Смерць да сябе ўсё жывое грабе,
Жорны крыжастыя мелюць.
Косткі на рукаве, па ілбе,
Чорны мундзір на смерці.

На печ я ўзбіўся і не злез,
На вачах маіх — маму, тату...
Цётка Маня пасля цішком у хату,
Мяне за руку — і ў лес.

Палец ціснуў самлелы курок,
Людзі целамі рэчкі гацілі.
Што за страшны крывавы аброк
У маі мы лесу плацілі?

Не зніmaліся тыдзень з нагі,
Прасмярдзелі
          фашысцкія боты
          ад поту...
А яны, як кнігаўкі,— кугі, кугі...
Дзяцей грудных
          з купін спіхваюць боты
На балотнай вадзе — кругі...

Во, паглянь, якая піла!
Кажа,— ад гарэлкі слёзы.
Каб ты, жанчынка, век так піла,
Як я — нецвярозы...

Вазьмі былое, з душы адбяры...
Што ты пляцеш, маладзіца?
У Полацку... Што?
          Гавары!
— Цётка Маня...
          памірае ў бальніцы.

Аўтобус мчыць. Маўчаць браты.
І цішыня маўчыць сляпая.
Як кроў праз белыя бінты,
Маленства згадкі праступаюць.

**На волю**

А лес не спіць.
          Не спяць азёры.
Плюскочуць хваляй ля камля.

Ноч чорная, як дымны порах,
Чыркні — уздыбіцца зямля.

Ніхто не спіць.
І толькі дзецям
Сны паглядзець дазволіў лес.
Не страшны золкі дождж і вецер
У зацішку паміж калёс.

Расце людское хваляванне,
Як рошчына расце ў дзяжы.
І застаецца спадзяванне —
Мы не загінем, будзем жыць...

За корань вузлаваты міна
Учэпіцца гнілым клыком,—
І падае наўстырч лясіна,
Як пальцам, дол шкрабе суком.

Ардою пацуковай лезуць
Цераз завалы чужакі.
Каторы дзень вісяць над лесам
Іх самалёты-павукі.
І ў гэтай цемені трывожнай,
Што тоіць полымя надзей,

Ідуць камбрыгі асцярожна,
Глядзяць на стомленых людзей.

Яны даўно згарнулі карты,
Атрадам дадзены загад,
Адзін ён толькі зараз варты:
— Наперад! Ні на крок назад!

І партызан — семнаццаць тысяч
Па цесным зрытым «пятачку»
Апошняй клятвай пакляліся
Прарвацца з боем за раку.

Пад клятвай кулі зробяць росчырк.
У рукі ўзяты недарма

На волю самы лепшы пропуск —
Гранаты, сябра-аўтамат...

Схаваны вочы казыркамі,
На твары набягае цень.
Яны сягоння у адказе
За ўсіх — старых,
жанчын,
дзяцей.

Іх першы бой...
Другі...
«Жалезка»...
Як толькі слова празвініць,
Нацягваецца, нібы леска,
У памяці падзеяў ніць.

Ратунак зараз — не ў закутках.
Прарыў...
Маўчанне да пары.
Ля вуснаў тлеюць самакруткі,
Нібы бікфордавы шнуры...

І помста ўспыхнула над светам,
І расхінулася імгла.
На штурм чырвоная ракета
Атрад ударны павяла.

Зямля, як пекла, пад нагамі,
І вочы гневам апякло —
Наперадзе гарць кастрамі
Паперня, Новае Сяло.

Усё, чым поўніцца істота,—
Нянавісць,
боль нясцерпных страт —
Свінцом ліецца з кулямётаў,
Грыміць у выбухах гранат.

Хто спыніць іх,
хто іх стрымае,

Хоць рукапашны бой — сляпы.
Штых з ворага душу вымае,
Прыклады трушчаць чарапы

Упаў падкошаны па травы,
Хрыпіць камбрыг:
«Сынкі... Смялей..
Цячэ нястрымна мсціўцаў лава
Усё шырэй, усё далей.

І ў той прарыў, пасля удару,
Імчыць марудлівы абоз,
Лясныя поўнячы абшары
Бязладным ляскатам калёс.

Пастронкі рвуць шалёна коні,
Ляцяць пад ногі хатулі...
Такой адчайнае пагоні
Не будзе болей па зямлі.

Пасля два месяцы жанчыны
Палеглых будуць тут знасіць.
І слёз змялеюць ручаіны,
Каб кожнага абгаласіць.

Хоць і паблізу, каля дома,
А не ў чужой зямлі ляжаць,
Дзе пахаваны — невядома...
Ніхто не зможа адказаць.

У лесе тын і сёння ўпотай,
Ужо да рослым і людзьмі,
Заплачуць і ўпадуць сіроты
На мох збалелымі грудзьмі.

Няма ні бацькі, ні матулі,
Нямая ціш у вушы б'е...
І толькі шэрая зязюля
Ім зрэдку голас падае.

...А там хлапчук людзей шукае,

Ды свет пусты, бы ўвесну склеп...
І вось малога прытуляе
Разведчык, што ў баі аслеп.

Хадой няпэўнай праз балота
З прыціхлым дзіцём на руках
Ідзе, ідзе ёй на грымоты,
За горла ўзяўшы ліпкі жах.

Яго знямога ўжо хістае,
І рукі сталі, нібы лёд.
А партызан малому бае,
Сціраючы крывавы пот:

— Дзе была ты, мышка?
— На таку.
— Што рабіла?
— Малаціла асаку.
— Што атрымала?
— Кусок сала.
— Дзе яго дзела?
— Кошка з'ела...

Нясе жыццё ў наш дзень здалёку
Разведчык, хоць і страціў зрок...
І ў тых няпэўных, хісткіх кроках
Быў чуцен Перамогі крок.

### На мяжы з Заходнім Берлінам

Ярка бліскае Шпрынгера экстра-рэклама
Зноў хлусню бессаромна выводзіць неон.
Я ж цябе ўспамінаю, пакутніца-мама,
І хачу, каб у хату прыйшоў
мірны сон.
Ля паводкі агнёў
і трывожна,
і душна,
Аб яе апякаюць аблокі крыло.
А здаецца, згараюць бязвінныя душы
У кастрах звар'яцелых

абразлівых слоў.

У касцюмах шыкоўных,
не ў касках,
пачвары,
Не ў чарніла, а ў слёзы макнуўшы пяро,
Строчаць пульхныя,
як пірагі,
мемуары
У цяпле камфартабельных дотаў-муроў.

Я гляджу,
і крывёй захлынаецца сэрца —
Бразгат зброі дасюль у Еўропе не сціх...
А над вёскай у нас ясны месяц смяецца...
Мама зноў сніць вайну,
пабрацімаў сваіх.

**У сяброў**

Над горадам вышка, як шпага,
Прабіла аблокаў клубы.
На чэрап зацвілы рэйхстага
Садзяцца, як снег, галубы...

Здаецца, было гэта ўчора,
І сэрца прыціхла ў грудзях —
Ушацкі разводны Ягораў
Узнімае над купалам сцяг...

Па дымных шляхах Перамогі
Пралёг мой турысцкі маршрут.
Але адчування трывогі
Няма.
Нібы дома, я тут.

З усмешкай даверлівай, шчыра
Берлін сваё сэрца адкрыў.
Ён працай людзей вольных вырас,
Якія ішлі на прарыў.

Прарыў праз вар'яцтва і зверствы,
Прарыў праз нацысцкі дурман.
У заўтра нязломная вера
Травінай прабіла дзірван.

Хай той, хто цураецца роду,
Забудзе пра слёзы і кроў.
А мы не пустое пароды —
Унукі,
сыны змагароў.

Глыбокі наш крэўнасці корань
Не вырвуць віхуры з зямлі...
За сонцам спяшаецца скоры
Да цёплай вясновай раллі.

У край партызанскай адвагі
Мне трэба паспець да сяўбы...
На чэрап зацвілы рэйхстага
Садзяцца, як снег, галубы.

### Замест эпілога

З дачкою туды, дзе героі
Апошні рубеж занялі,
Прыйшлі...
Тут жыве пад гарою
Нядрэмная памяць зямлі.

Зялёны калышацца бераг,
Алёнка плыве па траве.
Вяночак трымае аберуч
На русай сваёй галаве.

Яна то звініць, як сініца,
То кветкам ківае здаля,
І коціцца следам на нітцы
Паветраны шар, як зямля.

За дзень гэты, добры, спакойны,
За смех твой шчаслівы, дзіця,

За тое, каб згінулі войны —
Аддаць не шкада мне жыцця!

# З кнігі

# «ПАКУЛЬ ЖЫВЕ МАЯ БЯРОЗА»

# 1981

## ПАКУЛЬ ЖЫВЕ МАЯ БЯРОЗА

Пакуль жыве мая бяроза
Бунтуе полымя ў крыві
І не збіваюцца на прозу
Святой любові салаўі.

Наскрозь
          жыцця густую крону
Пранізвае іх звонкі свіст.
На дол спалохана-здзіўлёна
Ляціць яшчэ зялёны ліст.

Я сам — мурожная палянка,
Дзе,
          чыста ўмыўшыся расой,
Стаіць бяляначка-славянка
З шаўковай русаю касой.

Душа, асветленая промнем
Яе глыбіннае красы,
Не стоміцца заўсёдна помніць,
Адкуль пайшоў

          і чый я сын.
На пуцявіне чалавечай
Зямны
          прымаю ўдзячна лёс.
Не вечны мы
          пад Шляхам Млечным,
Ды вечнае
          святло бяроз.

Яно ліецца апантана
Над скрыжаваннямі трывог,
Каб і наступнік наш нязнаны
Яго ў сабе навек збярог.

Жыві, бяроза!..
          Светлым болем,

Шчымлівай радасцю звіні...
На гэтым свеце
          нас з табою
Адны
          трымаюць карані.

## РЭЧКА ДЗІВА

Зямля, што нарадзіла,
Заўжды шчадрэй на сонца...
Паруе рэчка Дзіва,
Як малако ў даёнцы.

Што дзіўнага, здаецца,
У ёй, змялелай, вузкай?..
З маім злілося сэрцам
Яе жывое вусце.

І мне так пільна трэба
Пасля шляхоў.далёкіх
Над вірам стаць,
          што ў неба
Глядзіць глыбокім вокам...

Зялёны дзень вяслуё,
Сплываюць аблачыны...

Я не ваду цалую,
А светлы твар Айчыны.

Гары нязгаснай свечкай,
Бяроза каля дому...
Маёй любові рэчку
Не перайсці нікому.

## СПЯВАЕ ЖЫТА

*Максіму Танку*

І сонцу,
і ветру адкрыта
Палёў беларускіх душа.
Спявае высокае жыта,
Калыша знаёмы бальшак.

Падхоплены песеннай плынню,
Ля ўзмежка,
нібы матылёк,
На тонкай дрыготкай сцяблiне
Плыве трапяткі васілёк.

Б'е спёкай,
Як ласкай, у грудзі.
Гарну да шчакі каласы,
І чуюцца ў сонечным гудзе
Мне продкаў жывых галасы:

«Нідзе ты не знойдзеш спакою,
Усё без яе — тло і дым,
І толькі з бацькоўскай зямлёю
Ты будзеш заўжды маладым».

Той песняй,
кожнага новай,
Як хваляй,
мяне ахіне...
Айчыны жытнёвае слова,
Звініць у густой збажыне.

## БАЦЬКАЎШЧЫНА

Мой любы край,
не дакарай,
Што славіць зноў бяруся...
Калі і ёсць на свеце рай,
Дык ён —

на Беларусі!

Прайдзі па ёй
і ўсё збяры,
Пачуй душой адкрытай...
Тут голас вечнасці
бары
Нясуць зямлі з блакіту.

Тут чорныя вайны сляды
Рукой рабочай сцёрты,
Каб маладыя гарады
Стаялі вольна, цвёрда.

Тут загучаў на новы лад
Паэта заклік вешчы —
Гушкае космас арлянят,
Купалы чуе вершы...

Відаць,
няма бальчэй пакут,
Чым шкадаваць да скону,
Што не вярнуцца ў матчын кут,
Хоць позна,
ды з паклонам...

І я павандраваць люблю,
Каб потым
днём спаткання
Абняць наўсцяж
сваю зямлю,
Як крыламі,
рукамі.

Жабрацкі лёс
мяне міне...
Задыханы ад шляху,
Засну я
ў роднай баразне
Непераможным птахам...

## ЗЯЛЁНАЯ ПАРА

Пупышкі адамкнула зноў
Вясна,
нібы замкі,—
На волю ірвануліся
Пяшчотныя лісткі.

Падмігваюць гарэзнікі
Абуджанай траве,
Над белізной бярэзніку
Зялёны дым плыве.

Чакае сіла выхаду
З пластоў кары зямной —
Вось поле смачна дыхае
Спацелай баразной.

Птушыны люд не выракся
Бацькоўскае раллі —
Гармідар шчыры выраю
Званчэе у галлі.

І воблака над гонямі
Ляціць,
як перына́...
Душа праменнем сонечным
Прасвечана да дна.

## ВЯЗЫНКА

Каб словам акрыяць,
душой параіцца
З высокай праўдай,
праз гады жывой,
Прыходзім мы сюды
нясмелай раніцай
І сцішанай вячэрняю парой.
Сюды,
дзе развінае крылы бусел

І ахінае імі
свой куток,
Дзе молада
пад сэрцам Беларусі
Дум песняра
струменіцца выток.

Яго імя
не вырваць з нашых сэрцаў
Ні часу,
ні нягодам,
ні бядзе.
Паэта слова
вечна на паверцы,
Яно наперад
наш народ вядзе.

Вітанне сонцу,
што між хмар віруе,
Гаям,
траве;
падлётку-жаўруку...
Зямля Купалы,
я цябе цалую,
Як матчыну шурпатую руку.

## ПОКЛІЧ ВЯСНЫ

Вясна ў палях
здымае жвава
З плячэй снягоў цяжкі кажух.
Маю сасновую дзяржаву
Запаланіў жывіцы дух.

Травы бліскучыя іголкі
Дзірван прашылі навылёт.
Прачнуліся шчырухі-пчолкі,
Лятуць сабе па вербны мёд.

З усмешкай

сейбіт на далоні
Узважыў зерня мудры плён.
Лямех засумаваў
па гонях,
Па цеплыні лагодных дзён.

Вясна,
вясна на Беларусі.
Так б'е
у сэрцы
кроў рыўком,
Што сам,
здаецца,
узнімуся
У неба раннім жаўруком,
Каб абляцець абсяг знаёмы,
А як прытоміцца крыло,
На дол упасці каля дому,
Які чаромхай замяло.

## ДЗЕСЯЦІКЛАСНІЦЫ

Пад кронамі купчастымі
Ляжыць ружовы снег...
Сцяжынкай пакручастаю
Прабег раптоўна смех.

Ідуць дзесяцікласніцы
З апошняга званка,
Лагодзіць твары ласкаю
Духмянасць свежака.

Мяцеліцы пялёсткавай
Шчымлівы халадок
Прымае ў сэрца з лёгкасцю
Семнаццаты гадок.

Ён верыць —
хутка спраўдзіцца
Надзей усіх прагноз

З нязначнаю папраўкаю
На час і ўласны лёс.

Іх хвалю запаветную
Страмчэй,
жыццё,
　　　　　ўзнімай!
Шуміць зялёным: ветразем
Над светам добры май.

На незнаёмым беразе
Прыстануць іх чаўны...

Зямля ў сукенцы беленькай
Бяжыць на выпускны.

## СЛУХАЮ

*Памяці Р. Р. Шырмы*

Еднасці лепшай не знойдзецца, мусіць,—
Слова з мелодыяй, як спарышы.
Слухаю песні маёй Беларусі —
Скарб неўміручай народнай душы.

Рэха стагоддзяў
　　　　　у сэрцы ўваскрэсне
І развярэдзіць зямную тугу...
Толькі падобны
　　　　　на вечныя песні
Верш напісаць я ніяк не змагу.

## САЛАЎІНАЯ СТАЛІЦА

*Бацьку*

　　　　　Прарэджаныя шчыльным змрокам
У хатах гасяцца агні...
І толькі зоркі дзесь далёка
Міргаюць сонна ў вышыні.

Не зважыўшы на золь
і стому,
Дзе нацянькі,
а дзе бачком,
Аўтобус коціцца знаёмым
Вясковым
дрогкім бальшаком.

Так і жыцця калдобы трэслі,
І я ў будзённым тлуме спраў,
Як мокнуць пад дажджамі стрэхі,
Не надта часта ўспамінаў.

Цяпер гляджу,
маўчу,
не спіцца,
Хоць у аўтобусе спакой...
Маленства роснага сталіца
Махнула белаю рукой.

І ў гэту хвілю,
як ляшчына,
Што грэе ліст на бальшаку,
Адчуў і я,
мая Айчына,
Сваёй шчакой
тваю шчаку.

Усё бліжэй бярозка-вёска,
Якая ў кожнага — адна...
Там салаўіны цёхкат,
лёскат
Лунае ў лозах давідна.

Там вольны вецер,
ясны месяц
Над возерам,
дзе спяць чаўны...
Прыходзіць час.
Мы разумеем —

Без іх
няма ў душы вясны...

Я з тропу не павінен збіцца,
Іду з любоўю ў белы свет,
Бо салаўіная сталіца
Рукою мне махае ўслед.

## У РОДНАЙ ХАЦЕ

Здарожаны, найперш спяшаю
За клямку узяцца —
насцеж дзверы.
Спакой знянацку аглушае,
Ён пахне хлебам і аерам.

На сэрцы і цяпло,
і вусціш,
Але мне гэтага замала —
І слова радаснае:
«Ма-ма!» —
Злятае ластаўкаю з вуснаў.

## МАЯ ВЁСКА

Што ні кажы,
а толькі зрэдку
Трапляю я цяпер сюды,
Дзе ёсць таго жывыя сведкі,
Як хутка растаюць гады,

Дзе цеплынёю апякае
Далонь крутая земляка,
Дзе неба роднасцю світае
Пад пералівы жаўрука.

Я не шукаю апраўдання,
Нічым не апраўдаць сябе,

Што ад паспешлівых спатканняў
Хвіліны
          век скубе,
          скубе...

Ну, што ж.
          І сёння ненадоўга,
А толькі сэрцам акрыяць.
І ўсё-ткі добра,
          ах, як добра
Сярод сваіх палёў стаяць.

І вочы,
          і душа адкрыты,
Прадзьмуты суму скразняком...
З дзіцячай вераю забытай
Зязюлю слухаю цішком.

* * *

Лясоў зялёных астравы
І рэк блакітныя галіны,
Людзей вучылі вечна вы
Любові шчырай да Айчыны.

Любові той,
          што як глыток
Вады крынічнай у спякоту,
З якою наш апошні крок
Перад кідком на пашчу дота.

І я ў расстанні недарма
Пабыў,
          бо змог пераканацца,
Што шчасця большага няма,
Чым вас любіць,
          да вас вяртацца.

* * *

Ляжыць зямля

ў спакоі дужым —
Сваёй не ведае красы...
Бульбоўніку счарнелы кужаль
Змакрэў да ніткі ад расы.

Цяжкіх пладоў
вячэрні одум
Плыве нябачным туманом,
Прывабны дух
ляных гародаў
Сагрэт апошнім прамянём.

Зацішна тут —
у звыклых сценах
Пад крылцам матчынай страхі,
Нібы ў жыцці
ніякай змены,
Нібыта сон,—
гады,
шляхі.

Ступаю босы па разорах,
Знаёмы дол мякчэй,
чым пух.
Святло дабра
нябёсы зорацъ —
І роднасці замкнуўся круг.

* * *

Люблю з маленства
пах работы,
Калі гарыць усё ў руках,—
Пах бервяна,
раллі,
тавоту,
І каласоў духмяны пах.

Але тады я І не думаў,
Што сэнс вялікі
ў гэтым ёсць.

Хацеў хутчэй зрабіцца дужым,
Сказаць,
          што ў свеце я —
          не госць.

Цяпер стаю пад родным небам,
Дзе радасна буркоча гром...
Зямля запахла
          цёплым хлебам,
Бярвенні—
          мірам і жыццём.

## КАМБАЙНЕР

З лесвічкі на дол саскочыў спрытна,
Дужы,
          бы адчэсаны з камля,
І над хлопцам у нязнаным рытме
Палубай хістаецца зямля.

Потам перамоклая кашуля
Скінута з плячэй,
нібы цяжар.
Каласы
          да рук ласкава туляцца,
Вецер
          халадком лагодзіць твар.

Задаволены гарачай зменай,
Крочыць нетаропка ён у двор...
Спіцца соладка
          на свежым сене,
Неба сыпле
          зерне спелых зор.

Заўтра зноў не будзе у адгуле,
Рэха ад матора загудзе...
Мые маці сынаву кашулю
У нагрэтай сонейкам вадзе.

* * *

Не, не паверу я нікому,
Што век планеты дагарыць.
Няма канца
　　　жыццю зямному,
Ягонай сілы не скарыць.

Мяне вучыла гэтай веры
Штодня яшчэ з маленства дзён
Любоў,
　　　якой ніхто не змерыць,
Да сонца,
　　　зерня,
　　　баразён.
Зямля прапахла кменам,
　　　кропам,
Зямля
　　　ў клубку касмічных трас.
Няма на ёй
　　　апошняй кропкі,
Што спыніць чалавечы час.

* * *

Правёў наўсцяж пушыстыя барозны
Па цаліку нябёсаў самалёт —
Страсаюць іней спуджана бярозы,
Звініць ад рэха
　　　на рачулцы лёд.

Трывогі жылка
　　　тахкнула у скроні,
Ды ёй не падуладны я ані.
Трымаю асцярожна на далоні
Асколкі сіняй
　　　крохкай цішыні.
І дзень не затаіўся,
　　　а ўсміхнуўся
І промнем казытнуў мяне крадком,
Нібыта да шчакі ён дакрануўся
Матуляю сатканым ручніком.

* * *

Ад чалавека да краскі —
Прагнуць усе на зямлі
Шчырай спагады і ласкі...
Кім бы без іх мы былі?

Душы,
кранутыя цвіллю,
Людзі,
нібыта краты...
Страшна ўявіць хоць на хвілю
Свет,
дзе няма дабраты.

Пахне ралля
цёплым хлебам,
Спеліць надзеі наш час...
Сонца і родная глеба —
Шчодрасці прыклад для нас!

**НАШ ВЕК**

*Пімену Панчанку*

Наш век сур'ёзны і актыўны,
Не любіць ён пустых забаў.
Ды ўсё ж між гулу рэактыўных
Пачую раптам
звон цымбал.

Хоць і сіпяць вужакай шыны,
Гудзе наўсцяж асфальт шашы,—
Ласкава спеюць успаміны
У сэрцы,
нібы спарышы.

То рык зубрынай Белавежы
Світальным халадком дыхне,
То поле,
што не мае межаў,
У вочы васільком зірне.

Запаланяе родным,
　　　　блізкім
Душу,
　　　　пакрытую лядком.
І песня, чутая з калыскі,
З грудзей памкнецца ў свет цішком.

І часу я свайму паверу,
Даводзіць буду
　　　　зноў і зноў,
Што ёсць у ім
　　　　жаданы неруш
Пачуццяў шчырых,
　　　　добрых слоў.

## УДЗЯЧНАСЦЬ

Да скону ўдзячны светлай долі,
Гадам,
　　　　што ўпрочкі адышлі,—
Не быў я пасынкам ніколі
Для тых людзей,
　　　　для той зямлі,

Дзе годнасць
　　　　вымяраюць працай,
Што зліта з клопатам людскім,
Дзе гонар чалавекам звацца
Апраўдваюць жыццём усім,

Дзе матчын спеў не замірае,
Не гасне знічкаю ў імгле,
Дзе чорны аржаны акраец
Мне сонцам
　　　　свеціць на стале...

У новы дзень
　　　　шукаю броду,
І ў час нялёгкіх пераправ

Паклон мой — спадчыне народа,
Дзе сплаў трывалы
слоў і спраў.

* * *

Апёк маладыя аблокі
Ядра разняволены смерч.
Устала
прывідам далёкім,
Як джын,
над атоламі смерць.

Паваленых пальмаў шкілеты
Засыпаны мёртвым пяском.
Тут зніклі надзеі прыкметы,
Жыццю не звінець раўчуком.

А люд на зямлі,
як замову,
Насуперак страшнай бядзе
У вуллях старэнькіх
і новых
Быцця нітку ўвішна прадзе.

Ды хочаш
не хочаш,
а сёння
Угледзіш
праз вею хвілін
Ссівелыя пасмы на скронях
Стагоддзя, якому ты — сын.

## ЗВОН ЧАСУ

Бег часу не адчуць у мітусні,
У зладжанай зададзенасці быту...
А ты струну імгнення закрані,
Нібы смычком,
сваёй душой адкрытай

І ты пачуеш не пяшчотны спеў,
А часу звон,
трывогу запытання:
«Ну, чалавек, пажыў,
а ці паспееў
Зрабіць што-небудзь?
Хутка ж развітанне!»

Гудзе абсяг —
і неба, і зямля...
Жыццё на стрэлках ходзікаў распята
І тое,
што адклаў ты на пасля,
Звон часу
не пакіне без адплаты.

Ты кажаш,
што здзіўлю вас адкрыццём,
Пажыць яшчэ мне дайце,
як звычайна.
А над Сусветам,
над тваім быццём
Звон часу б'е
няўмольна і адчайна.

* * *

Ён, здаецца, побач, запаветны
І жаданы сэрцу госць —
радок...
А Пегас паверне да кювета —
Аж за грыву схопіцца яздок.

І шукай тады цярпліва словы,
Зноў да мэты —
не адна вярста...
І маю шчаслівую падкову
Конь яшчэ не скінуў з капыта.

## ПРЫЛЯЦІ, СІНІЦА ЎДАЧЫ

Неба цэлы тыдзень плача,
Мне таксама не спяваць.
Прыляці, сініца ўдачы,
Сум на смак пакаштаваць.

Дзень — высокая званіца,
Верху ў хмарах не відаць.
Дзе ж ты, птушка-чараўніца,
Не магу я адгадаць.

Запрашаю не на дачу,
Не скакаць, не балявать...
Прыляці, сініца ўдачы,
Сум на смак пакаштаваць.

* * *

Суцішацца дрымотаю абшары,
І кажаны скіруюцца ў палёт...
Як на зямлю спадуць начныя чары,—
Няспешна робіць ён лясоў абход.

Звіняць крыштальна
соснаў стромкіх кроны,
Яго хаду зямля пачула ўся...
Сярэбранаю свеціцца каронай
Бліскучы месяц на рагах лася.

* * *

Я цяпер адкрываю нанова,
Што злілася ў паняцці
мой кут —
Радасць існасці
з пошукам слова,
Прагай новых
салодкіх пакут.

А яно раптам

цінькне сініцай,
І адтае душа,
як грудок.
Незмялелая сэрца крыніца
Гоніць смела
на волю радок.

Хай радок
узаўецца над полем
Жауруком,
як не стане мяне...
Бо з зямлёй не расстацца
ніколі:
І наяве,
і ў тым вечным сне...

* * *

А за вясной трывожнаю не ўгнацца,
Як не злавіць струмені ручая...
Гляджу —
між майскіх сонечных акацый
Мільгае постаць лёгкая твая.

Наіўна думаў —
перайму хоць летам,
Спаткацца будзе час нам —
дзень вялік.
А першы ліст
павіс над белым светам
І, як твая касынка,
дзесьці знік.
Ну, пачакай...
Яшчэ ў запасе восень.
Бо я ж цярплівы,
ведаеш сама.
Ды ўсё ж сябе суцешыць не ўдалося,
Гудзе ля вуха веямі зіма.

* * *

Дажджы ўжо надакучылі,
Рыпіце, палазы!
Як чарачка пякучая,
Такія маразы.

Бярозкі ціха журацца,
Смяleюць капыты.
Ад прадчування жмурацца
Вясёлыя сваты.

Завеяны, замене ны
І поле, і рака...
Твая каса расплецена
Для любага дружка.

* * *

І вывела нас сцежка лугавая
На той абрыў,
        адкрыты ўсім вятрам,
Дзе беражанкі-ластаўкі ўсплываюць
З нор земляных
        у неба сіні храм.

Салодка ім лунаць над вечным светам
У пругкай недасяжнай вышыні,
Глядзець на дол,
        дзе радасна, прыветна
Мігаюць кветак сонечных агні.

І ты ўгару імкнешся ў захапленні,
І развінаеш рукі — два крылы...
І адчуваю я ў нямым здзіўленні,
Што для цябе зямны абсяг малы.

І боязна становіцца, дзяўчынка,
Аж сэрца халанее пакрысе,
А што, калі цябе,
        як аблачынку,
Залётны вецер раптам панясе?

## ЧАРОМХАВЫЯ ВЁСНЫ

Помніцца час развітальны —
Пошчак салоўка куе,
Пахнуць чаромхай світальнай
Цёплыя вусны твае.

Неба высокае родніць
З юнай зямлёй гэты пах —
Роснай галінкай чаромхі
Свеціцца там Млечны Шлях.

Ўслед за пялёсткавай веяй
Вёснаў трывожных сплыло!
Вось і цяпер маладзее
Квеценню белай сяло.

Сцежкай іду асцярожна,
Згадка душу саграе...
Пахнуць світальнай чаромхай
Цёплыя вусны твае.

## МАЙ

Сэрцам адчуваю —
Ах, як сонцу люб
Маладога гаю
Кучаравы чуб.

Ліст цалуе кожны,
Лашчыць прамянём.
Апячыся можна
Зеляным агнём.

Хмельны дух маёвы
Захлынуў і нас,
Абуджае словы,
А для слоў — не час.

Шчасця навальніца

Поўніць небакрай,
Спелаю чарніцай
Коціцца на гай...

Між вясной і летам
Ёсць такія дні,
Што маўчанне лепей
Слоўнай мітусні.

* * *

Першая маршчынка
След свой правяла...
Дзе ж мая дзяўчынка,
Што, як мак, цвіла?

Той, хто поплеч крочыць,
Зблізу не відзён.
Коціцца клубочак
Мітуслівых дзён.

За ягонай ніткай
Толькі паспявай,
Ды не падай ніцма:
Калі што — трывай!

Але ўсё ж нікому
Не мінуць пары,
Як паклічуць з дому
Звонкія бары.

Між бярозак срэбных
Зразумець і нам —
Даверацць патрэбна
Кожным новым дням.

Вечнай хуткай плыні,
Што завуць жыццём,
Страху не пакінем
Перад небыццём.

Адцвітае верас —
Ява ў ціхім сне.
А лісцінцы веры
Доўга зелянець.

## КЛАДКА
**(*Жарт*)**

Завершыць хутка лета
Свайго быцця стажок.
Вясёлку цёплых кветак
Рассыпаў беражок.

Ляшчына сцеражэцца,
Хавае спарышы.
Над плынню ціхай —
жэрдкі,
Смялей ідзі ў цішы!

Ды толькі я ступіла
На кладачку нагой,
Як пад вярбой пахілай
Убачыла яго.

Сустрэча мне такая
Зусім не ў галаве.
А ён здалёк гукае,
Спяшае па траве:

— Дай, цябе я, маладу,
На той бок перавяду...

Мне б адказаць адразу,
Што ён чакаў дарма,
Ды ахінула радасць —
І цвёрдых слоў няма.

А кладка гнецца, гнецца
Да самае вады.
А хлопец мне смяецца —

Вясёлы, малады.

Так заглядае ў вочы,
Што боязна зваліцца.
І хочаш ці не хочаш,
А мусіш прытуліцца.

Няма ніякай радачкі
Ад гэтакай бяды...
Ой, кладка,
          мая кладачка,
Вядзеш мяне куды?

## ВЯСЕЛЛЕ У МІКРАРАЁНЕ

Віруе снег,
          вясёлы, малады,
Яму і тут,
між гмахамі,
          не цесна.
Сірэны кліч.
          А можа, кліч бяды?
Гляджу...
          А там жаніх ідзе з нявестай.
Стаяць таксі,
          на ўсе лады гудуць,
Бо як інакш цяпер пабачаць людзі,
Што маладым хлеб-соль
          бацькі нясуць,
Што радасць веснавая ў доме будзе.
Сняжок на вуснах цёплых растае,
Смяюцца вочы любай без супынку.
Хлапец на рукі дужыя свае
Дзяўчыну падхапіў,
          як аблачынку.
Гром воплескаў, і жартаў не суняць:
— З такім не прападзе,
          жаніх — не зломак!
Увесь пад'езд віншуе, як радня.
На ліфце не паехалі, вядома.

Сусед мой кажа:
— Чарачку не грэх
І нам за іх прыняць,
нібы прычасце...
Дарожку сцеле
першы
чысты снег...
Што зычыць маладым?
Дай бог, каб шчасце...

* * *

Малыя ля бабкі балбочуць,
Як цецеручкі на таку.
На лаўцы сядзяць крывабокай
Што боб у зялёным струку.

Бабуліны даўнія казкі
На свой перайначваюць лад.
Цяплом патыхае і ласкай
З лагодных вясковых прысад.

Старая ад слоў іхніх дрэмле...
А сонца глядзіць з-пад рукІ,
Як модна трымаюцца дрэва,
Звіняць трапяткія лісткі.

* * *

Сонейка ў мяне ёсць
З імем светлым,
звонкім —
Сэрца зарунее,
Як скажу: «Алёнка!»

Тое, што ў аблоках,
Часта мружыць вочы...
А маё, малое,
Грэе ўдзень і ўночы.

## ГРЫБАСЕЙ

Яшчэ ляцела знічка,
А ўжо за ёй плылі
Сярэбраныя ніткі
Ад неба да зямлі.

Яны звінелі шчыра,
І, каб паслухаць іх,
Змоўк жураўліны вырай,
Увесь абсяг прыціх.

Спеў ліўся адмысловы
Пад крыламі зары,
Будзіў гаі, дубровы
І думныя бары.

А потым танец кропляў
Віхурыўся наўкол.
Як сырадоем цёплым,
Напіўся імі дол.

Пад мокры пошум лісця
Не спі,
            вастры свой нож,
Бо шчодрасцю праліўся
Доўгачаканы дождж.

Не ласы да ажыны,
Прыспеш разважны крок,
Каб потым са сцяжыны
Нырнуць хутчэй убок.

Ці шчасцю не паверыш,
Не схіліш галавы,
Калі крамяны неруш
Глядзіць з імхоў,
            з травы.
На сонечнай палянцы
Паклонішся ваўнянцы.

Паабаб'еш каленькі
Ля пня, дзе спяць апенькі.

А потым знімеш шапку
Прад краснюком, абабкам.

І раптам сам ён, палкавік,
Акраса лесу — баравік!

Не знойдзеш лепшай змогі,
Чым гэты рэй грыбны.
Гудуць салодка ногі,
Бадзёрыць дух лясны.

І ў хаце будзе радасць:
— Паказвай, што прынёс?
І ты з грыбамі разам
На шчодрасць сам падрос.

### МАЛЮЮЦЬ ДЗЕЦІ

Асфальт ад промняў сонечных рабы,
На ім стаю —
знаёмы цуд прыкмеціў:
Крамяныя,
як першыя грыбы,
Шчыруюць з крэйдай каляровай дзеці.

Дзе ёсць яшчэ такія мастакі,
І хто да іх вышынь з дарослых вырас?
Імкнецца ў свет шырокі з-пад рукі
Фантазіі бязмежнай
смелы вырай.

Няма пытання:
«Быць або не быць?»
І лёгка дыхаецца ўсёй планеце,
Пакуль блакіт калышуць галубы,
Малююць сонца на асфальце дзеці.

## СЛЯДЫ

След шырокай і цвёрдай хады,
Паабапал —
    слядочкі,
    слядочкі...
Гэта я_
    іду праз гады,
Па рамонку ў руках —
    мае дочкі.

Травы леглі пад ногі ім,
У блакіце —
    бусліны лёскат.
Вецер лашчыць дыханнем сваім
Валасоў трапяткія пялёсткі.

Шчодры свет,
    харраством закружыў,
Абнадзеіўшы шчасцем,
    і згодай.
Чым,
    жыццё,
    я ў цябе заслужыў
Нечаканую ўзнагароду?..

І тады,
    калі лёс,прывядзе
Да апошняй трывожнай кручы,
Хлыне ў вочы святлом
    іхні дзень,
Я адчую цяпло
    кволых ручак.
Бачу —
    там,
    дзе знікаюць гады,
Што без жалю спяшаліся ўпрочкі,
Прападаюць мае сляды...
Застаюцца
    Алёны слядочкі.
Зарастаюць мае сляды...

Застаюцца
Святланы слядочкі.

* * *

Казалі — шпакоў сёння чулі,
Прыйшла так зарання вясна.
Хутчэй шый сукенкі, бабуля,—
Унучка ў цябе не адна.

Марудныя цягнуцца ночкі,
Не так, як раней,
служыць зрок.
Ды вось зазвінелі званочкі —
Дзяўчаткі бягуць на урок.

Хай носяць уборы,
не зносяць,
Хай бачыць праз часу сцяну
Бабуля —
ласкавая восень —
Сваю маладую вясну!

**КАЛЫХАНКА ДАЧУШЦЫ**

Месяц выгнуўся,
як дужка
У паўнюткага вядра.
Сон усю зямлю загушкаў,
І Алёнцы спаць пара.

Спаць пара.
Стаміўся конік.
Салавей асалавеў.
Зоркі грэюцца спакойна
На ўраселай мураве.

Коўдрай рэчку-шчабятуху
Клапатліва ўкрыў туман.
Вецер лісця пошум слухаў —

Сам на дрэве задрамаў.

Годзе,
　　　　час кідаць забавы...
Лес да раніцы замоўк.
Не зашчоўкае зубамі —•
Спіць пад елкай шэры воўк.

Зайка сціснуўся клубочкам
І сапе сабе адно.
І ў хітрухі-ліскі вочкі
Смачна мружацца даўно.

Зачакалася падушка
З беласнежнага пяра...
Спі і ты,
　　　　мая дачушка...
Спаць пара...
　　　　Пара...
　　　　Пара...

* * *

Спатканне маё з белым светам
Не лічыць запасу дзён,
Але праз зімы і леты
І я стаў хвіліне жадзён.
Наводзіцца сувязь трывала,
Бліжэюць жыцця берагі,
Бо сэрца ў сабе паяднала
І радасць і боль —
　　　　два кругі:
Той смех,
　　　　што праносяць дзеці
Па першай зялёнай вярсце,
І сціплы прывялы букецік
На мармуровай пліце.

* * *

І з далёкіх,

і з блізкіх дарог
Лёгкі крок на матчын парог,
Хоць і вісне, як хмара,
знямога,
Цяжаляе хатуль
зім і лет...
А ў матулі адна дарога,
А ў матулі дарога —
трывога
За цябе,
за людзей,
за ўвесь свет.

* * *

У безагляднасці юначай
Наш розум прагне вышыні,
Ён верыць цвёрда,
што з удачы
Быцця сатканы
хвілі,
дні,
Што ключ знайсці да таямніцы,
Нібы памножыць два на два.
І нечым важным —
не драбніцай
Занята вечна галава.
А потым мы з жыццёвай стромы,
Дзе вецер лашчыць сівізну,
Як свет чароўны,
невядомы,
Убачым даўнюю вясну.
І сэрца ўспомніць кветку-слёзку,
Што зноў журбоціцца ў бары,
І з маладзенькаю бярозкай
Захочацца пагаварыць...
Прымусіць час,як ні хацелі б,
І нас з вяршынь сысці далоў,
Каб адчуваць душой і целам
Сваю зямлю без лішніх слоў.

## ДА ПЫТАННЯ
## ПРА АКАЛЯЮЧАЕ АСЯРОДДЗЕ

Акаляючага асяроддзя
Для мяне няма,
          не існуе.
ёсць лясы,
          палі — я з імі ў згодзе,
Ёсць Дзвіна,
          што ў бераг хваляй б'е.

Ёсць паветра, што бадзёрыць грудзі,
Ёсць расы сцюдзёнай ціхі звон...
Святам мне здаецца кожны будзень —
Не злічыць усіх шчаслівых дзён.

Не хаваю радасці здзіўлення...
Мой чытач, прашу — не вінаваць!
Дрэву,
          красцы ведаю найменне —
Як жа родных іх агулам браць?

З імі я і ў роздуме,
          і ў працы
Сувязі адвечнай не згублю...
Можа чалавекам той назвацца,
Хто шануе родную зямлю.

Асяроддзе ёсць машын і прэсаў...
Пра прыроду ж гэтак...
          Не грашы.
Нам,
          байцам тэхнічнага прагрэсу,
Не забыцца б на прагрэс душы.

* * *

Мне радасна згубіцца ў лесе,
Нырнуць у зманлівы гушчар,
Туманам сцежку занавесіць
І гэты міг прыняць,

як дар.
Мой родны лес
мяне прывецiў,
Ён не мяняецца анi —
У самым неспакойным свеце
Дзялянка спелай цiшынi.

Бясшумна падаюць хвiлiны,
Страсае лес
i шум i тлум...
Як i раней,
яго хваiны
Гайдаюць птушак вечных дум.

* * *

Свабодна i лёгка лiюцца ў душу
Мядовыя пахi лугоў i дубровы...
З маленства
пад сэрцам цябе я нашу,
Зямлi маёй сцiплай гаючае слова.

Не прагну нiякiх ласункаў,
шчадрот,
Выгод камунальнага раю...
Айчыны б паветра ўзахлёб,
на ўвесь рот,
I матчынай мовы акраец.

* * *

Зарыпiць
сiнiх зорак у небе жарства —
Гэта вечнасць iдзе Млечным Шляхам...
I хоць кружыцца ад вышынi галава,
Ды няма месца
суму i страху.

Нiбы матчыны рукi,
знаёмым цяплом
Па шчацэ гладзяць спелыя травы,

Ахінае вей-ветрык
        празрыстым крылом,
Шэпча родныя словы ласкава.

Трэба верыць сабе,
        слухаць сэрцам зямлю,
Спасцігаць дабраты таямніцы...
Лёс аб шчасці інакшым
        даўно не малю —
Тут яго зачарпну я з крыніцы.

Покуль век
        нітку часу
        маўкліва прадзе,
Абрываць не збіраецца ў скрусе,—
і смяецца,
        і плачацца так,
        як нідзе,
У далонях маёй Беларусі.

* * *

Наўзбоч асфальту ля кювета,
Дзе жвір пусты,
        сівы пясок,
Узняўся промнем ціха-светлым
Жытнёвы дробны каласок.

За ўзлескам пыльным,
        за ракою —
Палі,
        што вокам не абняць.
Звініць там дружнай талакою
Уся ягоная радня.

А тут
        з-пад шын шалёны вецер
Кулём злятае пад адхон.
Без спадзявання,
        што прыкмецяць,
Ён за паклонам б'е паклон.

Яму няўтульна і тужліва,
За зерне страшна:
быць ці не?
Ды ўсё ж глядзіць на свет шчаслівы,
Свой лес ніколі не кляпе.

Наўзбоч гарачага асфальту,
Дзе жвір пусты,
сівы пясок,
Пяе адзін,
але без фальшу,
Жыццю падзяку
каласок.

## ПАЭТЫ

Дзеці чорнай раллі і высокага неба,
Спадзяванняў, і веры людской кавалі...
Ёсць,
відаць,
у зямлі на паэтаў патрэба,
Бо ніхто іх не сеяў,
а шчодра ўзышлі...

* * *

Я не апошні і не першы
У лесе слоў шукаю сцежку...
Павер,
што кожны з гэтых вершаў
Мая сляза або усмешка.

Калі ж не зладзіцца размова,
Я здольны шчыра павініцца...
Запі тады
чарствое слова
Вадой з ушацкае крыніцы.

* * *

Пілавінне здзьмута золкім ветрам
Па асфальце
у недалёкі роў...
Больш няма каму ківаць прыветна,
Гушкаць на галінах снегіроў.

Больш няма каму чакаць залевы,
Чыстым лісцем весяліць душу...
Пад маім акном
стаяла дрэва...
Верш сягоння
я не ўскалышу...

**ГОСЦІ**
**(Жарт)**

Захацелася пісаць, хоць ты трэсні,
А тут чэрці гасцей мне прынеслі.
«Ах вы, госцейкі мае дарагія!» —
Гавару я так,
а сам воўкам выю.

Каб у іншы нейкі час —
было б свята,
А цяпер — хоць уцякай з роднай хаты..

Завіхаюся ля іх, поўню чаркі,
А душа мая сквірчыць, нібы скварка.
«Ах вы, госцейкі мае, піце, ешце!»
Сам жа думаю:
«Калі ж натрубяцца ўрэшце?!»

Вось бяседа адгула —
і за дзверы,
Сеў за стол,
ды не гляджу на паперу.
Расхацелася пісаць, хоць ты трэсні...
Ах, якія радкі госці знеслі!

* * *

Блакіт тэлевізійнага экрана,
Скупы радок газетнай паласы
Прыносяць зноў навіны...
Несціхана
Пакутай, болем ныюць галасы.

Не ведаю,
          куды ад іх падзецца,
Я ж чалавек —
          і не ўсё роўна мне,
Што галадаюць, паміраюць дзеці,
Хоць і ў чужой далёкай старане,

Што не змаўкае гул ні ўдзень, ні ўночы
І не мялее бежанцаў рака...
Вайны пярун над Афрыкай рагоча,
Над Азіяй ягоная рука.

Забойцам жа і гэтага замала,
Крыві іх долар прагне,
          нібы цмок.
Зямля людзей,
          над прорваю ты стала,
Да небыцця адзін застаўся крок.

Прашу ўвесь свет,
          што б'ецца ў ліхаманцы:
— Рыдлёўку не бяры ты за цаўё...
Жыць на Зямлі хачу,
          а не ў зямлянцы...
Няўжо жаданне марнае маё?

          * * *
Мы хуткасці асвоілі сягоння —
Такія век не сніліся дзядам...
І невядома што ўсё гоніць,
          гоніць,
Куды спяшаешся

не ведаеш і сам.

Ды толькі зрэдку ўздрыгнеш,
як ад болю,
Згадаўшы —
ёсць пачатак і канец,
Што час зямны твой растае паволі,
Як за шчакой аэрафлоцкі ледзянец.

* * *

Адыходзяць людзі, адыходзяць...
Не, я не пра вечны адыход.
Адыходзяць,
шчасце каб знаходзіць
У бясконцых пошуках выгод.

«Жыгулі» мяняюцца на дачу,
Дача —
на дублёнку і гараж...
І з чарговай кожнаю «ўдачай»
Уваходзяць у шалёны раж.

Прыклад —
вопыт навукоўца-мэтра,
Кляўся ён, што кроплі не змяніў:
Каб набыць чатыры лішніх метры,
Пяць кватэр за два гады змяніў.

Набірае моц такі крытэрый —
У суседа ёсць?
Дык будзе ў нас!
Рэчамі забіты ўсе кватэры —
Скончыўся людской улады час.

За рукаў не схопіш —
братка, годзе...
Дзе ж сапраўдных спраў тваіх сляды?
Адыходзяць людзі, адыходзяць...
І куды ж вы, родныя,
куды?

## НАРОДНЫ ВЫРАЗ

Вясковы дзядзька—
гумарыст і дока,
Цыгаркай зацягнуўшыся як след,
Любіў казаць, прыжмурваючы вока:
«А дурню дык і грамата ва ўрэд!»

Цудоўны выраз,
роджаны ў народзе,
Прыходзіць мне на думку акурат,
Калі гляджу, што ў нашым агародзе
Завёўся аглабельшчык, бюракрат.

А побач з імі пырнікам нязводным
У новы дзень шкрабуцца неўпрыкмет —
Двурушнік, падхалім, паклёпнік подлы,
Псеўдавучоны, проста прайдзісвет.

Бярэш у рукі іхнія анкеты,
Даешся дзіву —
кожны, як анёл.
Ёсць адукацыя яшчэ пры гэтым,
А калі так, то крэсла ёсць і стол.

Чытаў лісткі, пра дзядзьку зноў падумаў —
Бо: «Золата — не тое, што блішчыць...»
Яшчэ графой: разумны або дурань?
Хацелася б анкету надтачыць...

Вось бачу нос уздзёрты ганарыста,
А ў галаве — зацвілая вада...
Успамінаю дзядзьку-гумарыста...
Няма такой графы,
а як шкада!

* * *

Не сказалі таварышу добрага слова,
Пры жыцці не сказалі,
як трэба было...

А цяпер пазіраем,
схіліўшы галовы,
На самотны той груд,
што сняжком замяло.

Як яшчэ зашчыміць,
забаліць неаднойчы
Гэта слова ў душы схаладнелай,
калі
Ты прахопішся раптам
трывожнаю ноччу
З адчуваннем —
застаўся адзін на зямлі.

Так няпроста
даходзім да простай высновы —
Не шкадуй дабрыні,
што б з табой ні было...
Не сказалі таварышу добрага слова,
А яно б развінула
надзеі крыло.

### ПРЫПАР

Гудуць мядовыя настоі —
У лузе прыпар да начы.
І сонца рыбкай залатою
Мінае нерат аблачын.

Пчалой шчыруе дбайна лета,
Пакуль не згаснуць верасы...
Засмяглым вуснам позніх кветак
Прысніцца кропелька расы.

* * *

Сёння болей —
снегу ці смеху?
Не магу зразумець аніяк...
Разам з дзецьмі

на лыжах з'ехаў
І ў сумёт з галавою — чмяк!

А ў малых
толькі ўспыхнулі шчокі,
Нібы грудкі
у снегіроў —
Не такі ўжо трамплін высокі,
А ён падае... Вось герой!

Ім яшчэ
доўга-доўга не ведаць,
Што прыходзіць жаданне да ўсіх —
Гэтым звонкім навошчаным следам
Хоць на міг
вярнуцца да іх...

* * *

Бор ззелянелым крысом
Заслоніць сонцаву ўсмешку.
Валюхнецца ў рэчцы сом
Чорнаю галавешкай.

На прыбярэжны дзірван
З густых чаратоў,
як з падстрэшша.
Сівы, як адвечнасць,
туман
Выпаўзе хваляй няспешнай.

Расой папярхнецца жаўна,
Суцішыцца гонкае рэха...
І ты памаўчы,
бо прыехаў
Да той зямлі,
што адна.

* * *
Выспела зорак калінавых гронка,
Кропелька соку на вуснах гарчыць...
Песня прыветная дзіўнай старонкі
Чуйнаю птушкаю спіць на плячы.

Крочу няспешна знаёмым узмежкам,
Кладкай,
          што гнецца над золкай ракой.
Сонца купае ў расінах усмешку,
Скрозь —
          урачысты крыштальны спакой.

Слова світае
          ў душы анямелай,
Волі жадае,
          ірвецца ў блакіт
За аблачынкай чаромхава-белай,
Што паплыла
          праз гады і вякі.

## ЛІСТАПАД

Цёплы вецер нясе павуцінне над полем,
Асядае яно мне на скроні крадком...
Ад кляновага зарыва ясна ў наваколлі,
І душа захлынулася ціхім святлом.
Час спакойных развагаў,
          міг зямное спагады
Перад тым,
          як закружыцца вір залаты.
Ты прыходзіш знянацку,
          пара лістапада,
Каб адчуў смак
          гаркавай тваёй праваты.
Вось яшчэ адзін круг
          абышоў сарцавіну,
Лёг адбіткам мінулых надзей і трывог.
Чалавекам жыву
і аддзячыць павінен

Сонцу,
небу,
зямлі
я за ўсё,
што збярог.
Не чырвонцы збіраў,
а світальныя росы,
Квецень майскіх садоў,
плёскат хваляў рачных,
Салаўінага спеву сярэбраны россып,—
Хопіць скарбу майго да наступнай вясны!
Цёплы вецер нясе павуцінне над полем,
Асядае яно мне на скроні крадком...
Ад кляновага зарыва
ясна ў ваколлі,
І душа запалонена
ціхім святлом.

* * *

Спрадвечны круг жыцця і смерці
Ніхто
нічым не разамкне...
Сэнс гэтых слоў
спрабую змерац —
І аж мурашкі
па спіне.

Мая трывога не за тое,
Што больш не буду існаваць,—
Нашчадкаў зерне залатое
Дасць колас,
стане красавац.

Адным хвалююся даўно ўжо,
Адчай мой грукае часцей:
Чый лік
я на зямлі памножу —
Гаспадароў або гасцей?

Я ведаю,

спазнаўшы поўна
Цану і радасці
і бед,
Мне не ўсё роўна,
не ўсё роўна,
Якім пакіну белы свет.

Я крэўнасцю намёртва звязан
З усім,
што будзе,
ёсць,
было.
І мой галоўны абавязак
Рабіць дабро
і нішчыць зло.

З мяне спытаецца за веру,
З якой душа вяршыла рух,
За дапамогу чалавеку
Прайсці сумленна вечны круг.

Таму суровы я да песні,
Здаецца зноў,
што ўсё не так.
Мне з песняй
трэба уваскрэснуць
І над самім сабой
паўстаць...

## СПАТКАННЕ З ЭСТЭРГОМАМ

Я чую шолах пругкіх крыл,
І сам,
як птушка,
замі раю.
Па кроплі ўпэўненасць збіраю,
Каб зноў ісці за небасхіл.

Туды,
дзе хваль няспынны рух,

Дзе ў думе
над ракой вялікай
Застыла горда базіліка,
Замкнуўшы часу гонкі круг.

Паў на Дунай
вякоў туман,
Яго аднесла плынню ў мора.
А Эстэргом — славуты горад —
Не засціць
забыцця дзірван.

Нашэсце,
мор гадоў,
няўрод...
Агонь спраўляў віхурна свята...
Ды верай
быў мадзьяр багаты,
Што ёсць радзіма,
ёсць народ.

Прабілася праз камяні
Трава зялёная, як памяць.
Бядой і славай
сэрца паліць
Гул пад скляпеннем вышыні.

Стаю на замкавай сцяне,
Бліжэй да сонечных аблокаў,
І час,
цяпер такі далёкі,
Імкне
Дунаем
праз мяне.

* * *

Я ў маленстве любіў чуйна слухаць гудкі,
Што даносіла ў вёску марознае рэха...
За Дзвіной,
за лясамі ішлі цягнікі,

І хацелася мне ў край нязведаны ехаць.
Час мінуў.
З ціхай Глыбачкі выйшаў хлапчук,
Ён па рэйках,
па хмарах налётаўся ўволю.
Смак вандроўнага шчасця
душою адчуў,
Каб навек заручыцца
з дапытлівай доляй.
Вось і зноў
маё сэрца імкне за парог,
І жыццё,
як бясконцы працяг,
развінецца...
Галасамі далёкіх
і родных дарог
Мне яшчэ неаднойчы
Зямля адгукнецца.

## ЛЯ ПОМНІКА ШАНДАРУ ПЕЦЁФІ

Кропля крыві
не знікае ніколі
бясследна,—
Верую ў гэта.
І стомы няма паўтараць.
Глянь,
як зара
сведчыць пра кумачовую еднасць,
Глянь,
як вяргіні
гарачай трывогай
гараць.

Кропля крыві
не знікае ніколі
бясследна...
Колькі ж тых кропляў
у нетры вякоў
ацякло?

Столькі, здаецца,
што ранак павінен быць бледным,
А чалавецтва
да сонца узносіць крыло.

Кропля крыві,
што праліта за волю,
святая...
Мне падалося —
паэт прамаўляе радкі.
Крэўным карэннем,
як дрэва,
ў зямлю урастае,
Кронай трымае
нябёс будапешцкіх блакіт.

Нам не згубіцца
у прышлых часін
сутарэннях.
Верай і праўдай
надзеі служы
і жыві,
Помнячы вечна,
што ёсць і табе вымярэнне —
Кропля
аддадзенай справе Айчыны
крыві.

## БАЛАТОНСКІЯ ЧАЙКІ

*Камандзіру батарэі, старшаму лейтэнанту Пятру Дарашкевічу які загінуў у цяжкіх баях з фашыстамі ля возера Балатон*

Балатонскія чайкі
ў агні не згарэлі,
Хоць палалі тады —
і зямля
і нябёсы.
На апошні твой залп

я іду, батарэя,
Па вільготным пяску,
як па вогнішчы босы.
Балатонскія чайкі,
прашу,
падкажыце,
Дзе шукаць мне
хлапцоў-беларусаў магілу?
Я нясу васількі,
што смяяліся ў жыце,
І паклон ад зямлі,
сэрцу іхняму мілай...
Быццам толькі што іх,
маладых,
пахавалі,
Плачуць
вецер
і чайкі — тугі падгалоскі...
І падсвечвае чырванню
крылы і хвалі
Незамглёнай зары
трапяткая палоска.

## ПЕСНЯ ДРУЖБЫ

*Шагідзе Хашымавай*

Як заспявала Шагіда,
Замерла ўсё —
даліны,
горы,
І сырдар'інская вада,
І неба дзіўнага прастора.

Яе празрысты галасок
Пяшчотай поўніў
свет да донца.
Так вінаграду гронку
сок
Бунтоўным налівае сонцам.

Яна ўдыхала водар слоў
З лугоў
усіх куткоў Радзімы,
Жывыя кветкі братніх моў
Сплятаючы ў вянок адзіны.

Звінеў струной
чароўны тар,
І гукі халадзілі скроні.
Зямлі акрыленай абшар
Быў прада мной
як на далоні...

Спяшае час,
як з гор вада,
Але жыве хвіліна тая...
Яшчэ спявае Шагіда
І сэрца
на Памір вяртае.

## ПАДЗЯКА ЗЯЛЁНАМУ ЧАЮ

*Генадзю Пашкову*

Смаліла сонца, хоць крычы,
Адходную спраўляла...
Ратунак нёс самаварчы —
Пазвоньвалі піялы.

Ён важна крочыў між сталоў
З усмешкай зухаватай
І ставіў чайнікі без слоў —•
Ажно па тры на брата.

А потым галаву схіліў,
Прыклаў да сэрца рукі...
Сябрынай моцны чай пілі:
Таджыкі, беларусы...

І ў выпадковай чайхане

Пад вечны спеў арыка
Падумалася раптам мне
Пра сэнс жыцця вялікі.

Пра тое,
        што канца надзей
Няма ў трывожным свеце,
Пакуль ёсць роднасць між людзей,
Якая сонцам свеціць,
Што ўсё аддаў бы без пакут
Таму, хто затрымае
Вось гэты міг —
        маленькі цуд,
Які цаны не мае.

## АЛЁНКА З ГОРАДА НУРЭКА

Над плынню Вахша
        б'ецца рэха —
Чуваць на ўсіх мацерыках.
Алёнка
        з горада Нурэка
Смяецца на маіх руках.

Мы з ёй стаім ля вадаспада
У арэоле пырскаў-зор.
Здаецца,
        ад яе пагляду
Мякчэе позірк
        гордых гор.

Цвіце,
        як васілёк,
        Алёна
        На добрай, сонечнай зямлі.
Яна
        цымбал не чула звону,
Не бачыла
        ў лянах палі.

І хоць са смуткам,
ды не ў скрусе,
Каля стрыножанай ракі
Згадалі пушчы Беларусі
Са мной
Алёнчыны бацькі,—

Тут скрозь
зямляцкая сябрына,
Лічы,
што побач родны дом:
«БЕЛазаў» чуцен
рык зубрыны —
Паўзуць натужна на пад'ём.

Плаціна
прорву перакрыла,
Нібы арлінае крыло.
Да гарадоў
і да аілаў
Пайшло
жаданае
святло.

На Вахты,
скакуне шалёным,
Аброць народнай талакі...
Далонькай
шчырая Алёна
Маёй кранаецца рукі.

Яна частуе чабурэкам:
«Еш!» —
гаспадыня хоць куды!
А беларусачцы з Нурэка
Яшчэ
няпоўных тры гады.

## СУСТРЭЧА

На перавале,
дзе аіл
Да скалаў дзікіх прыляпіўся,
Аўтобус наш
з апошніх сіл
Чыхнуў
і зморана спыніўся.

Калі ступілі на зямлю,
Закалыханыя гайданкай,
Стаў кожны
кумам каралю —
Такой была неспадзяванка.

Плыў карагод.
Дачкою гор
Не толькі я
быў запалонен —
Пагляд гарэў,
здзіўляў убор,
Гранат
апёк мае далоні.

Мне Аліфа дарунак свой
Паднесла ціха,
сарамліва
І за дзявочай грамадой,
Як лань,
схавалася імкліва.

А вочы,
чорныя, як ноч,
За мною ўвішна цікавалі...
Цяпер,
куды ты хочаш кроч,
Твой смутак там —
на перавале.

* * *
Што за жанчына за мной след у след
Колькі ўжо год ступае?
Кіёчкам шукае шляху прыкмет,
Як быццам яна сляпая.

У хустцы,
          што ўпала аж да вачэй,
У чорнай даўгой спадніцы...
Хаду запаволіць,
          а потым шпарчэй,
Нібыта адстаць баіцца.

Сцяжына мая не віхляла ў бакі,
Але й не каціласся гладка.
Жанчына ж
          не збочвае на бальшакі,
Ідзе,
          як ішла...
Дзе разгадка?

Акрыты былога часу дымком
Сувязі мост не спаліш...
Тупае з хатулькам і кійком
Следам за мною
Памяць.

## РОДНЫ СКЛОН

— Хто, што? —
назоўны склон спытаў.
Сур'ёзна, а не жартам.
— На прысаку вайны я ўстаў
Сцяблінаю упартай.

— Каму, чаму?
— На ўзлёце дня
Радзіме даў прысягу,
Бо сэрца — вечная радня
Кастрычніцкаму сцягу.

— Каго і што?
— Яго партрэт
Яшчэ з калыскі помню.
Усмешкай Ільіча сагрэт,
Як самым шчырым промнем.

— Кім, чым?
— Людзьмі сваёй зямлі
Заўсёды ганаруся,
Што аж да зорак узнялі
Адвагу Беларусь

— Аб кім, аб чым?
— Відаць, найперш
Я думаю пра маці.
Нясе
Удзячнасць сціплы верш
Ёй і вясковай хаце.

А гэты склон я нездарма
Пакінуў напаследак...
Пакут страшней,
          мой край,
          няма,
Чым тыя,
Што ты зведаў.

Прад зоркай ля бяроз сівых
Схіляюся ў паклоне...
Быць памяці маёй пра іх
Да скону
          ў родным склоне!

* * *

Ты вазьмі кавалачак жыцця,
Пакаштуй,
          нібы акраец хлеба,—
Гэта не салодкая куцця
І не манка,

што чакаюць з неба...

Прадзед
за сахой гадуе горб,
На ўчарнелым твары
кроплі поту.
Як далёка з баразны яго
Да віткоў касмічнага палёту!

Рэвалюцыі гудзе пажар,
Разліваецца святло над светам.
Новы дзень прарочыць камісар
Словамі
чаканага дэкрэта.

Хоць віжуюць здрада і мана,
З-за вугла абрэз кулацкі сочыць,
Ды глыбей
бярэцца баразна,
Спеліць колас радасці высокай.

Нашай славы і пакут працяг —
Сорак першы год
у чорным дыме.
Да грудзей баец прыціснуў сцяг
Пальцамі
ад пораху рудымі,
Каб за стромай часу —
май прыйшоў,
Маладой уквечаны адвагай!
Разгарнуць яго гарачы шоўк
Над панікым купалам рэйхстага.

Лёс наш —
вечна жыць у барацьбе,
Для Зямлі шукаць найлепшай долі
І не думаць толькі пра сябе,
А пра іншых клапаціцца болей.

Ты вазьмі кавалачак жыцця,
Пакаштуй,

нібы акраец хлеба,—
Гэта не салодкая куцця
І не манка,
што чакаюць з неба.

## ЦЯГНІК У РЭВАЛЮЦЫЮ

*На паравозе № 293 У. І. Ленін пад выглядам качагара пераехаў у жніўні 1917 года з Разліва ў Фінляндыю, каб потым, напярэдадні ўзброенага паўстання, вярнуцца ў Петраград.*

З вагона у вагон
і на пероне,
Нібы мурашкі,
поўзалі шпікі...
Гудок у неба кінуў грай варонні —
Аж пацямнеў над соснамі блакіт.
Крануўся паравоз.
Як з гулкіх лёгкіх,
Ён пару выдзімаў —
шпарчэй,
шпарчэй.
А машыніст
праз белы сіп і клёкат
Крычаў:
«Падкінь,
таварыш,
дроў яшчэ!»
Жарт зразумеў
і з выглядам сур'ёзным
Ільіч абцёр крысом спацелы твар,
Зашчыраваў ля топкі паравознай:
Ні даць ні ўзяць —
сапраўдны качагар.
Раструшчаная коламі
трывога
Ляцела
разам з дымам

пад адхон.
Наперадзе выпрабаванняў многа,
Але жаданы дзень
ужо відзён.
У цемры
іскры ройныя шугалі,
Рассоўваў ноч глухую
паравоз...

А Ленін бачыў
полымя змагання,
Што ўсёй Расіі
перайначыць лес.

## АРЛІНАЯ ПЕСНЯ

*«І Ленін спяваў разам з усімі...» —*
*успамінаў дэлегат VI Усерасійскага*
*Надзвычайнага з'езда Саветаў*
*П. І. Замойскі*

Толькі змоўкла апошняе — Леніна — слова...
Хоць яшчэ не суцішыўся воплескаў шквал,
Пад скляпеннем тэатра
ўрачыста, сурова
Загучаў на ўсю моц
«Інтэрнацыянал».
Калыхаліся ў зале,
як хвалі на моры,
Шынялёў, кажухоў ды бушлатаў рады.
І Расія,
што зрынула вечнае гора,
Чуйна слухала спеў
агнявы,
малады.
Так, як прагне дажджу
жытні колас у спёку
І шукае святла той,
хто ў цемрадзі слеп,—
Так цягнуліся людзі да праўды высокай,

Што патрэбна была,
як паветра,
як хлеб.
Уладзімір Ільіч,
адступіўшы ў глыб,сцэны,
Голас свой
з галасамі
уладна з'яднаў.
І шырэў далягляд,
расступіліся сцены —
Гімн цяпер
па-над светам
арліна лунаў.

* * *

Жыццё маё становіцца страмчэй,
Узносяцца прыступкамі гады...
Ды вось аднойчы памяць апячэ
Шчымлівы пах ссівелай лебяды.

Адтуль,
З маленства,
незабыты пах
Плыве ў наш дзень,
у сны сяброў маіх —
Тых,
хто вучыўся не па букварах,
А па бацькоўскіх пісьмах франтавых.

Яшчэ спазнаў і я
нішчымны кус,
Каляны, абвянчаны з лебядой.
Відаць, таму душою не агруз,
Вяду змаганне з подласцю,
з бядой.

Я ведаю,
як мне патрэбна жыць,
Які пасля сябе
пакінуць след...

На лісці лебяды
        ў расе дрыжыць
Зялёны,
        неабдымны вокам свет.

Стаю прад сціплай удавой-травой,
Што ў сэрцы развярэдзіла струну...
А воблакі ляцяць над галавой,
Спяшаюцца
        ў наступны дзень зірнуць.

## ПАЛЫН

У полымі вайны згарэлі хаты,
На попеле зацвіў журбой палын.
У вочы заглядае вінавата,
Нібы ва ўсім ён вінават адзін.

Яго лісты трывожныя не кратай
Маёй зямлі яшчэ дасюль баліць...
А веры,
        што вяла у сорак пяты,
Ніколі і нікому не спаліць.

## ЛЮДЗІ З АГНЮ

Людзі,
        што выйшлі жывымі з агню...
Праз далячынь,
        дзе крывавяцца хмары,
Пільна ўглядаюся ў простыя твары,
Горды,
        бо маю такую радню!

Сны каляровыя,
        дзіўныя сню,
Вашыя ж ночы —
        як міннае поле.
Тое,

чаго не спазнаць мне ніколі,
Ведаюць людзі,
што выйшлі з агню.

Час не стрыножыш,
ды я не зманю:
Старасці вас не кранула завея,
Бо,
як звычайны метал,
не ржавеюць
Людзі,
што выйшлі з такога агню.

Родныя,
чым жа я вас засланю
Ад сумятні,
ад хваробы,
ад смерці?..

Мне пакідаюць святло сваіх сэрцаў
Людзі,
што выйшлі жывымі з агню.

Можа,
я ў нечым вас абганю —
Род чалавечы сягае наперад.
З намі заўсёды
і праўда і вера
Будуць
нязменнымі,
людзі з агню.
Гора палын пракаўтну,
праганю...
Свет застаецца,
вясна застаецца.
Шчыра за ўсё,
што жыве і смяецца,
Дзякуй вам, людзі,
што выйшлі з агню.

**СВОЛЬНА**
**(Балада)**

*У гады Вялікай Айчыннай вайны*
*2118 дзяцей з вёсак Верхнядзвінскага*
*раёна былі ўтоплены фашыстамі ў рэчцы*
*Свольна.*

Між цёплых траў,
 і лёгка і свавольна,
Рассунуўшы накаты берагоў,
Вілася
 трапяткая рэчка Свольна
Блакітнай стужкай
 у касе лугоў.
Стаяў над ёй,
 зямнога шчасця поўны,
Ды раптам думка надышла сама:
— Чаму тут
 у такі спякотны поўдзень
Ніводнае жывой душы няма?

Хіснула чараду лілеяў белых
І глуха хваляй мовіла рака:
— Прыходзяць на рамонкавы мой бераг,
Нібыта да магільнага грудка.

Я пракляла той дзень,
 калі фашысты
Кідалі ў вір бяздонны немаўлят,
Маліла сонца:
 «Высушы дачыста
І не вяртай пасля
 вады назад!»

Але яно свяціла так спакойна,
А я глыбела ад дзіцячых слёз...

І з той пары
 стаў ранай незагойнай
І лютай карай

мой гаротны лес.
Я слухаў моўчкі,
курчыўся ў адчаі,
Нібы бяроста курчыцца ў агні...
Здалося —
з-пад вады яны крычалі,
Малілі
вочы дзіўнай чысціні...

А як жа мне цяпер,
рачулка Свольна?!
іх вачаняты кожнай ноччу сню...
І зноў страшэнны вір мяне
павольна,
Але зацята,
цягне ў глыбіню.

## БАЦЬКАВА ПОЛЕ

*Уладзіміру Машчонку—дэлегату XXVIII з'езда КПБ, механізатару калгаса «XXI партз'езд» Ушацкага раёна*

Свеціцца белая роўнядзь пісьмом,
Тым, што не прыйдзе ніколі.
Смутак у горле сухім камяком —
Бацькава поле.

Рупіўся з ранку да самай начы,
Верыў у добрую долю.
Ты раскажы пра яго, не маўчы,
Бацькава поле.

Сыну адказу яно не дае,
Ціха ў марозным раздоллі.
Думы хавае цяжкія свае
Бацькава поле.

Толькі з атрада кароткі радок:
«Мужна загінуў за волю...»

Побач ралля і ўтравелы грудок —
Бацькава поле.

Тут, дзе вайна правяла баразну,
Працы спазнаў сын спатолю.
Кліча хлапца не адну ўжо вясну
Бацькава поле.

Звыклая шыр, дзе няма берагоў,—
З ёй можа ўсё ён адолець.
Сілай напоіць, як жыта, яго
Бацькава поле.

Хай у жыцці, поўным светлых надзей,
Месца не знойдзецца болю.
З сынам падзеліць свой радасны дзень
Бацькава поле.

## САЛДАТ

Ішоў у бой, а думаў не аб смерці,
Бо трэба сеяць,
        ваяваць — не век.
А куля ўджаліла асой у сэрца —
Як крыж, раскінуў рукі чалавек.

Пад ім скапаны мінамі палетак,
Дзе хутка рунню зоймецца ралля...
Ніхто не скажа за салдата лепей,
Як дарага
Бацькоўская зямля.

## СЛЯПЫ БАЯНІСТ

Усё забудзецца,
        ды толькі
Успомню і праз безліч год,
Як ён іграў у клубе польку,
Як ад яе хмялеў народ.

Ён да людзей ішоў.
Старанна
Настроіўшы душу і слых,
Вымаў з трафейнага баяна
Вясёлку гукаў агнявых.

Баян —
        працяг яго істоты,
І клавішы,
        што салаўі...
А сам быў там —
        пад кулямётам,
На снезе, цёплым ад крыві.

Смяяўся круг без дай прычыны,
Яснелі вочы ўдоў ад слёз,
Высвечваўся ў іх лес Айчыны —
І горкі,
        і высокі лес.

Гудзе
        гадоў трывожных пушча...
І верыць мне да скону дзён,
Што быў той хвіляю відушчым
Сярод усіх нас
        толькі ён.

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ КАДРЫ

Ажыве палатно на сцяне —
Там між куль,
        што гудуць,
        нібы восы,
Бачыш,
        хлопчык ідзе па вайне,
Абарваны,
галодны,
        босы.

Як трывожна глядзіць на нас!
Вочы сінія, быццам пытанні:
— Факел сонца навошта пагас?
Як жа жыць на зямлі без світанняў?

На дарозе у чорны свет
Не відаць ні матулі, ні таты.
Толькі
    танкавых гусеніц след,
Толькі
    колас зламаны, прымяты.

Ручаіны слёз паплылі,
Бо маленькае сэрца —
    не камень...
Хоць не быў ты ў той час на зямлі,
Ды за хлопчыка сёння ў адказе.

Ажыве палатно на сцяне —
Бачыш,
    хлопчык ідзе па вайне...

Ты у вочы яго зазірні —
Ні яму,
    ні сабе не змані.

## СПАЛЕНЫЯ ВЁСКІ

Сама прырода так дзяліла
Да нас, людзей,
    сваю любоў,
Што тут заўжды буйней маліны,
Гусцей трава і больш грыбоў.

Яна не верыла прыкметам,
Але ўсталёўвала правы,
Упэўненая, што за гэта
Не будзе ў крыўдзе,
    хто жывы.

Буяе ўсё пад шчодрым сонцам —
Бяры з сабой хутчэй кашы,
І неруш паляціць на донца...
А ў наваколлі — ні душы.

Рамонкаў белыя пялёсткі,
І галавешак стойкі чад.
Вайною спаленыя вёскі
Маўчаць,
нямыя ад прыгад.

Трывожным клёкатам буслiным
Іх да жыцця не абудзіць...
І нават спелыя маліны
Не могуць боль пасаладзіць.

* * *

Кроплі соку замігцелі —
У мурашоў сваё пітво!
У бярозы ў белым целе
Разышлося раны шво.

Быццам тысячы іголак
Колюць разам, як адна.
Зноў варушыцца асколак,
Што пакінула вайна.

Не шкада вясне бярозу...
Ёй не ведаць праз гады:
Ці то гэта шчасця слёзы,
Ці то горкі смак бяды?

* * *

Памінаем дзядоў ля збуцвелых крыжоў,
Памінаем па звычаю
з чаркай і скваркай...
За спіною —
бярозак маўклівая варта,
А за імі

жыты прагнуць новых дажджоў.

І нібы не было ні бяды, ні вайны —
Цішыня і высокае сонца над светам.
Мы глядзім,
гэтым добрым спакоем сагрэты,
І шукаем абрысы сівой даўніны.

Вось і крылы змяркання на гай наплылі,
Ды яшчэ не мялець ручаіне гаворкі —
Ля крыжоў свецяць нам пяцікутныя зоркі,
Іх не менш,
чым у небе,—
на нашай зямлі...

Не ўтравее ніколі сцяжына сюды,
Так было, ёсць і будзе ў далёкіх нашчадкаў.
Новы дзень нараджаецца недзе —
на шчасце.
І зязюля-шчыруха не злічыць гады.

## ЯК ПАХНЕ ХЛЕБ?

— Як пахне хлеб? —
пачуў пытанне,
Ды не спяшаю даць адказ.
Матулін успамін гартаю
Пра той,
ужо далёкі,
час...

Ля Паліка ў гнілых балотах
Яны ўтапілі гоман,
смех.
Балючай, незагойнай нотай
Дасюль гучыць аўчарак брэх...

Як восы над духмянай пожняй,
Няўмольна «рамы» загулі.
Акраец з'едзены апошні

Даўно —
забыліся калі.

На дзень:
аўса са жменьку мера,
Сухога —
не паліць агню!
Карэнні прэсныя аеру —
Блакады «шчодрае» меню.

Па пояс у вадзе зацвілай.
Прытулак на начлег — карчы.
І слухалі з астатняй сільт,
Як фронт спяшаў дапамагчы...

Ён ёсць сягоння ў кожнай краме,
Такім звычайным стаў для нас...
— Як пахне хлеб?
Спытайце ў мамы,
Яна дакладны дасць адказ.

* * *

Між пажоўклых старонак
кнігі жыцця
Застанецца той міг
каляровай закладкай,
Калі, падуладная радасці адкрыцця,
Дачка ўпершыню запляскала ў ладкі.

*

Жыццё і смерць...
Спрадвеку
Ім няма вымярэння...
Галоўнае для чалавека —
Паверыць у сваё паўтарэнне!

*

Я слаўлю
подзвіг хлебаробскі ўсенародны...
І думаю — у тым няма віны,

Што пахне мне
Ушаччынаю роднай
Акраец кожны аржаны.

*
Песні блукаюць між белых ствалоў—
Светла
і звонка
на Беларусі...
Сцюдзёны бярозавік вечных слоў
П'ю і ніяк не нап'юся.

*
Даўно з бяссмерцем
людзі ў добрай згодзе.
Яно заўжды трымаецца на тым —
Мы каласамі ў гэты свет прыходзім,
Каб сілу даць зярнятам залатым.

*
Над Ушаччынай
хмары нізкія
Гром грукоча,
дасюль не аціх.
Стрэлы строгія
абеліскаў —
Стрэлкі компаса
для жывых!

* * *
Не, наша памяць не сляпая...
Я добра бачу,
што з бакоў
Мяне, як сосны, абступаюць
Калоны стромыя вякоў.

Не, наша памяць не глухая...
Выразна чую ціўкат стрэл,
І стогны тых не заціхаюць,
Хто за Радзіму смерць сустрэў.

Жыве і будзе жыць Айчына,
Святую не забудзе кроў,
Глядзіць у новы дзень вачыма
Сваіх нязломных змагароў.

І кожны выспеліць жаданне,
Адрынуўшы спакой і страх,
Прайсці сумленна і аддана
Наканаваны лесам шлях.

Ён будзе —
  позна альбо рана —
І за табой ганец адтуль...
На ўзлобку даўняга кургана
Развязвай памяці хатуль.

## УРБАНЫ
## (Паэма)

### УСТУП

Разнасцежана неба над Айчынай,
Каб кожны адчуваў свой зорны час.
І вось мацнеюць крылы за плячыма —
Глядзіць зямля з надзеяю на нас.

Зямля,
  якую лес не надта песціў,
І я ні кроплі праўдзе не зманю,
Калі скажу:
З агню наш хлеб і песні,
І самі мы народжаны з агню.

Кастрычніцкае полымя і ў сёння
Прабілася скрозь прыцемак гадоў
Вулканамі рэактараў бяссонных,
Вячэрнім бляскам юных гарадоў.

Яго святло нам ісціну адкрыла,

Зрабіла пільным пакаленняў зрок.
Чуваць паўсюль — ад Брэста
да Курылаў—
Непераможны абнаўлення крок.

Сузор'ямі на Вахшы і на Лене
Палае розум радасных людзей.
У ім —
у несціханым абнаўленні —
Ёсць сутнасць мудрых ленінскіх ідэй.

Я смела пазіраю ў вочы веку,
Бо з вышыні такога адкрыцця
Відаць выразна веліч Чалавека,
Чыё імя ўвесь свет нясе,
як сцяг.

Мне ладзіць сэрцам выбраную тэму,
Як хату,
ад падмурка да вянка...
І я сваю пра Урбанаў паэму
Хачу пачаць з агністага радка.

## ЛУКАШ

Пад коўдраю перамір'я
Захопнік не спіць тым часам.
Кайзера хіжых наймітаў
Грукаюць блізка абцасы.

Пярун абрынуўся цяжка,
Зламана заходу рыса.
Выбухі густа кусцяцца,
Сунуцца шпарка на Дрысу.

За шыбай гамонка варты,
Газнічка мігае слепа.
Моўчкі схіліўся над картай
Лукаш — старшыня Саўдэпа.
Хіснуўся фронт.
Не залатаць

Дзірак усіх адступлення...
Крок робіць да апарата:
— Нам выйсце падкажа...
          Ленін!

Тэлеграфіст —
          як ведаў —
Ключом застукаў таропка.
У Петраград скрозь завею
Ляцяць працяжнікі,
          кропкі:

- Нем-ца-мі за-ня-ты Дзвінск і пра-цяг-ва-юць
да-лей-шы рух. Тэ-ле-гра-фуй-це тэр-мі-но-ва,
што ра-біць Дры-сен-ска-му Саў-дэ-пу,
сек-цы-ям, каз-на-чэй-ству ў вы-пад-ку
на-блі-жэн-ня нем-цаў да Дры-сы.
Стар-шы-ня Дры-сен-ска-га Саў-дэ-па
          УР-БАН.

Надзеі пал не атушыш,
А хвілі плывуць вякамі...
І вось варушыцца стужка
З адказам,
          сэрцам чаканым:

— Стар-шы-ні Са-ве-та Дры-са Ур-ба-ну
А-каз-вай-це су-пра-ціў-лен-не, дзе гэ-та
маг-чы-ма. Вы-возь-це ўсё каш-тоў-на-е
і хар-ча-ван-не. Ас-тат-ня-е ўсё зні-шчай-це.
Не па-кі-дай-це во-ра-гу ні-чо-га. Раз-бі-рай-це
пу-ці —дзве вяр-сты на кож-ны-я дзе-сяць.
Уз-ры-вай-це мас-ты.
          ЛЕ-НІН.

Трывогаю край акрыўся.
Не пройдзе вораг ні пядзі.
Грукоча рэха над Дрысай —
Залеглі байцы ў засадзе.

Адвагі іхняй не сцерці

Ні полымю,
ні снарадам.
З ленінскім словам у сэрцы
Лукаш на чале атрада.

Сустрэч з ім болей не будзе,
Ён там —
у баі агністым...
Такім і запомнілі людзі
Бясстрашнага камуніста.

## КІРЫЛА

*К. Д. Урбан — удзельнік першай сусветнай грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў арганізатар калгаснага ладу на Дрысеншчыне.*

Памяці людской рунее поле,
І не развітацца з даўніной...
Для Кірылы не скупіцца доля —
Тры вайны ў салдата за спіной.

Ён сядзіць на прызбе.
Сонца ціха
Па маршчынах гладзіць прамянём.
Столькі лет і зім прайшло,
а ліха
У грудзях — сцюдзёным камянём.

Ластаўкі ўпіваюцца,
як стрэлы,
У блакіт,
што чырванню ацёк.
Так і ён калісьці ад расстрэлу
Птушкай трапяткой
на волю ўцёк.

Там, у дымных полацкіх руінах,
Ручаёк жыцця яго не счэз —
Падабрала нейкая жанчына,
Развязала рукі...

Потым — лес...

Задуменна ён глядзіць на сонца,
На вачах не выблісне сляза,
Збранзавелы сам,
як тыя сосны,
Што калышуць песні партызан.

Тры вайны...
А час, што паміж імі?
Прысак варухні —
апаліць жар.
І гады вачамі маладымі
Пaглядзяць яму трывожна ў твар.

Зноў дыхне спякотай сходак частых
І кулацкай рулі халадком,
Баразны агульнай даўкім шчасцем,
Першым камунарскім каласком.

Памяць не ўтравела...
Вунь над долам...
Устаюць жыты тугой сцяной...
Для Кірылы не скупіцца доля —
Тры вайны палаюць за спіной.

## МІХАСЬ

*У выніку шматлікіх раненняў, атрыманых пры выкананні баявога задання, разведчык-падрыўнік І Дрысенскай партызанскай брыгады М. С. Урбан у 17 гадоў страціў зрок.*

Раскінула вясна абрус мурожны,
Салют пупышак цёплых над зямлёй...
Ідзе Міхась па сцежцы асцярожна
І не хавае радасці сваёй.

Не бачыць ён,
ды ўзбуджанай істотай
Па кроплі спасцігае новы свет:

Лісцінак першых кволую пяшчоту,
За ўвішным плугам лёгкі,
          пульхны след,

Натруджаны палётам доўгім вырай,
Вясёлы клёкат пенных раўчукоў,
Раллі нястомнай векавую шчырасць
І веснавую рупнасць землякоў.

Не сталі дні ягоныя начамі,
Звініць жыцця напятая струна,
Хоць безліч год стаіць перад вачамі
Глухая непадступная сцяна.

Шчаслівым днём вялікай Перамогі
Сюды ён крочыць праз былога дым,
Дзе ўзняўся строгі помнік ля дарогі —
Паміж зямлёй і небам сувязным.

Навобмацак шукае гронкі літар,
Гудзе прыбоем несціхана кроў...
Была вайна,
          ёй невядома літасць,
І не даклічашся адтуль сяброў.

Тут Урбаны пазначаны найболей
У пераліку незабыўных страт.
Пайшло іх дваццаць шэсць
          у кіпень бою,
Дванаццаць не вярнулася назад.

Смяротны груз не мае вымярэння,
Сябе не шкадаваць —
          вайны закон.
І стаў Міхась такім,
          нібыта крэмень,—
Паслаў шэсць эшалонаў пад адхон.

А тая ноч за межамі ўяўлення
Пра чалавечы боль,
          пакуты,

жах...
Цягнік варожы,
хлопцам на здзіўленне,
Над мінай праімчаў на ўсіх парах.

Як чэрці, злыя —
стрымгалоў да рэек,
Ну, як мы праваронілі яго?
Фашысцкай міны выбух...
Азвярэла
З-пад ног у Жэні вырваўся агонь.

Ракет і куль бязладзіца мігцела,
Нібыта ў змроку зацвіла зара...
Ён чуў,
як халадзела,
млела цела,
Якое апяклі трынаццаць ран.

Ён поўз...
А месяц тлеў свячы агаркам,
Крывёй дыміўся след па цаліку.
Капешка сена...
Забыццё...
Аўчарка
Слінявай пашчай тыцнула ў шчаку.

А потым смерць ішла за ім без стомы
Па лагерах фашысцкіх...
І пасля...
І ўсё ж жывым застаўся,
бо дадому
Свайго героя клікала зямля.

У час пакут,
працяты даўкім сумам,
Знайшоў ён сілу
боль перамагчы.
Галоўнае —
з зямлёй бацькоўскай сувязь,
Што б ні было,

трывалай зберагчы.

І жаўрукі ў паднеб'і не маўчалі,
Калі вітаўся з імі, як з раднёй...
І свет прад невідучымі вачамі
Адкрыўся незвычайнай глыбінёй.

**МІКОЛА**

*«Хлеб — гэта усмешка зямлі».*
*Са слоў механізатара калгаса*
*Імя Леніна Верхнядзвінскага раёна*
*М. С. Урбана*

На полі, крывёю сагрэтым,
Не вырас агорклы палын...
Ёсць сэнс найгалоўнейшы ў гэтым —
Шлях бацькі працягвае сын.

Не кожнаму дадзена шчасце
Зямлю і сябе зразумець...
Стаіць прада мною сучаснік,
Якога мы хочам апець.

Жніво адгрымела.
Над пожняй
Плыве жураваоў позні клін...
Ля ног нашых свеціць трывожна
Вада ў маршчаках каляін.

Тут ліўні ўладарылі доўга,
І грузнуў камбайн,
нібы танк.
Абшар апусцелы падобны
На месца ваенных атак.

Традыцыі людзі шануюць
Палітай крывёю зямлі,
І хлеб —
гэту усмешку зямную —
Ад лютай бяды ўберaглі...

Пацiснуў руку,
         і размова
Сама пераходзіць на «ты».
Драбнеюць парадныя словы
Ля мудрай яго прастаты.

Радок у няспешнай гамонцы
Вядзе ён, нібы баразну.
Я слухаю гімн паўсядзёнцы,
Спялю ў сэрцы думку адну:

Няважна чым — жытам ці песняй
Надзеі і мары ўзышлі,
Вось так па жыцці мы пранесці
Павінны любоў да зямлі.

Гучыць яго радасны голас
Пра клопат спрадвечны, святы...
А свет,
         нібы сонечны колас,
Напоўнен святлом дабраты.

Загуў «Беларус» на прыволлі,
І ён ціха кажа:
         «Пара...»
Жыцця неўзаранае поле
Чакае свайго плугара.

## ЯНКА

*Янка — малодшы з дынастыі Урбанаў, народжаны Вялікім Кастрычнікам.*

Залевай абмытыя вочы нябёсаў
Спакойна і ясна глядзяць на зямлю.
А хлопчык імчыцца па лужынах босы
І промню гукае шчасліва:
         «Лаўлю!»

Як кнігу,

ён свет для сябе адкрывае,
Не злічыш цікавых старонак жыцця.
І цягнецца ніткаю сувязь жывая
З маёй даўніны ў незнаёмы прасцяг.

Што там,
за нязнанаю рысаю часу,
Дзе завязь народзіцца новага дня?
Гады незваротныя цугам імчацца,
Прыспешваюць шпорамі век,
як каня.

Яго не дагнаць.
За далёкай вярстою
Смяшлівы і рыжы,
як сонца,
хлапчук...
Убачыць ён тое,
пачуе ён тое,
Чаго мне ніколі не бачыць,
не чуць.

### МАНАЛОГ ЗЯМЛІ

Сплыло вякоў маіх у Лету — процьма,
Але той час у памяці жыве,
Калі на мне жыцця зялёным промнем
На поўны рост узняўся чалавек.

Стагоддзямі спяліла мрою-мару,
І вось ушчэнт разбіты ланцугі.
Над шостай часткаю майго абшару
Успыхнулі чырвоныя сцягі.

Я веру тым,
хто, праўдай акрылёны,
Быў трывалей,
чым самы моцны сплаў,
Хто смела для прыгнечаных мільёнаў
Арбіту рэвалюцыі праклаў.

Я веру тым,
хто, хрышчаны бядою,
Нёс да святла мяне з апошніх сіл,
Хто ў час блакад карміўся лебядою,
Але не складваў у палёце крыл.

Імчаць ракеты па касмічнай сцежцы,
А ў памяці найпершы небагосць.
У маладой гагарынскай усмешцы
Ад Урбанаў,
бясспрэчна,
нешта ёсць.

Мой новы дзень —
віток у гулкі будзень,
І намаганню кожнаму — хвала!
Штурмуюць акіян і космас людзі,
Каб стала я цудоўней,
чым была.

Такіх сыноў не злічыш у дзяржаве,
Якая стала ля майго руля.
Вядомых,
невядомых звонкай славе,
Але люблю усіх іх
я — Зямля.

Ляцяць гады,
нібыта з дрэва лісце...
А кроў ліецца зноў
то там,
то тут.
Боль за людзей сціскае,
як калісьці,
Хоць мне хапіла б і былых пакут.

На смех дзяцей,
крамяных,
як ранеты,
Смерць свой прыцэл бяздумна навяла.
Ёй хочацца,

каб па шчацэ Сусвету
Гарачай кропляй я ў нябыт сцякла.

Ракет крылатых не стрымаць удараў
Біблейскім чарапахам і сланам,
Таму нашчадкі першых камунараў
Вартуюць пільна неба сіні храм.

І я жыву надзеяй запаветнай,
Што шчасцем новым
лес не абміне...
Кастрычніка чырвоны сцяг —
мой ветразь.
На Урбанах
трымацца
вечна мне!

# З кнігі

# «ВЕРА, НАДЗЕЯ, ЛЮБОЎ»

# 1983

* * *
І стаю я, жыццё, прад табой...
Ты дарма хмурыш бровы сурова —
Ціха
        вера,
        надзея,
        любоў
Шэпчуць мне запаветныя словы.
Захлыне грозных дум глыбіня,
Часам роспач пагрукае ў дзверы,
Толькі з праменем новага дня
Птушанём заварушыцца вера.
Жыць трывожна на свеце, калі
Хмар злавесных гайня не радзее,
Ды над лесам людзей і Зямлі
Свеціць зоркай бяссоннай надзея.
Прага шчырасці, роднасці зноў
У нязведанасць торыць дарогу.
Спеліць сэрца адважна любоў,
Выцясняючы сум і трывогу.
Сёстрам тром я адданасць збярог.
Што ў душы, тое будзе і ў слове.
Засяваю свой сціплы аблог
Зернем
        веры,
        надзеі,
        любові.

## ТРЫ АБЛІЧЧЫ

Калі вочы мае праясніла заранка
І жыцця расхінуўся абрус,
Над калыскай спявалі тады калыханку
Маці,
        каліна
        ды Беларусь.

Недзе зараз у сцішанай хаце
Пра мяне журбоціцца маці.
Засыпае маю пуцявіну

Белым цветам надзеі каліна.

І куды б ні пайшоў — застаюся
Пад буслiным крылом Беларусі.
Вочы выбліснуць ціхім сузор'ем
          у згадцы,

І трывогі абрынецца груз...
Тры аблiччы...
Ім вечна за нас хвалявацца...
Маці,
          каліна
          ды Беларусь.

* * *

Пад ліпай, што галлём чарнее,
Стаяла хата ў тры акны.
Жыла там цётка Паланея,
Адна як перст пасля вайны.

Сваёй не адрачэшся долі —
У хаце мужыка няма.
Сама ў гародчыку і ў полі
І на падворку ўсё — сама.

Калі салома ўшчэнт сатлела,
То выгляд даху сумным быў:
Дзе толь, дзе лапік бляхі белай,
А побач — гонта і гарбыль.

Цікаўны з бальшака зварочваў
Да хаты сцежкаю глухой,
Бо надта ж западала ў вочы
Яна стракатаю страхой.

А цётка шчыра рада госцю
І хваліць сціплае жытло:
— А што з тае мне прыгажосці?..
Абы за карак не цякло.

Увішнай, маладой хадою
У склеп спяшае па траве.
Нясе гарлачык сырадою:
— Частуйся, добры чалавек...

Над могілкамі дзень сінее,
Як васілёк маёй віны.
Пад крыжам цётка Паланея
Сніць вечна хату ў тры акны.

Свет не заўважыў гэтай страты,
Не азірнуўся на бягу...
А перад кім я вінаваты,
Што памяць,
          як страху,
          залатаць,
Відаць, ніколі не змагу?

* * *

Мы прыйшлі на зямлю,
          як над ёй насвятлела
Сонца,
          чыста адмытае слёзамі ўдоў
Ад пякучага пылу,
          крыві закарэлай,
Ад куродыму
          доўгіх ваенных гадоў.
Мы праз попел сівы
          прабіваліся рунню,
Паліліся жыццём
          каласы і радкі,
Час трывожнаю радасцю
          нервы наструніў,
Боль і шчасце з'яднаць —
          выпаў лёс нам такі.
Цяжка,
          з потам,
          як хлеб,
          нараджаюцца словы,
Ад як іх сэрца плача,

смяецца,
пяе...
У былых хлапчукоў
заінелі галовы,
Гэты іней
і ўлетку не растае.

## УШАЦКІЯ УЗГОРКІ

**I**

З калыскі верыў я сваёй зямлі,
Што парадзіўся
пад шчаслівай зоркай,—
Не надта шчодрыя на хлеб палі,
Затое для душы —
лясы, узгоркі.
На ўзлобак вечнага груда ляціць,
Цалуеш сцяжжку босымі нагамі.
І раптам — слепіць шыр,
гайдае ціш.
І поўніць радасць вочы
з берагамі.
Глядзіш удалячынь да скону дня,
Дапытлівасцю кроў звініць,
пульсуе.
Маленькім сэрцам,
нібы птушаня,
З вялікім светам адчуваеш сувязь.

**II**

Быць пільным,
чуйным да чужой бяды
Высокая зямля мяне вучыла.
Таму мае няспешныя сляды
Не зарастаюць на пакатых схілах.
Хоць бачыў горы
ў дзіўнай старане,
А сняцца ўзгоркі —
стрэхі Беларусі.
Яны ўзялі даўно ў палон мяне,

І я з яго па волю не ірвуся.
Сходы ўзыду —
І тлуму скіну груз
І захлібнуся родных вёсак дымам...
Ушацкія узгоркі —
        не Эльбрус,
А як відаць мне з іх
        уся Радзіма!

## УСЁ З ЗЯМЛІ

Усё з зямлі.
Яна паволі
У зруб жыцця
        вянцы кладзе.
Яе не разышлася доля
З маёй ніколі і нідзе.
Усё з зямлі.
З тае прычыны
Яшчэ ў маленстве поўніць кроў
Святое пачуццё айчыны,
Любоў да родных ніў,
        бароў.
Усё з зямлі —
        акраец хлеба,
Глыток крынічнае вады,
Штодзённай радасці патрэба,
Неспадзяваны крок бяды.
Усё з зямлі.
Мерыдыяны
Яе пакутлівых
        трывог
Сціскаюць сэрда несціхана,
Праходзяць і праз мой парог.
Усё з зямлі.
Пчаліным гудам,
Сяўбой
        і жніўнай малацьбой
Я вечна цешыцца не буду...
Аднойчы стану сам зямлёй.

І я радок невыпадковы
Спялю адданасцю скразной,
Бо нават думы,
            нават слова —
Усё з зямлі.
            З яе адной.

            * * *
За небакрай сыходзяць
Густыя фарбы дня.
Трывожна на заходзе
Крывавіць цішыня.

Там хмар залётных вата
У сполаху агню.
Стары падслепавата
Прыставіў даланю.

Што хоча ён угледзець
Праз полымя святла,
Якое потым недзе
Адужае імгла?

Сядзіць ён на пагорку
На шэрым валуне,
Дзе пяцікутнай зоркай
У вечнасць памяць мкне.

Ватоўка грэе плечы,
Душу — дымок махры...
Яшчэ павеў — і вечар
Цяпельцам дагарыць.

Панікла вінавата
Сівая галава.
Да ног яго накатам,
Як хваля, б'е трава.

## КРЫЖ
## (Апавядае партызанскі разведчык)

Я ішоў на заданне паўз ціхую вёску,
Што бялела садамі над плынню ракі.
Твар мой лёгкім сняжком
        халадзілі пялёсткі,
А ў духмянай завеі шалелі шпакі.
Крочыў,
        сэрца спявала,
        а вочы сачылі
За маўклівымі вулкамі,
        за бальшаком.
І адкрыўся малюнак:
Чатыры жанчыны
Ля крыніцы укопвалі крыж з ручніком.

«Бог у помач...
        Навошта ж ён вам, маладзіцы?
Ці вада, можа, будзе цяпер саладзей?»
А яны у адказ:
«Ад агню чужаніцаў...
Кажуць людзі старыя — бяду адвядзе».

Як вяртаўся назад,
        думаў — тут заначую...
Толькі вочы шукаюць прытулак дарма.
Свішча вецер у комінах...
        Попел качуе...
З ручніком крыж стаіць.
        Вёскі ж болей няма

## СУСТРЭЧА КАМБРЫГАЎ

Гадоў трывожных наплываюць крыгі,
Не знёс іх час
        па гонкім быстраку...
Усмешліва вітаюцца камбрыгі,
А слёзы супраць волі —
        на шчаку.

Ды не таму,
          што ў радасных абдымках
Бракуе сёння сілы маладой,—
Глядзіць на іх
          з пажоўклых фотаздымкаў
Вайна з яе прадоннаю бядой.

Ды не таму,
          што пастарэлі твары
І цвёрдасці у кронах не стае,—
Крывёй сцякае зноўку іх таварыш,
Конь капытом у дол тужліва б'е.

Трывала згадка ў вузел навязала
Шчаслівы будзень
          з днём блакадным тым.
І ў гулкай цішыні музейнай залы
Гранаты рвуцца,
          чуцен даўкі дым.

І жах спакоем мужнасці закілзан,
Заціснут помстай палец на курку...
Імгненні, нібы стрэляныя гільзы,
Сіпяць на крохкім памяці лядку.

## ЖОРНЫ

*Алесю Жуку*

Зярністыя шэрыя жорны
Вычэсваў мой дзед з валуна.
Раптоўна вачам стала зорна
І змокла ад поту спіна.

Ён сеў. Сціхлі гулкія гукі,
Што мерна дзяўблі цішыню.
Цяжкія дрыготкія рукі
Натрэслі шчапоць тытуню.

Дымок адлятаў ціхім сумам,

Свяцілася шчэццю шчака.
Сялянскія вечныя думы
Цяклі, як з-пад жорнаў мука.

Вайной здратаванае поле...
Няўрод — ліхалецця працяг...
З нішчымніцай венчана доля,
А лёс шле нявестцы дзіця.

Павольна за думкамі следам
Маленства яго прыплыло.
Ды зараз і сам ён не ведаў —
Было гэта ці не было.

Упаў у траву недакурак,
Ля каменя сцішыўся дзед.
Зліліся ў адно — дзень хаўтураў
І дзень уваходзін у свет.

Сілкуецца зноў хлебам чорным
Зямнога жыцця вечны круг...
Зярністыя шэрыя жорны
Ніколі не спыняць свой рух.

**БОТЫ**

Памяць — паромшчык упарты —
З даўніх вязе берагоў
Віцьку — суседа па парце,
Большага брата яго.

Бацька іх лёг над Варшавай...
Потым — што год, то няўрод...
Ім памагала дзяржава,
Усё, што магла,
для сірот.

Маці заплакала ўпотай,
Гоман на печы аціх —
Завуч прынёс дзецям боты,

Покуль — адны на дваіх.

Крочылі ў школу на золку
Сцежкай, дзе тлелі снягі,
Першы ў абноўцы кірзовай
І без абутку — другі.

Збочвалі разам да соснаў,
Там паравала зямля.
Брат падстаўляў ногі сонцу,
Мокрай спіной — да камля.

Добра,
што весняя ласка
Стала цяплець дзень пры дні.
Нібы гусіныя лапкі,
Ступні гарэлі па пні.

Віцька ж усё гэта бачыў...
Хоць разувацца шкада,
Боты на змену
без плачу
Брату спяшаўся аддаць.

Час быў такі...
Без звароту
Сплыў ён над звон сініх крыг...
Зноў мне прысніліся боты,
Тыя —
адны па дваіх.

**РАДОЎКА**

Бацька раскатурхвае нядоўга:
— Гаварыў жа, не ідзі ў кіно...
Мне ж як снег па галаву — радоў:
Хоць і ведаў пра яе даўно

Не бяды, што спаў ты надта мала,
Гоніць з хаты ранак у каршэнь.

Луста хлеба і шматочак сала
Весела ныраюць у кішэнь.

З малаком біклажку — за напругу,
Побач кніжку — чытану ўціха,
Выцягну яшчэ з падстрэшка пугу,—
Вось і ўвесь рыштунак пастуха.

Дзень па пасце,
	як заўсёды,
	посны,
Хоць яго забельвай малаком.
Парыць так,
	што небу нават млосна,
Ды ад статка не ўцячы крадком.

Па кустах хаваюцца каровы
Ад сляпнёў,
	і я за імі ў цень.
А з ракі чутно — сябры з уловам,
Добра гойсаць ім цалюткі дзень.

Поўдзень мроівам калыша сонным,
А ў мяне наўме цяпер адно:
Як угаварыць,
	прымусіць сонца,
Каб хутчэй схавалася яно.

Сонца садзіцца —
Пастух весяліцца...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Тыя дні свяціць мне будуць доўга...
Прыгадаеш — думка пабяжыць,
Што свой век — шчаслівую радоўку
Трэба не адбыць мне,
	а пражыць.

## ДОМА

Свеціцца роднасцю хата:
— Мабыць, не снедаў, сынок?
Маміны рукі шурпата
Лашчаць каляны лянок.

Хлеб — ёсць здаўна завядзёнка
Першы ўзыходзіць на стол.
Бразнула звонка заслонка —
Пах жыццядайны наўкол.

Печаў усіх гаспадыня —
Бульба плыве ў чыгунку.
Хрумсткі прыгарачак здымеш
І як хутчэй за шчаку.

Той да прысмакаў не ласы,
Хто на нішчымніцы рос...
Бачыцца бульбачка з квасам,
З кроплямі матчыных слёз.

Памяццю, як качаргою,
Прысак гадоў варушу.
Хата святлом
сэрца гоіць,
Ціша калыша душу.

Маміны рукі шурпата
Лашчаць каляны абрус...
Кожнай драбніцаю хата
Сведчыць,
што ты — беларус.

* * *

У глухіх зацененых ярах
Плача ручаямі снег апошні.
Хмеліць галаву сялянскі пах
Набрынялай,
як рашчына,

пожні.

Жаўрука сярэбраным цвічком
Неба малады блакіт
прабіты.
Абазваўся буркатлівы гром,
За зіму маўклівую
забыты.

Ён пакуль спрабуе голас свой,
А пасля такую польку рэзне,
Што махне зялёнай галавой
І у скокі кінецца бярэзнік.

* * *

З даланёю каса развіталася,
Цела стомай гарачай спавіта...
І аблога прырэчная стала ўся
Нецярпліваму ветру адкрытая.

Пласт за пластам варушыць
няўлоўны ён,
Чэша космы пракосам золкім.
Сонца промнямі абцалоўвае,
Абмілоўвае кожную зёлку.

Звечарэла.
Капешак радзімкамі
Густа ўсеяны луг прыцішэлы.
Дождж насунуўся.
Кроплямі дзынкае,
Твар спацелы кранае нясмела.

Над кашуляй цярушына колецца,
І нагам казытліва босым...
Пахне сенам духмяным ваколіца,
Пахнуць сенам нябёсы.

* * *

Рачулкі сіняю аправай
Аздоблены стракаты луг.
Над разамлелым разнатраўем
Стаіць густы мядовы дух.

Здаецца, што чмялём калматым
Упала сонца ў вір вянкоў,
Высмоктвае нектар заўзята
Мільярдам звонкіх хабаткоў.

## БЯРОЗАВЫ ГАЙ

Прыцягненне красы і святла
Чалавека да скону пільнуе.
Сцежка зноў да бяроз прывяла —
Прывітаць чысціню незямную.

Звонкі ўзлёт
 санцавітых ствалоў,
Лёгкі кужаль
 смяшлівай лістоты...
Ты ідзеш
 і душою без слоў
Просіш лёс незгаворлівы ўпотай,
Каб заўжды прад вачыма плылі,
Хвалявалі спрадвечнай мілосцю
Завушніцы на тонкім галлі
І радзімкі па белай бяросце.

## ПЕРШЫ СНЕГ

А душа ўсё чагосьці чакала...
Адзвінеў летні дзень —
 час уцех.
Лістапад адкружыў.
Ціха стала.
І тады лёс паслаў першы снег.
І душа яснатой невымернай

Затрымцела,
нічым не суняць.
Як хвалюе ягоная вернасць,
Як бянтэжыць яго чысціня!
Снег ляціць,
вымятаючы крыўды,
Зайздрасць,
хцівасць і сыты спакой.
Чарнату замарозіў, акрыў ён
Белізною такой трапяткой.
Ён падаць прыклад мудрасці хоча,
Нездарма з ім і сцюжа
прыйшла,—
Каб паўнелі святлом
нашы вочы,
Каб паболела ў сэрцах цяпла.
Новы год хутка людзі
прывецяць.
Не скупіцца на радасць зіма...
Снег ідзе.
І, здаецца, на свеце
Больш важнейшай падзеі няма.

* * *

Вея снегам ускіпае
І скуголіць без прычыны...
На надпал я наскіпаю
Пук духмянае лучыны.

Потым прынясу ахапак
Свежаколаных паленцаў,
Запіхаю грубцы ў зяпу,
Каб агонь шугаў не ўлегцы.

Абяру з дзесятак бульбін —
І ў чыгун. Яго прыстрою.
Буду слухаць сіп ды булькат
І пра нешта ціха мроіць.

Скача іскра па падлозе,

Далятае глуха ў вуха
Рып — вятры сумёты возяць,
Гул — шалее завіруха.

Грукнуць дзверы.
Дух хаціны
Подых сіверу ўтрымае.
Галаву шчасліва ўскіну,
Я пазнаў па кронах...
Мама...

### МАМІНА ХУСТКА

Пахне яна асцярожнай вясною,
Талых снягоў развітальным разлівам,
Цёплай пупышкай,
лісцін навіною,
Шчэбетам птушак,
бязладным, шчаслівым.
Пахне яна клапатлівай спякотай,
Песняй пчалы,
сырадоем духмяным,
Спрэчкай спрадвечнаю
бульбы з асотам
І мурагом,
што ў сяннік напіханы.
Пахне яна залатой павуцінкай,
Хрумсткай антонаўкай,
роснаю пожняй,
Ржэўнікам шэрым,
счарнелым націннем,
Голасам выраю ў небе трывожным.
Пахне яна маладзенькім марозам,
Дранікам,
што па патэльні пячэцца.
Пахне яна нечым родным і розным,
Як прытулюся — аж зойдзецца сэрца.
Мы вырастаем марудна і хутка...
Пахне маленствам маміна хустка.

## ІДЗЕ ЧАЛАВЕК

*Маёй бабулі*
*Вользе Аляксандраўне*

Ідзе па вёсцы цвёрда, роўненька
Таго стагоддзя чалавек.
Усё на свеце пераробіла
Бабуля за ўмалотны век.

Але і сёння не хаваецца
Ад працы — кошык у руках.
Вось толькі ногі ў цёплых валенцах —
Даймае холад, каб ён спрах.

Паклікаў лес. Як не прывабіцца
Яго дабром (пакінуць грэх!),
Не пакланіцца спелай ягадцы,
Не стрэсці у прыпол арэх.

Ідзе бабуля... Ціха свеціцца
Маршчыністы звычайны твар...
Святло душы — адна адмеціна,
Любоў да ўсіх — адзіны дар.

Яе жыццё, як песню родную,
Час забыццю не дасць на здзек...
Сваёй сцяжынай цвёрда,
роўненька
Ідзе праз вечнасць чалавек.

## ХАТА

*Вікенцію Антонавічу і Ядвізе*
*Казіміраўне — гаспадарам*

На ўзбярэжжы слаўных Налібокаў,
Што грыбною радасцю багаты,
Абагрэла роднасцю глыбокай,
Зазірнула ў сэрца мудрым вокам

Шчырая па хлеб і слова хата.

На дварышчы пахла свежым сенам,
Сопкай бульбай,
яблыкамі,
мёдам...
Маці расчыніла ветла сенцы,
Бацька вынес звонкія паленцы —
І паплыў дымок над агародам.
Чыгунок ускочыў на цагліны —
Сумаваў даўно па юшцы добрай.
Тлелі вугалі, нібы .мал і мы,
Кот глядзеў на іх,
выпруджваў спіну,

Ведаў,
што пасціць яму не доўга.
Роем ціхая гула бяседа
Пра ўраджай, сялянскія клапоты,
Блізкія таму, хто змалку зведаў,
Што ісці ў жыццё спрадвечным следам
Можна толькі з мазалём і потам.
І шаптаў я:
— Каб ляпей — не трэба...
Хай нішто трывогай не парушыць
У вяснушках зор айчыны неба,
Пах шчаслівы а ржанога хлеба
І цяпельца,
што яднае душы...
Ёсць мяжа гадам,
што нам адпушчаны,
І на ёй згадаю тое свята...
Лёгка жыць і верай быць відушчым,
Покуль на ўзбярэжжы сіняй пушчы
Зорыцца акно бацькоўскай хаты.

### ЗАБЫТЫЯ ПЕСНІ

Ляжу па саломе даверліва хрусткай,
Сачу з-за мяхоў я цішком,

Як вочы,
што выбліснуць раптам з-пад хустак,
Паўнеюць спакойным святлом.

Спяваюць жанчыны забытыя песні,
Там радасці меней, чым слёз...
Куды ж мяне простыя словы панеслі
Пад спеў жураўліны калёс?

* * *

Махнуў на ўсё рукой, каб супакоіцца
Не толькі смяглым целам, і душой...
Гляджу,
як скача аблачынак конніца
Над ціхай вечароваю Шашой.
Хутчэй набок
з асфальту разагрэтага!
Разуўся, бо ў абутку — не хадок.
І ногі босыя
(даўно чакалі гэтага) —
Зямлі адчулі родны халадок.
Яе чакаў,
і радасць адшукалася.
Плыве зялёны пах з лясных палям.
Сядае смела
плісаўка цікаўная
На мой,
яшчэ студэнцкі,
чамадан.
З бярозы,
што над сцежкаю сагнутая,
Лісцё ліецца ў прыгаршчы мае.
І сумятнёй,
і стрэсамі
прадзьмутая
Душа,
як глеба ўвесну,
адтае.
Яна не прагне жыць
на нейкім хутары,

Ды ёй драбок патрэбен цішыні...
Іду паволі.
          Змрок імшары хутае.
Далёкай вёскі свецяцца агні.

* * *

Стаяць у чаканні людзі,
Чарга не за хлебам — за словам.
Хто радасць у сэрцах будзіць? —
Мая беларуская мова.

Акроплена горкай слязою,
Умыта крывёю гарачай,
Яна шлях да еднасці зорыць,
Нас вучыць сябе ў свеце бачыць.

Шчыруха, палёў працаўніца,
Цнатлівая гараджанка,
Яна, як крыніца, бруіцца,
Палае нязгаснай заранкай.

Каб высвеціць зноў да драбніцы
Наш лёс — ад пакутаў да славы,
Каб з братнімі мовамі зліцца
У велічны голас дзяржавы.

Стаяць у кнігарні людзі,
Патрэбна, як хлеб, людзям слова...
На роўных была, ёсць і будзе
З акрайцам
          спрадвечная мова.

## НЯЗГАСНЫЯ СУЗОР'І

*Рыгору Барадуліну*

Шлях вясновы дадому
          па зорах вядуць, жураўлі,
Прагне кожная жылка, крывінка —
          на Ушаччыну!

Сын ідзе да азёр,
да лясоў,
да сваёй аралλі
Па сузор'ях вачэй
мілых, матчыных.

Іх святло не замгляць
хмары чорнай заслонай крылля,
Іх святло не дазволіць
зачахнуць, зняверыцца.
Будзе жыць,
красавацъ
векавечная наша зямля
І сыноўняю,
і жураўлінаю вернасцю.
Трубіць клін
і махае,
хоць сілы даўно не стае,
Дымам хат родных
хутка сагрэецца...
Прад табой жа
ўзыходзяць сузор'ямі вочы яе,
Вочы мамы —
Куліны Андрэеўны.

## ЗОРКА СМУТКУ ЗЯМНОГА

Мабыць, шчасця замнога
Мне жыццё
напачатку дарыла.
Зорку смутку зямнога
Рапа ў сэрцы яна запаліла.
Зорка смутку зямнога,
Ты ўзышла,
як святая адплата
За бяздумнасць былога,
За ўсіх тых,
перад кім вінаваты.
Ля аснежанай скроні
Час ляціць

у нястрымным разгуле.
Апякаюць далоні
І сляза,
і маршчыны матулі.
Поле,
рэчка,
азёры
Хараством выцалоўваюць вочы,
Сосны з небам гавораць,—
Як да іх,
дарагіх,
мне не збочыць.

Дождж маркотны цярусіць
Ці вясна прымярае абновы —
Мне з крыніц Беларусі
Светла піць
незабытыя словы.

Крочу вуліцай шумнай
Ці блукаю ушацкім пагостам —
Западае ў душу мне
Гэты свет,
кожнай рысай няпросты.

Зорка смутку зямнога
То паблякне,
то зноў разгарыцца...
А праз вечнасць да рога
Мкне бясконца,
пыліцца,
імгліцца.

**ПРЫЗБА**

*Васілю Быкаву*

Хоць вечна з часам скупавата,
Я па гадзіннік не гляджу.
Перш чым пайсці ад роднай хаты,
На прызбе моўчкі пасяджу.

Спіною ўтульна прыслянюся
Да цёплай, нібы печ, сцяны.
Матулі, бацьку усміхнуся,
Якія будуць зноў адны.

Яды згадаюць двор маленькі.
На прызбе — дзед.
Ён начыку,
Бо я прыўзняўся на каленьках
І ў бараду ўпусціў руку.

Не так даўно было усё гэта,
Але ў някшчопнага вайной
Ужо чупрына з лета ў лета
Світае спорна сівізной.

Як час бяжыць!
Я добра зведаў
Сэнс строгіх слоў, што будуць жыць
«На прызбу сесці побач з дзедам
Яшчэ патрэбна заслужыць».

Яго няма, а мудры выраз
Не страціў сілу, не памёр,
Хоць чалавек нязмерна вырас,
Сягнуў наяве аж да зор.

...Бацькі ад хаты па дарогу
Вядуць,
 і словы ў іх адны:
«Ідзі, сынок... А мы — нічога...
Каб толькі не было вайны».

Чым скончыцца наш час капрызны
Дабром і мірам
 ці крывёй?..
Ляціць зямлі — Сусвету прызба,
І мы
 прад вечнасцю
 на ёй.

* * *

З жыццёвага запасу
Яшчэ дзянёк — не твой...
Халодны не пер часу
Шуміць над галавой

Якою стала хуткасць,
Які пад'ём круты!
Свет сціснула закрутка,
А ў цэнтры свету — ты.

Надзелены каронай
Яго валадара,
Стаіш безабаронны,
Хоць жорсткім стаць пара.

Але куды падзецца?
Гняце зямлі дакор,
Яна аддана ў сэрца
Глядзіць вачмі азёр.

І голасам трывожным
Жывога,
          што ў жальбе,
Быць просіць асцярожным
У велічы
          цябе.

На сёння,
          назаўсёды
На плечы клопат лёг —
Прагрэсу і прыроды
Злучыць патрэбна лес.

Ты сам зямлі часцінка...
Ёй — маці — не змані,
Каб не сысці з гасцінца
Любові,
          дабрыні.

З разбегам зорных трасаў
Крыжуй гасцінец свой...
Халодны вецер часу
Шуміць пад галавой.

## ЖЫЦЦЮ Я ЎДЗЯЧНЫ

Жыццю я ўдзячны, што на вечным свяце,
Дзе лёс крыху набыць дазволіў мне,
Ёсць і сляза, і цёплы смех дзіцяці,
І зорка недасяжная ў акне.
Спялее ўпарта розум разам з намі,
Ён вынесе людзей у іншы свет.
А я ў зямлю ўрастаю каранямі,
Тут мой —
　　　　світальны
　　　　і апошні
　　　　след.
Сярод глабальных думак і ўзрушэнняў
Хвалюе сціплай радасці аблог —
Прылёт шпака
　　　　і парастка з'яўленне,
Дрэў з небам таямнічы дыялог.
Я не стаміўся вугалёк надзеі
З душы сваёй,
　　　　як з вогнішча,
　　　　вымаць,
Што чалавецтву і ягонай дзеі
Пачатак быў, але канца няма.
Ляці,
　　　　Зямля,
　　　　у вечнасць
　　　　зернем спелым,
Сумленнем,
　　　　дабрынёю прарастай...
А што шукаў,
　　　　знайшоў я
　　　　ў свеце белым,
Мяне пра гэта потым распытай.

* * *

Хоць грыміць пагрозна
    век імклівы,
Крута рве на віражы крыло,
На зямлі,
    пакутнай і шчаслівай,
Выспявае
    дабрыні святло.
Сябра мой,
    не ведаючы зморы,
Прысак слоў адваяша варушы…
Ёсць у нас падмога і апора —
Вечны рух няўтоленай душы.

## СЛУХАЮ НАЧНУЮ ЦІШЫНЮ

Слухаю начную цішыню,
Слухаю,
    не палячы агню,
На абрыве над маёй Ушачай,
Што плыве праз тоўшчу зім і лет
Ніткай сувязі ў нямы Сусвет.
Слухаю…
Душа трывогай плача.

Слухаю начную цішыню…
Ліст падставіў росам даланю.
Вось яшчэ адна упала кропля.
Лашчыцца настойліва туман,
Ахінае мякка, як падман.
Можа, кропля заўтра стане кропкай?

Слухаю начную цішыню…
Я паверу маладому дню,
Толькі трэба дзеля вечнай мэты
Нам,
    зямлянам,
    разам ратаваць,
Ад гнілога бруду адмываць

І нядзеліць радасцю
планету.
Слухаю, як цішыня звініць,
Да лясной рачулкі,
да крынц
Роднасцю нясцерпнаю прыкуты...

Спачывай,
сумленны чалавек,
Спачувай назаўтра,
з веку ў век
Стомленым,
галодным
і разутым...
Толькі не маім начным пакутам.

## ДЫМОК МАРШАНСКАЙ МАХОРКІ

*Памяці Аляксея Пысіна*

На горкім,
глухім рубяжы,
За рысай,
для ўсіх немінучай,
Паэт незваротна ляжыць,
Абняты дняпроўскаю кручай.

Хмурынка ў яе на плячы,
Як выдых апошняй зацяжкі.
Зямля прыгарбела,
маўчыць
Пад каменем шэрым і цяжкім.

Нічога з сабою не ўзяў,
А свет нам дабрэйшы пакінуў.
Забраў толькі жах перапраў
І холад аконнае гліны.

Ён гэтулькі ў сэрцы насіў,
Якое спачыну не мела.

Якое за ўсё і за ўсіх
Шчымела,
            балела,
            смылела!..

Рабочых,
            натруджаных рук
Завязаны вузел навечна.
Замкнуўся жыцця пёршы крўт,
Другі — прадаўжаецца ў вершах.

Ён там — між акопных сяброў,
А слова выходзіць на сувязь,
На скроні планеты
Дняпро
Блакітнаю венай пульсуе.

Зноў хмары на свет папаўзлі...
Плыве
            дым маршанскай махоркі...
Гарнуся да роднай зямлі,
Нібы да яго гімнасцёркі.

## НА ГАРЫ ГЕЛЕРТ

*На гары Гелерт у Будапешце стаіць*
*помнік савецкім воінам-вызваліцелям*

Над гарою Гелерт лёгкія аблокі,
Як сумёты ўшацкіх маладых снягоў...
Што вам, хлопцы, сніцца у зямлі далёкай,
Пад гарачым жвірам белых берагоў?

Побач з вамі сёння адчуваю крылы,
Хоць сляза і засціць вока акаём.
Венгрыю,
            як маці,
            вы тады прыкрылі
Ад бяды
            салдацкім дымным шынялём.

Па Дунаі коціцца сонца, як рамонак,
Промнямі вясёлымі лашчыць вусны хваль.
Вулкамі прыветнымі Будапешт гамоніць,
Слухай ці не слухай — кругам галава.

Ды раптоўна памяць строгімі вачыма
Спыніцца на строме, што плыве ў вянках.
І пабачыць горад над сабой жанчыну
З пальмавай галінкай на святых руках.

Над гарою Гелерт вечнасць пыніць крокі,
Каб аддаць адвазе ўдзячнасці паклон...
Толькі б не скрывянелі
белыя аблокі,
Не забіў трывогу
неба чуйны звон!

## ГЛЫБІНКА

Дарога бітая ўрастае
Трыпутнікам і муравой,
Але яна яшчэ вяртае
Да вёскі дальняй, ды жывой.

Быў час, калі над пыльнай вулкай
Звінелі песні дацямна.
І адгалосак скокаў гулкі
Па ўсёй ваколіцы лунаў.

А зараз тут спакой світае...
Над шапкамі паніклых стрэх
Такая цішыня густая —
Гукні, дык хрусне, як арэх.

Але ж не вёска вінавата,
Што ў прочкі адышлі сыны,
А іх бацькі ў сцішэлых хатах
Свой век агорваюць адны.

Каго прымусіш жыць прынукай?
У вёскі добрая рука,
Чакае гарадскіх унукаў
З паўнюткай квартай малака.

І, можа,
Над нагою босай
Зямлі адчуўшы цеплыню,
Дзяўчо,
            хлапчук рыжавалосы
З павагай глянуць на радню.

А потым, ідучы за дзедам,
Што завіхаецца з касой,
Ім давядзецца раптам зведаць
Свет з незнаёмаю красой.

Жыццё ідзе...
У ім магчымы
Нязвыклы паварот падзей.
Вунь мальвы яснымі вачыма
Глядзяць з прысад у новы дзён

Глыбінка застаецца з намі,
Не ўзяты сэрцы на замок.
Яшчэ курыць над камінамі
Надзеі вусцішны дымок.

* * *

Рэчка на пачатку дня
Чула шэпт салодкі:
— Акуня — з каня,
Плотку — з калодку!

І здаецца, што было
Гэта толькі ўчора.
Сам прасіў, каб прыплыло
Шчасце з пераборам.

І сям'ю карміў улоў —

Разгавецца ж недзе...
Болей стрыжаных галоў
Ля вады не ўгледзіш.

Над канавай шэпт трысця
Выпрамляць умеем.
А крыніц сэрцабіцця
Не чуваць над глеем.

Не паважыш у руцэ
Акуня і плотку.
Напамін аб той рацэ —
Печкуроў чародка.

Покуль будзем гаварыць,
Як паправіць хібы,
Хай жывуць хоць печкуры...
Як-ніяк, а рыба.

* * *

У яблык
горкі смак бяды,
Хоць хараством прывабіць кожны.
Дзічэюць слуцкія сады,
Пад іх галлём
душы трывожна.

Яна не змірыцца ніяк,
Што ў царстве спеласці крамянай
Чуваць ляны свінячы чвяк,
Ствалы рагамі абадраны.

Калгасам клопат — іх куды?
Яны нібы бяльмо на воку.
І вось шыбуе на сады
Бульдозер.
Мы ж усе — наўзбоку.

А дрэўца кожнае было
Дзядоў,

бацькоў
паліта нотам...
Ласуецца цяпер сяло
Салодкім імпартным кампотам.

Стаяць сады.
Маўчаць сады.
Няма ім ласкі, абароны.
Не прадчуваючы бяды,
Святлом пладоў світаюць кроны.

## ШАХЦЁРСКАЯ УСМЕШКА

*Гарнякам таджыкскага*
*горада Шураба*

Апускаемся ў сэрца гары...
Нібы з прашчы запушчаны камень,
Клець ляціць... Нечаканы адрыў...
За паветра хапаю рукамі.

А шахцёры смяюцца:
— У нас
Многа іх — трэніровак ускосных.
Каб не праца свая, дык якраз
Стартаваць смела можна і ў космас.

Што ў забоі вада — не глядзі,
Гэта дробязь. Абыдзем — і далей...
Найзаклятьı наш вораг адзін —
Сіла жудасных горных удараў.

Пад вуглом залягаюць пласты,
Нібы прэсам, гарою накрыты.
Цісне груз да мяжы, а затым
Нават вугаль грыміць дынамітам.

Але мы тут у шапку не спім,
Нюхам, скурай бяду адчуваем.
і сустрэчным зарадам сваім

Апярэдзіць удар паспяваем.

Наша шахта не любіць прымус,
Палахліўцы сюды не прыходзяць...
Украінец,
таджык,
беларус
Мне расказваюць проста і ў згодзе.

Словам шчырым,
без лішніх прыўкрас,
Жартам досціпным
цешыць сябрына...
Хутка скончыўся гутаркі час,
Лаву госці пакінуць павінны.

У забоях прыпар.
Зноў гараць
Над капрамі шурабскія зоры.
Камень сонечны мкне на-гара
І святло
і цяпло
людзям дорыць.

Чорны гном,
Добры пласт ім пашлі,
Стойце цвёрда,
Трывожныя горыры,
Каб жыла пад зямлёй,
на зямлі
Белазубая усмешка шахцёрау!

## ІСФАРА

*Муміну Канаату*

Хоць Ісфара — не Бухара,
Але красой не ўступіць.
Страмчэе радасці гара,
Спаткацца сэрцу рупіць.

Яшчэ пад коламі шаша,
А ў нас з Мумінам згода,
Што ў Ісфары пяе душа,
Яна — вянок Усхода.

Тут гліна можа гаварыць
За чалавека лепей.
Жывуць такія ганчары,
Што свет нанова злепяць.

Як вечнасць, свецяцца сады,
Пялёсткаў кіпень грае.
На хвілю зазірнеш сюды —
І не захочаш раю.

Без стомы,
          шчодра гохвары[1]
Нявест гушкаюць новых.
Што двор —
          то поўна дзетвары,
Расце жыцця аснова.

Пабыў я ў слаўнай Ісфары
І сэрца ў ёй пакінуў...
І што б Мумін ні гаварыў,
Паверу я Муміну.

## ВЕРА

Вачыма неба мерай,
Але зямлёй жыві —
І радасная вера
Народзіцца ў крыві.
Падмурак ёсць.
Упарта
Будуйся да страхі.
Лічыць яшчэ не варта

[1] Гохвара — калыска (таджык.).

Заслугі і грахі.
У новы дзень дарогі
Няма без адкрыцця.
Шукай аж да знямогі,
Да самазабыцця.

Каб адчуваў і потым,
Што сэрцам не здрабнеў,—
Пераплаўляй работай
Свае любоў і гнеў.
Будзь з праўдай толькі ў згодзе
І дойдзе голас твой
Туды,
дзе гул стагоддзяў
Зліваецца ў прыбой.

**СІКСЦІНСКАЯ КАПЭЛА**
**(1512 год)**

Змоўк пад скляпеннем ціхі вуркат
Бо голуб здзіўлена глядзеў,
Жывое вока касавурыў
На чорных,
як гракі,
людзей.

Закінутыя ўгору твары
Ушчэнт перакрывіла злосць.
Лунала ў храме светлай марай
Душы і цела прыгажосць.

Сіпела світа: «Не, вы чулі?
Малюе зноў на свой капыл».
У дзікім гневе папа Юлій
А ж тросся,
мёў сутанай пыл.

Пасля малення пасінелы,
Ён грозна зыркаў з-пад павек:
«Адкуль ты ўзяў такую смеласць,

Неўтаймаваны чалавек?

Перарабі, бо з рыштаванняў
Адразу трапілі ў турму.
Саскрэблівай усё дазвання.
Малюй святых. Так не прыму».

А Мікеланджэла шчаслівы
Стаяў пад знакам адкрыцця —
Мастак — не раб, не палахлівец,
А мужны вучань у жыцця.

Ён думаў: «Зразумеюць потым...
І час прысуд падпіша свой...»
З ілба сцякалі кроплі поту
На пэндзаль фарбай векавой.

* * *

А іншага жыцця не будзе,
Шануй сваё,
якое ёсць,
Хоць часам ціхі жаль у грудзі
Заходзіць, як нязваны госць.

Дзень,
што на дробязь змарнаваны,
Раптоўна стане мне шкада.
І не залечыць гэтай раны
Уцех гаючая вада.

Яна збяжыць, нібы паводка,
І зноў разлучыць берагі:
На правым —
шчасця хмель салодкі,
На левым —
халадок тугі.

Час непадкупны
ветрам свежым
Дыхне знарок, каб помніў я,

Што свет пароўну ўсім належыць,
А доля ў кожнага свая.

На некага мне спадзявацца.
Прэч адганю спрадвечны страх,
Каб потым захлынуцца працай,
Цяжкой,
        ажно кругі ў вачах.

Нясмела варухнецца слова,
Якое ты чакаў даўно.
І ноч глядзіць не так сурова
У непатухлае акно.

Няхай закружаць заўтра будні,
Спакойна крочу між людзей.
На дне душы — глыбокай студні —
Паблісквае святло надзей.

* * *

*Памяці Рыгора Семашкевіча*

Далёка было да адлёту, да восені,
Зялёнае лета цвіло па зямлі.
А дзікія гусі на Свірскае возера
Упалі, тужліва крычаць пачалі.

Над вечным трудом
        іхні крык сёння носіцца,
І паліць падзол ціхай зоркі сляза.
Ні ў кога адказу душа не дапросіцца:
«А што ж ён хацеў,
        ды не змог мне сказаць?»
Трывога
        будзённым жыццём не прытуплена,
Туманіцца дзень за ільдзінкамі шкла.
Балюча вачам углядацца ў наступнае,
Як быццам паменела ў свеце святла.

* * *

Ён быў дзівак.
Яшчэ малым гадзінамі
Мог разглядаць травіну, мураша.
Памкненнямі няўлоўнымі і дзіўнымі
Жыла душа.

Сталеў,
Дужэў дапытлівасці крыламі,
Сябе над светам не збаяўся ўзняць.
Яму стагоддзяў далячынь адкрылася,
Іх глыбіня.

Ён Млечным Шляхам вандраваў
у будучым,
А потым супыняў свой лёгкі крок
І ў прыску зор рассыпчатую бульбачку
Паціху пёк.

З ім хораша было дзяліцца пошапкам
Пра самае святое
І маўчаць.
Для сябра ён адзежыну апошнюю
Мог зняць з пляча.

Калі пісаў, не ведаў стомы, голаду,
На снег мог выйсці з дому басанож.
Каб праўду бараніць,
З рукамі голымі
Пайшоў па нож...

Глядзяць нябёсы вінавата, спуджана
На той грудок, які ўмясціў Сусвет.
Яго нікому замяніць не суджана —
Ён быў паэт.

* * *

Харошыя людзі нядоўга жывуць...
Іх сэрцы згасаюць, а думы плывуць,
Маўкліва плывуць пуцявінай сваёй,

Зліваюцца з зорамі, сонцам, зямлёй.
Здаецца, што мора касмічнай імжы
За нас без супынку трывогай дрыжыць.
А ўдзень промні спела і густа звіняць,
Спяшаюць цяплом, дабрынёю абняць.
І коласа жменя зярнят залатых
Прыносіць сяляпскую веру ад іх...
Ды ўсё ж з вамі свет
    і радней
    і бліжэй,
Харошыя людзі,
    жывіце даўжэй!

## РЫЗЫКА

А доля проста не рыфмуецца.
Не ўціснеш лёс у верш сілком...
Нясоладка і мне пачуецца
Над незакончаным радком.

Ад хвалявання ў пальцах дрыжыкі,
Ды усё не тое...
Трэба спаць.
Як і ў мінёраў, гэта рызыка
Апошняй кропкай моле а стаць.

Але прыходзіць час,
І крэсівам
Душа аб будзень чыркане.
Адзін радок паспешна крэсліцца,
За ім другі імкліва мкне.

Пісаць — браць лёд рукамі голымі,
Пісаць — як жартаваць з агнём...
І ты ляціш з агню ды ў полымя.
Ну, што ж.
І ўсё-ткі рызыкнём!

* * *

Круг звыклай мітусні,
Зададзенасці быта.
Мільгаюць спорна дні,
І многа іх забыта.

Ды ўспомні час, калі
Мы ў нейкім утрапенні
Не дням падлік вялі,
А кожннаму імгненню.

Цвіў радасці язмін,
І зелянелі душы.
Дагэтуль успамін,
Як вецер, вусны сушыць.

І часта ў сне да нас
У вочы заглядае
Далёкая вясна,
Як воля, маладая.

Мінулага жарству
Варушыць дум карэнне,
Іх ніткі перарву —
І нрыйдзе разуменне,

Што сталы, мудры свет
Яшчэ памаладзее.
Ступаюць дзеці ўслед —
Твая, мая надзея...

Чаму ж пражыты дзень
Глядзіць усё ж гаротна?
Над безданню ідзем,
І крок наш — незваротны!

## ДРЭВА ЖЫЦЦЯ

Вечназялёнае дрэва жыцця
Гоніць карэнне ў зямныя глыбіні.

Смела галіны да зорак ляцяць,
Космас пустэльны
абжытым зрабілі.

Вуліцай Млечнага Шляху іду —
Скрозь будаўніцтва і радасці ўлада.
Пераўтварэння высокага дух
Па-над Сусветам шуміць вадаспадам...

Тое, што бачым у марах і спім,
Спраўдзіцца заўтра — і абавязкова.
Месяц вісіць над парогам зямным
Так, як над ганкам — па шчасце — падкова.

Вечназялёнага дрэва жыцця
Плод самы спелы і мудры садоўнік —
Ты, чалавек!
Барані свой працяг.
Думай...
На кнопку націснуць нядоўга.

Хто потым верне пошум лісця
Вечназялёнага дрэва жыцця?

* * *

У прыроды менее сяброў,
Пакарыцелі трывала ў модзе.
Кожны ў справе петрыць будзь здароў
Дзе падзецца беднай той прыродзе?

У адказ па крыўды і прымус
Сухавей пашле, а ўслед за гэтым
Гнеўна ўздыбіць глебу землятрус —
Трэшчыны паўзуць па паўпланеты.

То імчыць паводка між зімы,
То мароз прыблудзіць у спякоту...
Шанаваць яе павінны мы,
І не адкладаючы на потым.

Параскінем розумам сваім —
Што ж прырода вечна не ў гуморы?..
Можа, мы падёй ужо стаім,
Як хірург над безпадзейпым хворым?

* * *

Грашыць не трэба.
Лес не дакарай,
Што абдзяліў цябе ён важным нечым.
Ёсць праца,
        камунальны мікрарай,
Акраец хлеба,
        вопратка на плечы.
Ёсць сонца,
        лес
        і рэчка, што цячэ,
Як і жыццё тваё,
        не вельмі прама.
А ты чакаеш нечага яшчэ,
Зноў у душы пакутнай спее драма.
У вочы вечнасці пачаў глядзець
І з жахам адчуваць сваю часовасць.
Быццё расцэньваеш, як нейкі здзек
Над пешкаю,
        якую можна соўгаць.
Шукаеш сэнс у выгінах падзей,
Ды не знаходзіш пэўнага адказу.
І ў лік гаротных самых між людзей
Сябе адносіш цвёрда і адразу...
Дарма на лёс крыўдуеш, мілы мой,
Спяшаешся сысці набок без бою.
Ты ёсць,
        дык дзякуй шчодрасці такой.
Астатняе?..
Усё, брат, за табою.

* * *

Нашы мары
        бясконцы сусвет абышлі,
Заўтра спраўдзіцца ўсё,

немагчымае сёння.
Прагу руху бярэ чалавек ад Зямлі,
Што без страху ляціць
у касмічным прадонні.
Ты, надзея,
жыві...
І пастане той дзень,
І душа да душы невядомай
памкнецца,
Толькі хочацца верыць,
што намяць людзей
Не сплыве ў небыццё,
назаўжды застанецца,
У наступніка будзе
свой час і свой хлеб,
І трывога інакшая
сэрца апаліць...
Ды патрэбна яму,
каб сумленнем не слеп,
Нібы воку сляза,
ачышчальная памяць.

* * *

З мінулым развітацца цяжка...
І я не шкадую сябе —
Гадоў мулкі груз,
як мурашка,
Упарта цягну на гарбе.

Паўнее,
паўнее паклажа,
Няроўнаю стала хада:
То радасць хатуль мне падважыць,
То каменем згорбіць бяда.

Прамейшая ўдалеч дарожка,
А вузел на сэрцы — тужэй,
Я думаў,— лягчэць будзе ношка,
Яна ж — што ні ігрок, то цяжэй.

* * *

Праўда наша,
праўда ваша...
Хто ж яе дзяліў?
І ці можна праўду важыць,
Мераць на разліў?

Праўды можна адрачыся,
У сабе забіць.
Паслугачкай,
як ні пніся,
Праўду не зрабіць.

Бо яна,
як сонца,
вецер,
Вольная яна.
Праўда ёсць на белым свеце
І на ўсіх —
адна.

**ПЫТАННІ**

У звыклым карагодзе
Імклівых лет і зім
Ляціць маё стагоддзе...
А што далей, за ім?
Што там, за паваротам
Падманлівых падзей?
Які цяжар турботаў
Абрыне новы дзень?
Няўжо ён родзіць вечар,
А вечар — ноч бяды
І пахавае вечнасць
Маіх дзяцей сляды?
Зямля маўчыць.
Адказу
Чакаю я дарма.
Пытанні —
як абраза,

У роспачы сама.
Ёй,
          як і нам,
          няўтульна
Пад назіркам ракет.
У вір
          вар'яцкіх гульняў
Маньякі цягнуць свет.
Яднацца трэба,
          людзі,
Зямною талакой
Цяпер, бо больш не будзе
Магчымасці такой.

Для гэтага нам розум
І дадзены якраз.
Ні ЭВМ,
          ні робат
Не вынайдуць адказ.
Белабілетнай броні
Адкінем прэч шчыты.
Хто свет наш абароніць?
А толькі я і ты!
Не скінеш на другога
Свой клопат,
          лёс
          і час...
З нязвыклаю трывогай
Зямля глядзіць на пас.

* * *

Што зажурыўся, мой добры таварыш
Нешта цябе я пазнаць не магу —
Цень праплывае,
          як хмара,
          па твары,
Сцятыя вусны замкнулі тугу.

Можа, пакрыўдзіў калі неўзнароку,
Не зразумеў,

не адклікнуўся ў час,
Можа, дасужая плётка-сарока
Пушчана злоснай рукою між нас?

Покуль душа не пакрыта лядком,
Сядзем бліжэй,
пагамонім ладком...

* * *

Пакрыўджаны хлапчук рыдае —
Патлаты бэйбус мяч схапіў,
Пад колы хуткага трамвая
Нагой лянотнаю падбіў.

Малога супакоіць можна,
Прылашчыць, казку расказаць...
Але як горка і трывожна
Глядзіць на свет яго сляза!

## ПЛАЧ УНАЧЫ

Плач уначы...
Ці не вецер над ліпамі?..
Горка дачка пад коўдрай усхліпвае.
Дельца малой да сябе прыгарну
І захлібнуся,
як ветрам пад кручаю.
Крыж — на бяссонніцу,
бомбы,
вайну!..
Мой паратунак —
белыя ручанькі.
Шыю яны абвілі, як вязьмом,
Што ніякою бядой не парушыцца.
Стукаюць сэрцы — падзей метраном,
Хвілі ў маўклівую вечнасць цярушацца.
Спі, перапёлка...
Пакінь іх мне —
Думкі, што кулачкамі таўхаюцца...

Нешта часцей плачуць дзеці
У сне,
Нешта радзей дзеці ў сне
Усміхаюцца.

## НАЧНЫ КАРА-ДАГ

Змрок, як прывід даўніны,
Брыў па чорных хвалях.
Падалося, што яны
Некага хавалі.

Расступілася вада,
І ў прынебак сіні
Дыба ўзнёсся Кара-Даг,
Як дракон з глыбіняў.

Закружылі ля яго
Зоры ў хуткім танцы,
Выкрасаючы агонь
Аб каменны панцыр.

Горы пры святле такім
Я чытаў, як строфы...
І няспешна праз вякі
Плыў паэта профіль.

* * *

Жыццё —
дзве сціплыя,
простыя даты,
І рыска — як шлях па зямлі...
І хоць не паўторыцца гэтае свята,
Ды ўсё ж мы былі,
мы жылі!

*

Саджанец кволы трымаю ў руках
І аглядаю яго са здзіўленнем.

Зараз ён тут
жыццялюбным карэннем,
Кронай жа там —
у наступных вяках.

* * *

Пішаш і слову даверліва верыш,
Пакуль не прыйшло да цябе адкрыццё,
Што самым апошнім праўдзівым
вершам
Усё ж застаецца тваё жыццё.

* * *

Стажок жыцця ўсё вершыцца,
Штогод — чарговы ўкос.
І памяццю
і вершамі,
Здаецца, зноў падрос.

Стажок не надта зграбны ўжо,
А правіць не прашу...
Бо не прычэшаш граблямі
Ніяк маю душу.

Не там, дзе ціш празрыстая,—
На зломнай паласе
Стаіць стажок расхрыстаны,
Ды ветрам не знясе.

## ВЯЗЬМО ЛЮБОВІ

Адвечнай роднасці вязьмо
Сціскае сэрца аж да болю.
Зямля прыслала мне пісьмо —
За шыбай жоўты ліст сваволіць.
Праз пальцы тонкія галін
Яшчэ нябёс лагода свеціць,
А ліст застаўся ўжо адзін,

Яго вось-вось падхопіць вецер.
Халодны голас празвініць
Над полем, што плыве ў самоту,
І кінецца ў пусты зеніт
На ўсхліпе найапошняй ноты.
І мне ў свой час зляцець лістом
Туды,
адкуль няма звароту.
Зямля людзей —
мой вечны дом,
З табой — цяпер,
з табою — потым.
Абрыс гадоў ясней,
ясней.
І гавару я сам з сабою:
«Сціскай мяне,
сціскай мацней,
Вязьмо надзеі і любові...»
Стук радасны ў грудзях не змоўк,
Жыццё
і плача,
і смяецца...
Шчымлівай роднасці вязьмо
Услед за сэрцам разарвецца.

* * *

Каго люблю, таму на вочы
Стараюся трапляць радзей,
Каб нечым дробным не сурочыць
Пачуцці блізкіх мне людзей.

Сабе не знойдзеш долі лепшай,
Чым ведаць — ёсць сябры мае:
Хто ладзіць зруб,
хто спеліць вершы,
Хто чарку на радзінах п'е.

Адна прысутнасць іх у свеце,
Дзе многа крыўд,
сляпога зла,

На ўсё жыццё спагадай свеціць,
Мне цёпла ад таго святла.

І словам простым я шчаслівы,
Хоць бы такім:
        «Ну, як жыў-дуж?»
Бо веру ў мудрую маўклівасць
Паразумення родных душ.

* * *

За гарою знік лужок маленства,
За пагоркам — маладосці гай.
Сцежка полем сталасці пралегла,
А далей сінее небакрай.
Веру, што мой дзень яшчэ высокі,
Умалотны зернем спраў і дум.
Самыя прыгожыя аблокі
Зносяць, нібы крыгі, ціхі сум.
Лепшай мне не трэба ўзнагароды.
Ёсць жыццё.
Я на любой вярсце
Пакланюся мудрасці прыроды
І яе суровай праваце.
Век жыві — і век спялі адвагу,
Сыдуцца ўсё ж,
        што ні кажы,
Непазбыўнасць
        вечнага працягу,
Непазбежнасць
        страшнае мяжы.
Не натоліш смагу існавання,
Но ўратуе нават лішні год.
Паўстаюць світанні,
        як пытанні,
Ды адказ не высвеціць заход.
Час мой,
Набірай крутую хуткасць
І не грэбуй падзяліць са мной
Чорны каравай
        зямнога смутку,

Белы бохан
          радасці зямной.

## ПАКАЦІ-ГАРОШАК

Два матылі над галавой,
Сукеначка ў гарохі....
Святланка,
          пачакай, прыстой,
Пабудзь са мной,
          хоць трохі.

Ды дзе там...
Вылузнула з рук
Смяшлівай ручаінкай.
І зноўку свет увесь наўкруг
Любуецца дзяўчынкай.

Усё, што ў ім расце, жыве,
З ёй знаецца і дружыць.
Сама зямля вакол яе
Зачаравана кружыць.

Ліпнёвы поўдзень атуліў
Нас ласкай лугавою.
Два радасныя матылі
Мільгаюць над травою.

Насустрач сонцу, адкрыццю
Ляцяць маланкі ножак...
Вучы адданасці жыццю,
Мой пакаці-гароінак.

## ЧАРНАВІК

На маім чарнавіку
Света свет малюе.
На маленькую руку
З зайздрасцю гляджу я.

Тупаюць паміж радкоў
Жвава чалавечкі,
Сонца ёсць, сям'я грыбоў,
Стужка сіняй рэчкі.

З вўснаў зліжа язычок
Потым кроплі поту.
І галоўка набачок —
Ацаніць работу.
Стома сцішыла дачку,
Бег рукі таропкай...

Як на тым чарнавіку
Мне паставіць кропку?

* * *

Мне сніцца мора.
Там, за валам,
Што белапенна лёг да ног,
Ты, нечаканая, паўстала,
Над галавою — рук вянок.

Трымцела радаснае цела,
Крывінкай кожнаю жыло,
Нібы ў сябе ўвабраць хацела
Усё — да кропелькі — святло.

Яно звінела, і спявала,
І цалавалася з вадой.
І свет прыціхлы хвалявала
Сваёй загадкай маладой.

І не забудзецца ніколі,
І не паўторыцца нідзе ж...
Як промень трапяткі, паволі
Ты па каменьчыках ідзеш.

## ЛЯСНУШКІ-ВЯСНУШКІ

Суседка-шчабятушка
У вяснушках, як ляснушка,
Хадзіла да нядаўняе пары.
Як выспелі ляснушкі,
Прапалі ўраз вяснушкі,
І вось цяпер ты з ёй пагавары.

Прашу дабром суседку:
— Дай хоць адну ранетку...
Твой сад ад іх аж ломіцца наўкол!
Яна ж смяецца весела,
Ляснушак,
Ветрам стрэсеных,
Каб частаваць, накідала ў прыпол.

Не адцягнуць за вушы —
Ем кіслыя ляснушкі.
А сэрца цешу думкай,
Што вясной
Суседцы за ляснушкі
Адпомшчу, бо вяснушкі
Усе перацалую да адной!

## СУСЕДКА

На падаконніку ў суседкі
Пачаты пачак «Прымы»...
Хавае радасць хустка ў кветкі:
— Прыстаў адзін у прымы.
Уважны і не вып'е лішне,
Я радая без меры...
А твар выблісквае, як вішня,—
Сама сабе не верыць.

* * *

Спачатку — ты,
а потым — я —

Такая прымаўка твая.
Каханая,
дaруй за тое,
Што горкіх слоў
нясеш ты крыж,
Што часам крыўды
ў сэрцы тоіш,
Маўчыш,
пакутуеш,
не спіш.
За непрынесеныя кветкі,
І занядбаны хатні гуж,
Як і за тое,
што ў суседкі
Надзвычай дамавіты муж.
За тое,
што не годзіш модзе,
Што ў іншых больш убораў ёсць,
Што, як дажджы,
як снег,
праходзяць
Твае краса і маладосць.
Зрэдчас падумаецца жартам —
Так,
я — і грэшнік і святы,
Ды ўсё ж,
калі чагосьці варты,
То вінавата ў гэтым — ты.
Спачатку — ты,
а потым — я...
А прымаўка ў цябе — мая!

* * *

Лілі

Там, дзе сырая зямля,
як турма,
Там, дзе нікога,
нічога няма,
Раптам мне выспішся промнем.
...Лета ці восень,

вясна ці зіма —
Кожнай крывінкаю помню!

* * *

Мора,
каб хацеў,
дык не сурочыш
Развітальным пошапкам сваім.
Закружыўся чаек крык сірочы,
Мы над ім разгублена стаім.

Ты яшчэ ўсміхаешся шчасліва...
Толькі стыне,
стыне на губах
Цёплы ўздых
салёнага заліва,
Стэпу палынковы горкі пах.

* * *

Ад ласкі сонечпай стамлёная,
Цяжкая ад зямных шчадрот,
Галінка з вішнямі чырвонымі
Перахілілася праз плот.
Дождж сыпануў, ліпнёвы, цёплы,
Гарачы пыл з лістоты змыў,
І пасяліўся ў кожнай кроплі
Вялікі свет.
А з ім — і мы.
Гарэлі ягады спакусныя
Пудлівым полымем пакут...
Як я сачыў за тымі вуснамі,
Што цалавалі спелы цуд!
Зямля плыла...
Куды?
Не ведаю...
Гайдаўся неба вечны звон —
То гуў вясельнаю бяседаю,
То закалыхваў, нібы сон...
А лёс — сваёй,

чужою воляю —
Вузлом завязваўся такім,
Што і цяпер расцяць не здолееш,
Хоць мучайся пад ім вякі.
Ды мне
за часу перагонамі
Так лёгка ў сэрцы берагчы
Галінку з вішнямі чырвонымі
На сараммлівым плячы.

* * *

Пад сонцам абагрэўшыся,
Сінічка,
не дрыжы.
Сумёты,
нібы рэшата,
Званчэюць капяжы.
Чакай,
у кожнай лункачцы,
Напоўненай вадой,
Вясна яшчэ праклюнецца
Травінай маладой.
Заценькае, накоціцца
Ручай пад цаліком.
Па голле вербаў
коцікі
Пасядуць зноў ладком.
Прымчыць,
тугой падхоплены,
Птушыны грай здалёк...
І мне тады захочацца
Пяро адкласці ўбок.

**КВЕЦЕНЬ**

Цвітуць сады шырока,
вольна,
Плывуць, як ветразі надзей...
Хто з гэтакаю сілай здольны

Ускалыхнуць жыццё людзей?
Бунтуе квецень маладая,
Якую кормяць карані.
Зямля нявестай выглядае
Сярод касмічнае радні.
Плывуць сінечаю да сонца
Ружова-белыя вянкі,
Трымцяць пялёсткі па далоньцы,
На пасмах
        ля тваёй шчакі.
Каханая,
        падай мне рукі,
Лічыць не будзем мы гады,
Бо нам прарочаць неўміручасць
Сваёй адвагаю сады.

## СЦЕЖКА АД СТУДНІ

Як чарацінка крохкая,
Плывеш і не прыстанеш.
— Нядоўга ж так,—
        дзед вохкае,—
Пераламіцца ў стане.

Смех у адказ пасыплецца,
Старэча хмыкне ў вусы.
А вецер пад касынкаю
Сваволіць з пасмай русай.

У вёдрах сонца плавае,
Спякотна слепіць вочы.
Таму, напэўна, жвава я
З тваёй дарогі збочваў...

І сцежка тая помніцца,
І смеласці даволі...
Больш чарацінка з поўным мне
Не стрэнецца ніколі.

* * *

Вецер галін не хістае,
Звонкім лісдём не шуршыць.
Восень стаіць залатая
І на зямлі
і ў душы.

Лёт павуцінкі іскрыстай,
Першага інею след.
Моўчкі, празрыста ўрачысты,
Свеціцца мудрасцю свет.

Ты з ім даўно ў ціхай змове,
Родную ён пазнае —
Столькі святла і любові
Вочы праменяць твае.

І ў безгалоссі прыроды,
Пэўна ясней, чым калі,
Рэхам адклікнуцца годы,
Што ў гэты дзень прывялі.

Вецер галін не хістае,
Кружаць лісцёвыя сны...
Восень мая залатая,
Восень з паглядам вясны.

**ВУЗЕЛ НА ПАМЯЦЬ**

Мая світальная дзяўчынка,
Як зайчык сонечны ў траве.
Пяшчотай дзень свой прыручыўшы,
З ім у абдымку ў свет плыве.

Разліты ў сэрцы і ў прыродзе
Цяпло,
спагада,
дабрыня...
Табе жадаю больш знаходзіць
І менш губляць на схіле дня.

Хай будзе незнаёмым доўга
За гэта шчасце першы боль.
І ўсё ж спакой парушыць добры
Шчымлівым словам мне дазволь:

«Ты дзіўны дзень,
          якіх нямнога,
Мая дзяўчынка,
          беражы.
На нітцы промня залатога
На памяць вузел завяжы...»

* * *

Бэз духмянай весткаю
Закрануў плячо.
Без пары пявесціцца
Мілае дзяўчо.

То сядзіць задумліва
З кнігай ля акна,
То па танцы тлумныя
Бегае яна.

То да маці лашчыцца,
Ціхая, як цень,
То імклівай ластаўкай
Хоча паляцець.

То ўсіх аспрэчвае,
То маўчыць паўдня...
Таямніца вечная —
Сэрца глыбіня.

Лёс,
          За ёй з усмешкаю
Ты пакуль сачы.
Са слязой няўцешнаю
Толькі разлучы.

* * *

Хараша мне на сваёй зямлі
Сёння вітацца з вясной.
Лісця,
          травы
          зялёны разліў
Цешыць душу навіной.
Шчодра
          святлом густым
          першацвет
Неба наліў да краёў.
І заварожаны дзівам свет
Сцішыў дыханне сваё.
Радасць не хоча
          ведаць мяжы,
Не хоча знацца з бядой,
Бо адчуваю,
          што не чужы
Я на зямлі маладой.
Толькі і ў гэты
          жаданы час
Думкі не збыць з галавы:
«Людзі,
          прашу вас,
          дайце адказ,
А ці шчаслівыя вы?»

* * *

Дзень і жыццё,
Ёсць у іх падабенства.
Раніца звонкая,
          нібы маленства,
Поўдзень гарачы і дужы,
          як сталасць,
Вечар задумлівы, ціхі,
          як старасць.

Сонца світальнае
          срэбнагалоса
Грае і пераліваецца ў росах.

Сонца ў зеніце
нястомнае ў працы,
Сілы надоўга хапае старацца.
Сонца вячэрняе
моўчкі знікае,
Не папярэджвае і не чакае...

## МОЙ БЕЛЫ СВЕТ

Мой белы свет,
скажы,
як прызвычаіцца
Мне да тваіх шчадрот і таямніц?
Ляціць душа
дапытліваю чаіцай,
Прасветленая ззяннем бліскавіц.

Ляціць яна, ахутаная водарам
Чаромхі,
што губляе кіпень свой,
Асцюжанаяя халадком над возерам,
Асмужаная спёкай палявой.

Ляціць душа...
Па баравых вяршалінах,
Па хмызняку, па стэпавай траве
І па гарах,
што велічна ўзвышаюцца,
Яе няўлоўны лёгкі цень плыве.

У ёй няспынна
рэхам адгукаюцца
І радасці і гневу
галасы.
Ляціць яна,
і круг не замыкаецца
Няўтольнай прагі
дабрыні, красы.
Мой белы свет,
Хай час твой

не канчаецца.
Табе зноў нараджацца,
не старэць...
Зямля і сонца
раніцай вянчаюцца,
Каб маладым каханнем
абагрэць.

## КАЛЯ ПЛЯЧА КАЛОЖЫ ДУМНАЙ

*Валянціну Блакіту*

Яшчэ я неаднойчы ўспомню
Той дзень,
нястрымны бег ракі.
Сплывалі крыгі ўніз па Нёмне,
Нібы купальскія вянкі.

Каля пляча Каложы думнай,
Што пільпавала вечны рух,
Было і нам
зусім не сумна
На беразе
стаяць удвух.
Чаму нязвыклым круглым крыгам
Мы доўга
пазіралі ўслед?
Трывожыў сэрцы не адлігай,
А крэўнасцю глыбокай свет.
І неба
дыхала спакоем,
І смехам
цешыла дзятва,
А спела пачуццё такое —
Не выказаць і не стрываць,
Бо снегавы абшар айчыны
Нам душы прасвятліў
да дна.
Яе зрачыся немагчыма...
Жыццё адно, зямля адна...
Іду ў той дзень, нібы па промню,

Ці будзе дзень яшчэ такі?..
Сплываюць крыгі ўніз па Нёмне,
Нібы купальскія вянкі.

## І ЎСПОМНІЦЬ ВАС ЗЯМЛЯ

Свет у ракетным гудзе,
Ён глухне спакваля...
А вы дабрэйце, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.
Усё, што ёсць,
  што будзе,—
Набытак мазаля.
Шчыруйце ў працы, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.
Пакуль світанні будзіць
Салоўка між галля,
Садзіце дрэвы, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.
Пакуль дажджы не блудзяць
І п'е ўзахлёб ралля,
Ратуйце рэкі, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.
  Няма ў пушчанскім цудзе
  Без кораня
  камля.
  Шануйце мову, людзі,—
  І ўспомніць вас Зямля.
Павагу не здабудзе
Сям'я, дзе культ валля.
Дзяцей гадуйце, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.
  Сініцай не адбудзеш,
  Пільнуйся жураўля.
  Аб шчасці дбайце, людзі,—
  І ўспомніць вас Зямля.
Няхай душу не нудзіць
Зняверанасці тля.
За праўду стойце, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля.

Наш дзень наступнік судзіць,
Яму відней здаля...
Людзьмі жывіце, людзі,—
І ўспомніць вас Зямля!

* * *

Каранямі я ў роднай зямлі,
Ёй сябе на трываласць праверыў.
Толькі сэрца баліць
За травіну,
за птушку,
за звера.

За даверлівы смех немаўлят
(Як хачу, каб яго вечна чулі!),
За таемныя мары дзяўчат
І спакойную старасць бабулі.
За ціхмяныя вёскі ў садах,
Што вітаюць світанак дымамі,
За пракладзены ў памяці шлях,
Што прыводзіць на ганак да мамы.
За круты гарадскі неспакой,
Што звініць між вуллёў-камяніцаў,
За масты над вячэрняй ракой
І мартэнаў бяссонных зарніцы.

Так хацеў бы я ўсё затуліць
Ад б яды,
што блукае над светам...
Ах, як сэрца нясцерпна баліць
За Зямлю непаўторную гэту!

Ды жыцця мерны рух не спыніць...
І насуперак стратам і болю
Прарастае, каб колас спяліць,
Зерне
веры,
надзеі,
любові.

## ЗМЕСТ

Сіла дабраты. Р. Барадулін

**З кнігі «Рунь» (1970)**

*** Зямля мая…
У Брэсцкай крэпасці
Стары вятрак
*** Сякуць жанчыны ў гародах капусту…
Капаюць бульбу землякі
Спіць жанчына

**З кнігі «Бяседа» (1973)**

Жыву на зямлі
Гуслі
Размова з цёзкам
Хатынь
Ціпшыня
Партызаны
*** Лес насупіў зялёныя бровы…
Маладзік
Ваеннае кіно
*** Дзесьці вучоныя расшчапляюць атам…
Ступаюць халады
Таежны пасёлак
Зіма
Маўчанне
Алёнка
Чаканне
*** Вусны — суніцы…
Першаадкрыццё
Выспелае поле
Калодзежы
Прыходзьце да мяне

**З кнігі «Устань да сонца» (1976)**

У абдымках палёў і лясоў
Хлеб
Устань да сонца!
*** Жыццё крапае нас…
*** Дзівосы ўсюды прыкмячаю…
Наш лёс

Балада
Роздум
Талака
Душа лесу
Цалік
Неабходнасць
Вечная радня
Здзіўленне
Мая сцяжына
Песня маці
*** Дарога уцякае паланянкай...
Жнівень
*** За акном у нераце галля...
*** Жыла ты сумленна і проста...
Памяць
*** Сонца над мядовымі пракосамі...
Родная песня
*** Толькі вочы заплюшчу...
*** У змроку плаваюць бярозы...
Дзед
*** Абуджан лес сабачым брэхам...
Лён
*** Якія ночы дорыць жнівень!..
*** Паліўся дождж раптоўна...
Вясна
*** Наскрозь прасвечаныя сонцам...
Сейбіту
*** Вада пяе ў яры на донцы...
*** Устае вясёлка маладая...
*** Сонная пацягваецца рэчка...
*** Дзень крыло распасцёр...
Вузельчыкі
Табе адной
Едуць маладыя
Успамін
*** У мураве някошанай...
*** Як многа значыш ты адна...
Купаю дачку
Сад цвіце
Ля «Сіксцінскай мадонны»
*** Увагай шчырай, пацалункамі...
*** Запамінаю кожны дзень...
*** Заснула Зямля... Лугавіна Сусвету...
Заламіў асінку хлопец
*** Жыццё шуміць, як гай зялёны...

*** Душа чалавека, нібыта рака…
Заўвага
*** У кулаку, як жаўрука-падлётка…
*** З абрыву сцежка кінецца…
У хвіліну вяртання снягоў
Ранак
*** Даганяюць снягі маладых жураўлёў…
*** Я жорсткасці зазнаў урокі…
Памылкі
Водбліскі
Чаканне
*** Жаўцеюць на сценах партрэты у рамках…
Уночы
Тэлефон ваеннай пары
*** Землякі, землякі… Вашы ўтульныя гнёзды…
На партызанскім аэрадроме
*** Галінка хрусне, як курок…
Нявесты вёскі Мурагі
Апошні шлях
Куля
*** На брустверы траншэй…
Прарыў. (Паэма)

**З кнігі «Пакуль жыве мая бяроза» (1981)**

Пакуль жыве мая бяроза
Рэчка Дзіва
Спявае жыта
Бацькаўшчына
Зялёная пара
Вязынка
Покліч вясны
Дзесяцікласніцы
Слухаю…
Салаўіная сталіца
У роднай хаце
Мая вёска
*** Лясоў зялёных астравы…
*** Ляжыць зямля…
*** Люблю з маленства…
Камбайнер
*** Не, не паверу я нікому…
*** Правёў наўсцяж пушыстыя барозны…
*** Ад чалавека да краскі…
Наш век

Удзячнасці.
*** Апёк маладыя аблокі…
Звон часу
*** Ён, здаецца, побач, запаветны…
Прыляці, сініца ўдачы
*** Суцішацца дрымотаю абшары…
*** Я цяпер адкрываю нанова
*** А за вясной трывожнаю не ўгнацца…
*** Дажджы ўжо надакучылі…
*** І вывела нас сцежка лугавая…
Чаромхавыя вёсны
Май
*** Першая маргчынка…
Кладка. (Жарт)
Вяселле ў мікрараёне
*** Малыя ля бабкі балбочуць…
*** Сонейка ў мяне ёсць…
Грыбасей
Малююць дзеці
Сляды
*** Казалі — шпакоў сёння чулі…
Калыханка дачушцы
*** Спатканне маё з белым светам…
*** І з далёкіх, і з блізкіх дарог…
*** У безагляднасці юначай…
Да пытання пра акаляючае асяроддзе
*** Мне радасна згубіцца ў лесе…
*** Свабодна і лёгка ліюцца ў душу…
*** Зарыпіць сініх зорак у небе жарства…
*** Наўзбоч асфальту ля кювета…
Паэты
*** Я не апошні і не першы…
*** Пілавінне здзьмута золкім ветрам…
Госці. (Жарт)
*** Блакіт тэлевізійнага экрана…
*** Мы хуткасці асвоілі сягоння…
*** Адыходзяць людзі, адыходзяць…
Народны выраз
*** Не сказалі таварышу добрага слова…
Прыпар
*** Сёння болей — снегу ці свеху?..
*** Бор ззелянелым крысом…
*** Выспела зорак калінавых гронка…
Лістапад
*** Спрадвечны круг жыцця і смерці…

Спатканне з Эстэргомам
***Я ў маленстве любіў чуйна слухаць гудкі…
Ля помніка Шандару Пецёфі
Балатонскія чайкі
Песня дружбы
Падзяка зялёнаму чаю
Алёнка з горада Нурэка
Сустрэча
*** Што за жанчына за мной след у след…
Родны склон
*** Ты вазьмі кавалачак жыцця…
Цягнік у рэвалюцыю
Арліная песня
*** Жыццё маё становіцца страмчэй...
Палын
Людзі з агню
Свольна. (Балада)
Бацькава поле
Салдат
Сляпы баяніст
Дакументальныя кадры
Спаленыя вёскі
*** Кроплі соку замігцелі…
*** Памінаем дзядоў ля збуцвелых крыжоў…
Як пахне хлеб?
*** Між пажоўклых старонак кнігі жыцця…
*** Не, наша памяць не сляпая…
Урбаны. (Паэма)

**З кнігі «Вера, Надзея, Любоў» (1983)**

*** І стаю я, жыццё, прад табой…
Тры аблічы
*** Над ліпай, што галлём чарнее…
*** Мы прыйшлі на зямлю…
Ушацкія ўзгоркі
Усё з зямлі
*** За небакрай сыходзяць…
Крыж
Сустрэча камбрыгаў
Жорны
Боты
Радоўка
Дома
*** У глухіх зацененых ярах…

*** З даланёю каса развіталася…
*** Рачулкі сіняю аправай…
Бярозавы гай
Першы снег
*** Вся снегам ускіпае…
Маміна хустка
Ідзе чалавек
Хата
Забытыя песні
*** Махнуў па ўсё рукой, каб супакоіцца…
*** Стаяць у чаканні людзі…
Нязгасныя сузор'і
Зорка смутку зямнога
Прызба
*** З жыццёвага запасу…
Жыццю я ўдзячны
*** Хоць грыміць пагрозна…
Слухаю начную цішыню
Дымок маршанскай махоркі
На гары Гелерт
Глыбінка
*** Рэчка на пачатку дня…
*** У яблык горкі смак бяды…
Шахцёрская ўсмешка
Ісфара
Вера
Сікстінская капэла
*** А іншага жыцця не будзе…
***Далёка было да адлёту, да восені...
*** Ён быў дзівак…
*** Харошыя людзі нядоўга жывуць…
Рызыка
*** Круг звыклай мітусні…
Дрэва жыцця
*** У прыроды менее сяброў…
*** Грашыць не трэба...
*** Нашы мары бясконцы сусвет абышлі…
*** З мінулым развітвацца цяжка…
*** Праўда наша…
Пытанні
*** Што зажурыўся, мой добры таварыш?..
*** Пакрыўджаны хлапчук рыдае…
Плач уначы
Начны Кара-Даг
*** Жыццё — дзве сціплыя, простыя даты…

*** Стажок жыцця ўсё вершыцца…
Вязьмо любові
*** Каго люблю, таму па вочы…
*** За гарою знік лужок маленства…
Пакаці-гарошак
Чарнавік
*** Мне сніцца мора…
Ляснушкі-вяснушкі
Суседка
*** Спачатку — ты…
*** Там, дзе сырая зямля…
*** Мора, каб хацеў, дык не сурочыш…
*** Ад ласкі сонечнай стамлёная…
*** Пад сонцам абагрэўшыся…
Квецень
Сцежка ад студні
*** Вецер галін не хістае…
Вузел па памяць
*** Бэз духмянай весткаю…
*** Хораша мне на сваёй зямлі…
*** Дзень і жыццё…
Мой белы свет
Каля пляча Каложы думнай
І ўспомніць вас зямля
*** Каранямі я ў роднай зямлі…

**Законнікаў С.**

Прысак часу: Вершы, паэмы/Прадм. Р. І. Барадуліна.— Мн.: Маст, літ., 1986. 238 с., іл., 1 л. партр.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова Сяргей Законнікаў нарадзіўся пасля вайны. Але легендарная партызанская Ушаччына наклала глыбокі адбітак на яго творчасць. Прадаўжальнік традыцый Петруся Броўкі і Еўдакіі Лось Сяргей Законнікаў — тонкі лірык і палкі барацьбіт за нашы высокія ідэалы, за новага чалавека. У кнізе — усё лепшае, створанае аўтарам.

**Сергей Иванович**
**Законніков**

**ГОРЯЧИЙ ПЕПЕЛ**
**ВРЕМЕНИ**

*Стихи, поэмы*
Минск, издательство
«Мастацкая літаратура»
На белорусском языке
Загадчык рэдакцыі Г. С. Шупенька
Рэдактар Р. І. Барадулін
Мастак У. С. Басалыга
Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал
Малодшы рэдактар С. І. Расянчук
Карэктар Л. Т. Калюжная

ІБ № 2392
Здадзена ў набор 13.12.85. Падп. да друку 14.04.86. АТ 05041.
Фармат 84x90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая.
Высокі друк. Ум. друк. арк. 10,50+0,09 укл. Ум. фарб.-адб. 14,97.
Ул.-выд. арк. 11,44. Тыраж 4500 экз. Зак. 2040. Цана 1 р. 40 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяршаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа.
220005, Мінск, Чырвоная, 23.